№ 26 (576) 17 ліпеня 2008

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Генадзь Сагановіч. Пра славу і блякласьць Грунвальду

Старонка 12





# Гайкай па сасудзе

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Уладзе трэба высьветліць сапраўднага падбухторшчыка тэракту. Але ці адважыцца яна на гэта? Аналізуе Віталь Сіліцкі. Старонка 3.

## Сьвята ў кожны дом

### або Што вы рабілі ў ноч на 4 ліпеня?

У сталіцы пачаліся масавыя допыты насельніцтва. Міліцыя мяркуе апытаць усіх жыхароў гораду пра выбухі 4 ліпеня шляхам пакватэрнага абыходу.

У працы бяруць удзел супрацоўнікі МУС розных падразьдзяленьняў, у тым ліку курсанты навучальных установаў МУС. Людзі ў міліцэйскай форме, у званьнях ад шарагоўца да прапаршчыка, па два ажыцьцяўляюць пакватэрнае апытаньне ўсіх жыхароў у сувязі з выбухам.

Супрацоўнікі міліцыі правяраюць дакумэнты жыхароў кватэр і цікавяцца тым, дзе яны былі і чым займаліся ў ноч на 4 ліпеня, а мужчын апытваюць, ці праходзілі яны службы ва Ўзброеных Сілах, і калі так, то дзе служылі і да якога роду войск адносіліся.

Супрацоўнікаў МУС асабліва цікавіла, ці прымалі апытаныя жыхары ўдзел у баявых дзеяньнях і ці прысутнічалі ў зонах лякальных канфліктаў.

Тых асобаў, якія сьцьвярджальна адказвалі хаця б на адно пытаньне, папярэджвалі, каб яны былі гатовыя да таго, што супрацоўнікі сьледчых органаў МУС зь імі яшчэ раз скантактуюцца.

Масавыя апытаньні мяркуюць скончыць за тыдзень.

Цяжка зразумець, што можа даць апытаньне амаль двух мільёнаў жыхароў сталіцы для канкрэтнага сьледзтва ў справе выбухаў, акрамя блытаніны і безьлічы памылковых сьлядоў. Гаворка ж не пра апытаньне сьведкаў ці жыхароў прылеглых дамоў. Усё гэта выглядае як тупая маштабная акцыя запалохваньня. Можна чакаць, што яна таксама падштурхне людзей да зьвядзеньня рахункаў з суседзямі і іншых інцыдэнтаў. Таксама варта чакаць па яе выніках новых нематывававых затрыманьняў людзей, супраць якіх няма ніякіх канкрэтных доказаў.

**Мікола Бугай**

### У НУМАРЫ

**Напярэдадні масавай прыватызацыі**

Разьлік прамысловых гігантаў на льготнае крэдытаваньне і падаткаабкладаньне ня можа працягвацца вечна. Мусім пераходзіць да цывілізаванага працэсу прыватызацыі шляхам акцыянаваньня, заявіў першы віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка. **Старонка 6.**

**Сцэнар прызнаньня**

Выбух у сталіцы парадаксальным чынам зьняў важныя перашкоды на шляху да нармалізацыі стасункаў Беларусі з Захадам — Шэймана і боязь уладаў праляцець на свабодных выбарах. Піша Язэп Кунцэвіч. **Старонка 5.**

**Расея ўсё яшчэ страшыць**

Страх беларусаў перад расейскай мадэльлю капіталізму можа стаць вызначальным для геапалітычнага выбару краіны. Піша Васіль Аўраменка. **Старонка 8.**

**Дыскаграфія**

Unia, «Тайлянд», Flat, Medusa, NHS- 700. Рэцэнзуе Сяргей Будкін. **Старонка 9.**

**Літаратурны сшытак «НН»**

Андрэй Хадановіч, Марыя Вайцяшонак, Андрэй Лянкевіч, Мікола Рабчук... **Старонка 13.**

### Нашаніўцы ў Маладэчне і Гомелі

**24 ліпеня ў Маладэчне (вул.-Чыстая, 26)** адбудзецца сустрэча з рэдактарам ARCHE Валерам Булгакавым, пісьменнікамі Уладзімерам Арловым і Наталкай Бабінай, а таксама Аляксандрай Макавік, каардынаткай выданьня па-беларуску кнігі Астрыд Ліндгрэн «Пэпі Доўгаяпанчоха». Падчас сустрэчы можна будзе азнаёміцца з навінкамі незалежнага кнігадруку. **Пачатак у 18.00.** Даведкі па т.: (44) 792-36-88, (029) 271-77-22.

**29 ліпеня а 18-й у Гомелі (вул-.Палеская, 52 (управа АГП))** — Валер Булгакаў з прэзэнтацыяй спэцвыпуску часопісу, прысьвечанага Беларусі пад нямецкай акупацыяй; перакладчык Віталь Воранаў з прэзэнтацыяй кнігі Алана Мілна «Віня-Пых» па-беларуску; Аляксандра Макавік з прэзэнтацыяй кнігі Астрыд Ліндгрэн «Пэпі Доўгаяпанчоха». Т. для даведак: (029) 341-66-94.

# Адміністрацыю ўзначаліў прафэсійны выведнік, а Раду Бясьпекі — ахоўнік прэзыдэнта

Лукашэнка-тата перадаў руль групе Лукашэнкі-сына?



**За Віктарам Лукашэнкам з жонкай — Уладзімер Макей. Ці за Макеем — Лукашэнка?**

Дзяржаўнае агенцтва БЕЛТА паведаміла пра новыя высокія прызначэньні ў лукашэнкаўскай адміністрацыі.

Адміністрацыю прэзыдэнта ўзначаліў Уладзімер Макей. Доўгі час, ад 2000 году, ён працаваў памочнікам прэзыдэнта. Да таго ён пэўны час працаваў у МЗС і выконваў функцыі прадстаўніка Беларусі пры Радзе Эўропы. А ўвогуле гэты чалавек паходзіць з Галоўнага выведвальнага ўпраўленьня Ўзброеных сілаў СССР.

Лічыцца, што менавіта ён будзе выконваць функцыі «заходняй вітрыны» Адміністрацыі.

Віктара Шэймана на пасадзе дзяржаўнага сакратара Рады Бясьпекі зьмяніў шэф КДБ, а да таго начальнік Службы аховы прэзыдэнта Юры Жадобін. Ён вядомы як верны служака. На пасадзе шэфа спэцслужбы ён праславіўся любоўю да моцных расейскіх выразаў, а таксама публічным прызнаньнем існаваньня чорных сьпісаў палітычных праціўнікаў існай улады.

КДБ пры Жадобіну актывізаваў вэрбоўку грамадзянаў, што прывяло да шэрагу скандалаў і росту нэрвознасьці ў грамадзтве. Але значэньне Камітэту між сілавымі ведамствамі панізілася, што дазваляе выказаць меркаваньне, што і роля Рады Бясьпекі з прыходам такога начальніка аслабне.

І трэцяга прызначэнца таксама адносяць да людзей Віктара Лукашэнкі. Новым кіраўніком КДБ стаў генэрал-маёр Вадзім Зайцаў, які быў першым намесьнікам старшыні Памежнага камітэту.

Аляксандар Лукашэнка хоча дасягнуць большай эфэктыўнасьці працы апарату, захоўваючы на ключавых пасадах тых самых выхадцаў зь сілавых структураў. Ці можна назваць новым Макея, калі ён восем гадоў правёў на пасадзе памочніка прэзыдэнта? Прыйшоў на яе адразу пасьля зьнікненьняў Ганчара і Захаранкі і выконваў яе ў часе рэфэрэндуму 2004 году.

Жадобін — аднагодак Лукашэнкі, народжаны ў 1954 годзе. Макей нарадзіўся ў 1958-м, Зайцаў — у 1964-м.

З трох толькі палкоўнік Макей нарадзіўся ў Беларусі. Ён жа адзіны, хто вучыўся ў Беларусі (Інстытут замежных моваў у 1980-м). Дарэчы, у 1992—1293 гадах ён стажаваўся ў Акадэміі дыпляматычнай службы Аўстрыі. А паміж тым, у 1980—1992 гадах, як сьціпла паведамляе афіцыйная біяграма, гэты выпускнік ін'язу «находился на службе в Вооруженных Силах СССР».

Жадобін — танкіст, які прыйшоў у ахову прэзыдэнта з грамадзянскай абароны.

Зайцаў у 1986 годзе скончыў Акадэмію КГБ СССР, а ўжо ў 1990—2000-я адвучыўся ў Акадэміі фэдэральнай пагранслужбы Расеі (1997) і Вайсковай акадэміі Генштабу Расеі (2004). У іншых краінах Цэнтральнай Эўропы асобы з такім паслужным сьпісам ня мелі ні толькі што шанцаў, але найчасьцей і права ўзначальваць сілавыя структуры. Надта ж моцна яны павязаныя з суседняй дзяржавай.

**Мікола Бугай**



# Лета на захад

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## У межах статыстычнай хібнасьці

Сярод 1 430 сяброў акруговых выбаркамаў усяго 42 прадстаўнікі грамадзкасьці, вылучаныя ад незалежных партый і грамадзкіх арганізацый. Гэта менш за 3%. Усе астатнія месцы занялі лукашэнкаўцы.

Але і 42 — гэта больш, чым было ў 2004 годзе. Тады, напярэдадні рэфэрэндуму, незалежных было — нуль.

Назіральнікі разыходзяцца ў думках, ці то гэта ад няважнасьці выбараў, ці то ад жаданьня стварыць дэмакратычны фасад перад Эўропай.

АДС вырашыла пачакаць з сваім рашэньнем аб удзеле ў кампаніі. Яно залежыць ад таго, ці ўключаць незалежных сяброў ва ўчастковыя камісіі і ці вызваляць арыштаваных актывістаў апазыцыі.

**МБ**

## У Лідзкім раёне завялася малпа

Яе бачылі на кукурузным полі ў вёсцы Краснаўцы, ля крамы і ў полі ля вёсак Кавалі і Рулевічы. Жыхар вёскі Кавалі Валер Рудзевіч сустрэў няпрошанага госьця проста на дарозе, а ў аднаго з хутаранцаў жывёла ласавалася яблыкамі-зялепукамі. У апошні раз кудлатага валацугу бачылі ў адной зь вёсак Вараноўскага раёну. Паведамляюць, што гэтая малпа ўцякла з аднаго з вандроўных заапаркаў. Вяскоўцы з асьцярогай выпускаюць дзяцей з хаты, дый самі перамяшчаюцца па навакольлі зь вялікай перасьцярогай.

**Насьця Касьцянкоўская, радыё «Рацыя»**

## СЬЦІСЛА

### Новы гістарычны рэкорд падзеньня даляра

Даляр абваліўся адносна эўра да новага гістарычнага рэкорду —у $1,6038. Прычынай падзеньня называюць кепскія вынікі эканамічнага разьвіцьця ЗША.

### Уладыка Філарэт ухіліўся ад адказу

На сайце БЕЛТА зьявілася гутарка зь мітрапалітам Філарэтам.

Сярод іншых, было зададзенае наступнае пытаньне: «Якая пазыцыя Экзархату ў дачыненьні да нядаўна агучанай на найвышэйшым дзяржаўным узроўні пэрспэктывы заключэньня базавага пагадненьня Беларусі з Ватыканам, а таксама запрашэньня Папы Рымскага наведаць нашу краіну?» Уладыка адказаў наступнае: «У ліпені гэтага году мітрапаліт Кандрусевіч адзначыў, што з прапанаванай пра падрыхтоўку і заключэньне канкардату павінна выйсьці дзяржава, а падрыхтоўка канкардату можа заняць 2—3 гады. Таму вашае пытаньне пра пэрспэктывы гэтага працэсу падаецца мне некалькі дачасным».

### Вострыкаў, Сабалеўскі, плягіят, архівы БЦР і БНР

Выйшаў з друку новы нумар «Запісаў БІНІМу», г.зн. №31. Гэты нумар прысьвечаны філёлягу Алене Юрэвіч (1928—2006). У рубрыцы «Архівы» друкуюцца ўспаміны Цімоха Вострыкава «Мая споведзь», а таксама грунтоўныя мэмуары Юр'я Сабалеўскага «На этапах», пра падзеі 1917—1919 гг. Суправаджаюць успаміны ня менш грунтоўныя камэнтары і прадмова гісторыка Аляксандра Пашкевіча. Друкуецца таксама ў нумары артыкул Генадзя Сагановіча «Гістарычнасьць супраць «неабвержнасьці, або Перачытваючы Абэцэдарскага й Урбана». Шукайце праз knihi.net.

### Івянец — беларускі Сыднэй

Мястэчка Івянец з 18 да 20 ліпеня стане месцам сустрэчы з Папам Бэнэдыктам XVI пры дапамозе тэлемосту з Аўстраліі.

Сёлета Сусьветны дзень моладзі адбудзецца ў Сыднэі (Аўстралія). Паколькі ў далёкую Аўстралію змагла паехаць абмежаваная колькасьць моладзі, было вырашана арганізаваць свой уласны «беларускі Сыднэй». Ім стала мястэчка Івянец. Маладыя людзі змогуць сустрэцца з Папам праз… тэлемост. Адбудуцца два жывыя ўключэньні: у суботу 19 ліпеня а 11.00 гадзіне і а 2.00 гадзіне ўначы 20 ліпеня.

Адметнасьцю сёлетняга дня моладзі стане канцэрт з удзелам хрысьціянскіх музычных калектываў з Польшчы (Arka Noego і 2 Tm 2, 3) і Беларусі («Небасхіл», Ave, Ruach і інш.). Для яго будзе пабудаваная вялікая сцэна і забясьпечаны прафэсійны гук і сьвятло.

Імшу 19 ліпеня а 19.00 гадзіне будзе правіць кардынал Казімір Сьвёнтэк, а 20 ліпеня — арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

На выпадак неспрыяльнага надвор'я на пляцы каля касьцёлу паставяць два вялікія шатры (кожны прыкладна на паўтары тысячы чалавек). А кухняй будуць займацца вайскоўцы з суседняй часткі.

**МБ, АГ**

# Гайкай па сасудзе



Работнік міліцыі перашкаджае карэспандэнту фатаграфаваць на месцы выбуху.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Выбух 4 ліпеня падарваў успрыманьне ўлады як ўсёмагутнай і ўсёпранікальнай. Таксама стала відавочным, што ўлада ня ўмее спраўляцца зь нестандартнымі сытуацыямі, а сілавыя структуры да жаху непрафэсійныя. Піша **Віталь Сіліцкі**.

Тое, што адбылося ў Менску, нечым нагадвае авантуру адмарозкаў з брытанскіх таблоідаў, якую яны неяк учынілі ў лёнданскім аэрапорце «Хітроў». Некалькі урвісаў стварылі муляжы выбуховых прыстасаваньняў і здолелі, нягледзячы на ўсе меры перасьцярогі ў аэрапорце, пранесьці іх на борт самалёту. Натуральна, жыцьцю людзей нічога не пагражала, але інфармацыйны эфэкт быў максымальным — грамадзтву было даведзена, што ўся валтузьня вакол бясьпекі авіярэйсаў пасьля 11 верасьня 2001 году — гэта, па вялікім рахунку, пшык, бо няма такіх сыстэмаў кантролю, якія немагчыма было б абысьці.

Аналёгія з выбухам 4 ліпеня відавочная — справа ня ў тым, колькі пралілося крыві, а ў нахабнасьці і цынічнасьці таго, што адбылося. Канечне, такая аналёгія будзе крыху нацягнутай, бо людзі 4 ліпеня ў Менску маглі рэальна загінуць. Аднак, калі меркаваць па тым, як прафэсійна была мінімізаваная такая магчымасьць канструкцыяй бомбы, можна лёгка прыйсьці да высновы, што менавіта на інфармацыйны эфэкт, на шок ад пранікненьня і разьлічвалі арганізатары і замоўцы тэракту. Задачай быў сыгнал, адрасатам якога мог быць і прэзыдэнт, і беларуская эліта, і сілавікі, і грамадзтва, і ў прынцыпе, усе яны разам. А раз сыгнал паслаць удалося, то можна зрабіць некалькі высноваў аб сучаснай Беларусі, аб якіх мы раней толькі здагадваліся.

Па-першае, дзеяньні зламысьнікаў сур’ёзна падарвалі ўспрыманьне беларускай улады як ўсёмагутнай і здольнай кантраляваць літаральна ўсе аспэкты жыцьця беларусаў. Калісьці прэзыдэнт адкрыта намякаў, што ведае нават, пра што размаўляюць у спальнях ягоныя чыноўнікі, і кажуць, што менавіта на такіх размовах некаторыя галовы і паляцелі. Калі гэтая сыстэма віжаваньня і насамрэч настолькі разьвітая, то спэцслужбам можна толькі параіць тэрмінова спыніць перасьлед апазыцыйных актывістаў у сувязі з справай 4 ліпеня — інакш давядзецца расьпісвацца сама меней ва ўласным злачынным бязьдзеяньні.

Мы ня будзем спрачацца са сьцьвярджэньнем прэзыдэнта аб тым, што выбух ня быў скіраваны супраць яго, але ўзарваць бомбу за 50 мэтраў ад прэзыдэнта і ня мець на мэце даслаць яму якоесь пасланьне было б проста неразумна. А раз так, то мы проста ня можам не падумаць пра існаваньне магутных ценевых структураў, якія асабліва ня сьвецяцца і ад якіх у Беларусі насамрэч залежыць ня меней, чым ад афіцыйна існуючай вэртыкалі ўлады. Цалкам магчыма, што ніці ад гэтых структураў цягнуцца на Ўсход — толькі там можа быць «крыша», якая магла б даць гарантыі бясьпекі арганізатарам і выканаўцам настолькі нахабнай выхадкі. Высьвятляюць гэтыя ценявыя структуры пытаньні ўлады альбо ўласнасьці — справа ўжо іншая. Важна тое, што яны паказалі

> Уладзе трэба высьветліць сапраўднага падбухторшчыка тэракту. Але ці адважыцца яна на гэта?

сваю здольнасьць дабрацца куды заўгодна.

Па-другое, улада прадэманстравала, што адзінства ў яе шэрагах асабліва не назіраецца. Рэакцыя першых асобаў дзяржавы на падзею неяк лягічна ўпісалася ў тыя вэрсіі, што распаўсюджваліся незалежнымі аналітыкамі аб магчымых лініях супрацьстаяньня ўнутры сыстэмы і якія так асьмейваліся саноўнымі прапагандыстамі, што ўвесь час наравілі назваць сваіх калег па той бок барыкадаў то пікейнымі жылетамі, то дылетантамі. Дый адхіленьне другой і трэцяй асобы ў дзяржаўнай гіерархіі, у прынцыпе, на падставе толькі таго факту, што іх не было побач з кіраўніком дзяржавы падчас сьвяточнага канцэрту, паказвае, наколькі моцная ўнутры сыстэмы атмасфэра недаверу і падазронасьці.

Па-трэцяе, стала відавочным, што беларускай уладзе надзвычай складана спраўляцца зь нестандартнымі сытуацыямі, хаця яна і спрабуе вучыцца. Хаця званочак сёлета ўжо быў у выглядзе абуральнай бесталковасьці ўладаў пры тым, што пазьней назвалі «жывым шчытом». Але там было некалькі машынаў на трасе, а тут сотні тысячаў людзей. Тыя, хто ведае, як апэратыўна працуюць службы забесьпячэньня такіх масавых мерапрыемстваў, скажам, у Кіеве падчас шматтысячных канцэртаў на Майдане, пацьвердзяць, што вось там эвакуаваць падобнага памеру натоўп на працягу невялікага кавалку часу было б справай тэхнікі. Гэтых навыкаў у беларускіх службаў парадку проста не накапілася. Цана «стабільнасьці», пры якой галоўная стратэгія падтрыманьня парадку — гэта запалохваньне, а верхам доблесьці лічыцца разгон некалькіх сотняў недабітых інтэлігентаў — непрафэсіяналізм уладных структураў у форс-мажорных сытуацыях.

Ва ўлады выпрацаваўся своеасаблівы альгарытм дзеяньняў — пры першым сутыкненьні зь невядомым — цалкам саўковае рэагаваньне, імкненьне замаўчаць праблему. Аднак, калі сытуацыя паўтараецца, наступным разам робіцца спроба дзейнічаць больш цывільна, нават, можна сказаць, па-эўрапейску. Вось, скажам, насьмецілі фанаты на Кастрычніцкай плошчы адзін раз — у другі ўжо апэратыўна падагнаныя камунальныя службы, каб зьліквідаваць бедлам за пяць хвілінаў. У наступны мо і фан-фэст абсталююць паводле ўсіх правілаў...

Па-чацьвертае, падзеі 4 ліпеня пацьвердзілі, што, як гэта ні дзіўна, але ва ўсёмагутнай беларускай улады няма манаполіі на інфармацыю. Гэта ня значыць, што яна ўжо няздольная апрацоўваць прыблізна палову грамадзтва, якая арыентуецца на дзяржаўныя СМІ і цалкам ім давярае. Аднак у час інтэрнэту, блогаў, мабільнай сувязі замаўчаць нешта маштабнае і важнае ўжо немагчыма. У ЖЖ-стужках былі паведамленьні і здымкі ўжо праз гадзіну, інфармацыйныя агенцыі пачалі перадаваць неадфільтраваную інфармацыю, камэнтары і заявы апазыцыйных партыяў былі растыражаваныя да таго, як улада сышлася на ўзгодненай вэрсіі падзеяў. У выніку ўлада, відавочна, вырашыла, што калі п’янку немажліва перадухіліць, трэба яе ўзначаліць, і стала пастаўляць інфармацыю праз свае каналы, хаця тэндэнцыя замоўчваньня на ранак 4 ліпеня была відавочнай.

Дарэчы, менавіта гэтая інфармацыйная адкрытасьць прыводзіць да таго, што «павесіць» адказнасьць за падзеі на крайніх будзе надзвычай складана. Адна справа — стварыць упэўненасьць у электарату, што да выбухаў мае дачыненьне апазыцыя. Зусім іншае — рызыкнуць і давесьці справу да працэсу, да якога будзе прыкаваная міжнародная ўвага, на якім, у выпадку няўдалай арганізацыі, абвінавачваныя могуць ператварыцца ў абвінаваўцаў. Разруліць сытуацыю, улічваючы рэзананс ад выбуху і груз нераскрытых віцебскіх свавольстваў, будзе надзвычай складана. З аднаго боку, і ўладзе трэба знайсьці сапраўднага падбухторшчыка тэракту — у гэтым, як ні дзіўна, яе інтарэсы з апазыцыяй супадаюць. Але ці адважыцца яна на гэта?

Нарэшце, рэакцыя ўлады на падзеі (а менавіта, вызначэньне вэктара пошуку вінаватых) паказвае, што ўнутры ўлады, мякка кажучы, не да канца сфармавалася разуменьне рэальных пагрозаў, што ўзьнікнуць перад сыстэмай у будучыні. Увесь удар прыпаў, па вялікім рахунку, на ветракі, створаныя прапагандай для нагнятаньня атмасфэры нянавісьці да палітычных апанэнтаў. Але інфармацыйны ўдар быў нанесены цалкам рэальнымі і значна больш прафэсійнымі супернікамі, якія нікуды ня зьнікнуць, нават калі пасадзіць у КПЗ усю апазыцыю. Падобна, што гэта проста не ўсьведамляецца беларускімі спэцслужбамі. Нэрваў і крыві апазыцыі можна псаваць колькі заўгодна, але менавіта гэтая імітацыя інтэнсіўнага бегу на месцы, а не міфічныя баевікі, нясе сёньня найбольшую пагрозу крыштальнаму сасуду, па якім так паказальна ўрэзалі гайкамі.

# Нават сярод паэтаў і нябожчыкаў

шукаюць супрацоўнікі праваахоўных органаў зламысьніка (–ў), што ўчыніў (–лі) выбух у часе канцэрту ў Менску у ноч з 3 на 4 ліпеня. Пошук тэрарыста ператварыўся ў масавую акцыю застрашваньня.



**Маці Сяргея Чыслава і жонка Міраслава Лазоўскага дзяжураць каля турмы.**

### Захоўваеш балты і гайкі — падазраваны

Заклік лідэраў беларускай апазыцыі не спэкуляваць на выбуху ў палітычных мэтах не была пачутая ўладамі. Праваахоўныя органы дэманстратыўна засяродзіліся на паранаідальнай вэрсіі магчымага ўдзелу ў арганізацыі інцыдэнту сяброў «незарэгістраванай дэструктыўнай арганізацыі». Як вынік — хваля арыштаў у Менску і масавыя праверкі на датычнасьць да выбуху актывістаў апазыцыйных структураў у рэгіёнах.

Праверкі ладзяцца схематычна, хутчэй, для застрашваньня, чым для справы:ператрус на кватэры — канфіскацыя «рэчавых доказаў» (сыстэмных блёкаў, дакумэнтаў, нататнікаў, шрубоў, цьвікоў ды гаек, пакункаў ад соку) — затрыманьне. Як паказаў прыклад Паўла Кур'яновіча, забраць могуць і бяз рэчавых доказаў. У выніку, за дзесяць дзён сьледзтва ў якасьці падазраваных былі затрыманыя сябры зьліквідаванай арганізацыі «Белы легіён» Сяргей Чыслаў, Міраслаў Лазоўскі, Ігар Корсак, Віктар Ляшчынскі, сябра партыі БНФ Ільля Багдан, фігурант «Справы 14-ці» Антон Койпіш, студэнтка БДУ Тацяна Пекун, актывіст АГП Аляксандар Сергіенка, актывіст кампаніі «Эўрапейская Беларусь» Павал Кур'яновіч, лідэр незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды Сяргей Высоцкі ды грамадзянін Расеі студэнт Уладзімер Бялунін. Сергіенку, Кур'яновіча і Высоцкага вызвалілі з СІЗА ў суботу, Бялуніна — у аўторак.

### Шукаюць сярод жывых і мёртвых

Пошукі зламысьніка не абмяжоўваюцца Менскам. У рэгіёне невядомага бамбіста таксама «шукаюць» найперш сярод апазыцыянэраў. Часам даходзіць да сораму. Так, у Драгічынскім раёне супрацоўнікі КДБ і міліцыянты заявіліся ў сям'ю нябожчыка Канстанціна Мысьліўца — былога актывіста партыі БНФ, лідэра мясцовай апазыцыі. Словы ягонай жонкі Людмілы, што муж памёр яшчэ ў 2006 годзе, не зьбянтэжылі наведнікаў. Жанчыне, а таксама яе пасынку Кірылу загадалі прайсьці дактыляскапічную экспэртызу і даць пісьмовыя тлумачэньні аб сваім месцазнаходжаньні 3 ліпеня.

Без накладак не абышлося і ў Менску. На станцыі мэтро «Ўсход» мэталадэтэктар выявіў падазроны прадмет у заплечніку паэта Віктара Жыбуля. Пры гэтым міліцыянты паведамілі Віктару пра ягонае падабенства з фатаробатам ды адвялі ў апорны пункт. Там паэта пратрымалі амаль тры гадзіны, узялі адбіткі пальцаў ды пісьмовыя тлумачэньні.

### Сем мільёнаў патэнцыйных тэрарыстаў

Дзеяньні спэцслужбаў выклікалі гнеў сваякоў затрыманых. Жонка Міраслава Лазоўскага Ніна Шыдлоўская на адмысловай прэс-канфэрэнцыі 11 ліпеня заявіла, што паводле матываў, па якіх затрымалі гэтых людзей, можна арыштаваць усё дарослае насельніцтва краіны — ад простага аўтаамагара да хатняй гаспадыні. Справу кваліфікавалі як злоснае хуліганства і з гэтай прычыны яна павінна знаходзіцца ў выключнай кампэтэнцыі МУС, але допыты і арышты ладзіць КДБ, выказала зьдзіўленьне спн.Шыдлоўская.

Праваабаронца Алесь Бяляцкі пашкадаваў з той нагоды, што ўлада ўсё ж пачала «паляваньне на вядзьмарак». Мы маем паліцэйскую дзяржаву, якая цудоўна праслухоўвае тэлефоны актывістаў апазыцыі, але абсалютна няздольная змагацца з сапраўдным тэрарызмам, зазначыў сп.Бяляцкі. На ягоную думку, тое, як вядзецца сьледзтва, дазваляе казаць пра разгортваньне палітычнага тэрору ў краіне. Пацьверджаньнем таму — арышт былых і дзейсных сяброў апазыцыйных палітычных арганізацый. Гэта вельмі паказальна кладзецца на будучую выбарчую кампанію, бо частка арыштаваных зьяўляецца яе актыўнымі ўдзельнікамі, дадаў праваабаронца.

### АДС не выключае байкоту

Масавыя арышты ў шэрагах апазыцыі прымусілі прэзыдыюм АДС склікаць пазачарговы сход і прыняць адмысловую заяву. Уладзе паставілі ўльтыматум: калі нематываваныя арышты і кампанія дыскрэдытацыі не спыняцца, то ў апазыцыі ня будзе іншага выбару, акрамя байкоту. Лідэры апазыцыі запатрабавалі сустрэчы з генпракурорам і адстаўкі кіраўніцтва КДБ. АБСЭ атрымала ад АДС просьбу часова ўстрымацца ад накіраваньня ў Беларусь сваіх назіральнікаў. У звароце да сусьветнай супольнасьці лідэры беларускіх дэмсілаў ускладі частку віны за сёньняшнія падзеі на тых эўрапейскіх палітыкаў, якія дзеля нязначных эканамічных саступак афіцыйнага Менску гатовыя заплюшчыць вочы на брутальнае парушэньне правоў чалавека ў Беларусі.

Лідэр АГП Анатоль Лябедзька не выключае, што ўлады наўмысна падштурхоўваюць дэмакратычныя сілы да пасьпешлівых і малапрадуманых крокаў. На ягоную думку, цяпер усё робіцца для таго, каб апазыцыйныя партыі займаліся толькі высьвятленьнем лёсу сваіх затрыманых сяброў. Так, у пятніцу траіх актывістаў АГП асудзілі на суткі нібыта за лаянку. Вылучэнец палітрады ад АГП ў Цэнтравыбаркам у якасьці назіральніка Міхаіл Пашкевіч ды лідэр менскіх «Маладых дэмакратаў» Віталь Стажараў атрымалі па 15 сутак, кіраўнік «Маладых дэмакратаў» Цэнтральнага раёну сталіцы Кірыла Паўлоўскі — 10.

### «Хімічны сьлед» і дапамога насельніцтва

Тым часам у Сеціве зьявілася меркаваньне, што праваахоўныя ораганы як адну з вэрсій разглядаюць магчымасьць зьдзяйсьненьня выбуху студэнтамі-хімікамі. Нібыта Тацяна Пекун патрапіла ў сьпіс падазраваных таму, што летась праходзіла сьведкай па крымінальнай справе супраць аднаго са студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі. У 2007 годзе ў Менску па вуліцы Магілёўскай, на кватэры ў 21-гадовага студэнта трэцяга курсу 31 траўня адбыўся выбух, у выніку якога той пацярпеў.

Міліцыя ў чарговы раз зьвярнулася па дапамогу да насельніцтва — грамадзянаў просяць прадставіць сьледзтву фота- і відэаматэрыялы, зробленыя на месцы падзеяў. Таксама паабяцаная ўзнагарода за інфармацыю, памер якой залежыць ад каштоўнасьці зьвестак.

Па стане на 14 ліпеня ў бальніцах Менску і Віцебску ўсё яшчэ лекаваліся 32 чалавекі, што пацярпелі ад выбуху. Але галоўнае, што 16-гадовы хлопец, якому гайкі пашкодзілі ўнутраныя органы, выкараскваецца зь бяды.

**Сямён Печанко**

**Лябедзька пераапрануўся валацугам і сам інсцэніраваў сваё зьбіцьцё на Кастрычніцкай**

З такой вэрсіяй сёньня выступіў намесьнік начальніка Менскага ГУУС Аляксандар Найдзенка.

Паводле словаў Найдзенкі, падчас акцыі на Кастрычніцкай плошчы, якая праводзілася ў панядзелак ў знак салідарнасьці з арыштаванымі дэмакратычнымі актывістамі па справе 4 ліпеня, Лябедзька сам паваліўся на зямлю, а супрацоўнікі міліцыі да яго нават пальцам не дакрануліся. Яны проста пераступілі церазь Лябедзьку і пайшлі далей выцясьняць удзельнікаў акцыі з Кастрычніцкай.

Паводле сьведчаньняў журналістаў, Лябедзьку паваліліі на зямлю і некалькі разоў ударылі нагамі. Потым Анатоль Лябедзька зьвярнуўся ў 2–ю бальніцу, дзе зафіксавалі 2 гематомы на жываце і па адной на грудзях, сьцягне і галёнцы.

Нагадаем, што пры канцы чэрвеня, калі на Кастрычніцкай плошчы падчас прагляду паўфіналу Гішпанія — Расея здарыліся бойкі паміж заўзятарамі гішпанцаў–каталёнцаў і прыхільнікамі расейскай зборнай, менская міліцыя таксама выступіла з сэнсацыйнай заявай, што «гішпанцамі» пераапрануліся занесеныя ў Чырвоную кнігу беларускай апазыцыі «зубры».

**АГ**

# Сцэнар прызнаньня

Выбух у сталіцы парадаксальным чынам зьняў важныя перашкоды на шляху да нармалізацыі стасункаў Беларусі з Захадам — Шэймана і боязь уладаў праляцець на свабодных выбарах. Піша **Язэп Кунцэвіч**.

Пытаньні аб тым, хто арганізаваў выбух у Менску і каму ён выгадны, пакінем за дужкамі. У палітычным кантэксьце, як гэта ні цынічна гучыць, больш істотна, як гэтыя выбухі выкарысталі ўлады.

Па-першае, з прынцыповай пасады зьняты Віктар Шэйман. Гэтая адыёзная фігура была істотнай перашкодай для нармалізацыі дачыненьняў з Захадам. Цяпер пытаньне «элегантна» зьнятае. Публічная крытыка ў бок Шэймана з вуснаў самога Лукашэнкі і аднаго з набліжаных да яго рэжымных палітыкаў (Чаргінца) сьведчыць пра тое, што прызначэньне Шэймана на іншую ўплывовую пасаду малаімавернае.

Па-другое, вымалёўваецца лінія на абвінавачваньне ў арганізацыі выбухаў «радыкальнай часткі беларускай нацыяналістычнай апазыцыі». Затрыманыя некалькі актывістаў. Іншых дэмаралізуюцьператрусамі і допытамі.

Па-трэцяе, БДІПЧ АБСЭ ў рэкордна раньні паводле беларускіх мерак тэрмін атрымлівае запрашэньне правесьці міжнароднае назіраньне за выбарамі. Адначасова падобных запрашэньняў, як абвешчана, не атрымаюць арганізацыі, сябрам якіх Беларусь не зьяўляецца (Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы, Эўрапарлямэнт). Такім чынам, беларускія ўлады страхуюцца ад прыезду назіральнікаў, на пэрсанальны склад і мандат якіх яны нават у нязначнай ступені ня могуць уплываць.

У сукупнасьці гэтыя падзеі могуць сьведчыць аб намеры ўладаў паспрабаваць нармалізаваць дачыненьні з Захадам праз правядзеньне міжнародна прызнаных парлямэнцкіх выбараў і нэўтралізацыю часткі іншых раздражняльных фактараў (зьняцьцё Шэймана, вызваленьне — хоць і не даведзенае да канца — палітвязьняў і г.д.). Пры гэтым ісьці на прынцыповыя саступкі заходнім патрабаваньням улады ня маюць патрэбы.

Нэўтралізаваўшы апазыцыю, улады змогуць дазволіць сабе большую канкурэнцыю на выбарах. Не забывайма, што гэта не прэзыдэнцкія выбары, дзе аслабленьне гаек можа прывесьці да ганебна нізкага адсотку галасоў за «гаранта Канстытуцыі». На парлямэнцкіх выбарах можна ахвяраваць і адсоткам прэстыжу. Электарат, агаломшаны выбухамі, будзе яшчэ менш схільны галасаваць за апазыцыю, і без таго скалечаную пракруставым ложкам абмежаваньняў. А міжнародныя назіральнікі будуць задаволеныя касмэтычнай лібэралізацыяй умоваў вядзеньня кампаніі і працэдураў назіраньня ды праходжаньня ў «парлямэнт» пары-тройкі апазыцыянэраў — альбо ўжо падкантрольных уладзе, альбо тых, на каго ў «органаў» ёсьць кампрамат.

Трэба мець на ўвазе, што высновы па выніках назіраньня грунтуюцца, перш за ўсё, на аб'ектыўнай, «тэхнічнай», ацэнцы адпаведнасьці выбараў шэрагу крытэраў, а ўжо потым на такую ацэнку накладаецца суб'ектыўная трактоўка. У выпадку, калі ў кіраўніцтве місіі назіральнікаў акажуцца ў меру ляяльныя да рэжыму людзі, ці (што больш важна) калі яны не зазнаюць прынцыповага ўплыву з заходніх сталіцаў, канчатковая ацэнка выбараў можа быць і дастаткова станоўчая для беларускіх уладаў.

У такі сцэнар выдатна ўпісваюцца нядаўняе «абяскроўліваньне» амэрыканскага пасольства як найбольш прынцыповай і найлепш падрыхтаванай для маніторынгу рэальнай сытуацыі і яе давядзеньня да ведама міжнародных назіральнікаў, разгортваньне кампаніі па дыскрэдытацыі апазыцыі як «агентаў Захаду», паглыбленьне канфліктаў унутры апазыцыі (у прыватнасьці, у БНФ — найбольш дзеяздольнай апазыцыйнай сіле), сьпешка ў прыняцьці новага закону аб СМІ і сыстэматычныя захады па перакрыцьці каналаў фінансаваньня дэмакратычных структураў. Згадайма тут і ўжо абвешчаныя крокі па лібэралізацыі выбарных працэдураў, і настойлівыя запэўненьні Лукашэнкі ў тым, што выбары пройдуць узорна, і запрашэньне ў Беларусь Папы.

Застаецца адкрытым пытаньне, ці такі сцэнар — калі ён, вядома, існуе — ужо ўзгоднены з заходнімі краінамі, ці ён ёсьць пэўнай «аднабаковай ініцыятывай», рэалізацыя якой, нават калі і не дасягне цалкам пастаўленых мэтаў, таксама і ня будзе здольная падарваць унутрыпалітычныя пазыцыі рэжыму.



PHOTO BYMEDIA.NET

**Ад такога твару беларуская ўлада адмаўляецца.**

Рэалізацыя сцэнару прызнаньня — няхай і абмежаванага, нават умоўнага — вынікаў выбараў Захадам можа прывесьці да ўмацаваньня ўлады Лукашэнкі і клану «маладых ваўкоў». Гэта забясьпечыць пэўнае ўзмацненьне пазыцыяў Беларусі ў дачыненьнях з Расеяй і, магчыма, створыць перадумовы для паўзучай лібэралізацыі рэжыму ў аддаленай будучыні. Аднак рэалізацыя такога сцэнару не ліквідуе цалкам рызыку для незалежнасьці Беларусі, а таксама прывядзе да тармажэньня працэсаў нацыябудаўніцтва на дэмакратычным падмурку.

Нацыянальна-дэмакратычныя сілы мусяць ужо сёньня знайсьці адказ на пытаньне, што і як павінна быць зроблена, каб прадухіліць рэалізацыю такога сцэнару і навязаць уладам — і Захаду — свае падыходы.

# Гарантаваныя кацiныя сьлёзы

Улада ўжо дамаглася, што выбухі чэпка асацыююцца з апазыцыяй. Хай сабе потым і высьветліцца недатычнасьць тых, каго цяпер трасуць, — абываталю запала ў падкорку: ці то яны кажух скралі, ці то ў іх... Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

На нарадзе 10 ліпеня афіцыйны кіраўнік загадаў зладзіць выбары «гранічна адкрыта, дэмакратычна ды празрыста».

Калі «рабіць празрыста» ёсьць загадам, а не пастулятам, то лягічна вынікае, што «магчымыя варыянты». Гэтак сама пасьля выбуху ля стэлы, калі адразу стала зразумела, што шыла ў мяху не схаваеш, мэдыям было загадана «гаварыць людзям праўду». Карацей, ручное кіраваньне ў дзеяньні.

Згадка ж пра Захад, хай сабе і са своеасаблівымі акцэнтамі: мы робім выбары не для «іх», а для сябе, — якраз і выдае зацікаўленасьць кіраўніцтва ў паразуменьні з Эўропай. Гэтае жаданьне актуалізуецца пэрспэктывай барацьбы з расейскім мядзьведзем за новы газавы кантракт пры канцы году.

Выглядае, што ёсьць стратэгія: болей-меней карэктным выкананьнем шэрагу фармальнасьцяў стварыць карцінку адносна цывілізаванай кампаніі і потым рытарычна запытацца ў прыдзіраў-заходнікаў: ну, чаго вы яшчэ ад нас хочаце?

Надзея зарабіць ня самыя правальныя балы падтрымліваецца адчуваньнем, што эўрапейскія дзеячы стаміліся біцца як рыба аб лёд у беларускім пытаньні і згодзяцца заплюшчыць вочы на фокус з падменай тавару: замест рэальных элемэнтаў дэмакратызацыі — бразготкі. Ну а калі фінальным акордам кампаніі дыпляматычнага прарыву стане вызваленьне самі-ведаеце-каго — шанцы на тое, што Брусэль растане, рэзка падвышаюцца.

Пакуль жа замежнікам настойліва накідаюць асятрыну другой сьвежасьці. Дэкрэт пра ўлучэньне ў ЦВК сяброў партый выдаюць за дэмакратычную сэнсацыю, хоць такі ж дэкрэт прымаўся і чатыры гады таму. Афіцыйныя асобы замоўчваюць (чытайце першакрыніцы, панове!), што гэтыя сябры пазбаўленыя права ня толькі галасаваць, але і браць удзел у праверках, якія ладзяцца Цэнтравыбаркамам. Карацей, нулі бяз палачкі.

Калі нейкае каліва апазыцыйных прадстаўнікоў улучаць у іншыя камісіі, то гэта, канечне ж, ня створыць крытычнай масы. Фармальную роўнасьць умоваў для кандыдатаў таксама можна болей-меней датрымаць. Ну, бяз дробнага фолу не абыдзецца, але ж, па вялікім рахунку, сапраўды няма патрэбы так ужо дадушваць «эфэмэрную апазыцыю». Пяць хвілінаў выступу па радыё ў нязручны час ці 50 базавых адзінак на плякаты — гэта кацiныя слёзы. Рэвалюцыі ня будзе, а між тым у графах «роўны доступ да СМІ» і «роўныя ўмовы агітацыі» можна ставіць птушкі.

Разам з тым, калі прэзыдэнт падпіша (а гэта можа адбыцца днямі) новы закон аб СМІ — гэта ўдарыць па рэштках незалежных мэдыяў, у прынцыпе перакрые кісларод альтэрнатыўнай думцы. То бок у сыстэмным пляне гайкі толькі закручваюцца.

Апазыцыю сапраўды зрабілі амаль што эфэмэрнай. На яе маргіналізацыю рэпрэсіўная машына працавала 14 гадоў. І цяпер фармальная роўнасьць у выглядзе пяціхвілінкі эфіру выглядае як зьдзек. Хаця б таму, што прапагандысцкія «пяціхвілінкі нянавісьці» зрабілі ды працягваюць рабіць сваю чорную справу. Улада ўжо дамаглася, што выбухі чэпка асацыююцца з апазыцыяй. Хай сабе потым і высьветліцца недатычнасьць тых, каго цяпер трасуць, — абываталю запала ў падкорку: ці то яны кажух скралі, ці то ў іх...

Улады выдатна разумеюць, што ніякай Плошчы ў верасьні ня будзе. Каб у краіне нарос слой нейкага палітычнага гумусу, патрэбен час нават пры ўмове заўважнае адлігі. А таму гульня ў строга вызначаных межах для ўлады прымальная: яна нічым не рызыкуе, а восень брусэльскі плод можа і сарваць.

Між тым апазыцыя ўжо выказала заходнікам сваю занепакоенасьць пэрспэктывай «камэрцыялізацыі» дыялёгу між Захадам ды Менскам. Яна ня згодная на «квоту мандатаў» замест зьмякчэньня рамкавых палітычных умоваў.

Застаецца пытаньне, наколькі стаміўся біцца галавой аб беларускую сьцяну Захад. Неўзабаве мы гэта ўбачым.

# Напярэдадні масавай прыватызацыі

Разьлік прамысловых гігантаў на штоsразовае льготнае крэдытаваньне, падаткаабкладаньне і спрыяльны мытны рэжым ня можа працягвацца вечна. Мы мусім пераходзіць да цывілізаванага працэсу прыватызацыі шляхам акцыянаваньня, заявіў першы віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка.

Урад распачынае маштабную кампанію па рэфармаваньні дзяржмаёмасьці.

З мэтай наступнага продажу ў Беларусі цягам трох найбліжэйшых гадоў маркуецца акцыянаваць больш за паўтысячы прадпрыемстваў рэспубліканскай формы ўласнасьці. Адпаведны пералік прадпрыемстваў знаходзіцца на дапрацоўцы ва ўрадзе.

Для параўнаньня — летась форму ўласнасьці зьмянілі ўсяго пяць рэспубліканскіх прадпрыемстваў, у пазамінулым — чатыры. 10 ліпеня на сходзе Канфэдэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (наймальнікаў) першы віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка заявіў, што «раней мы стрымлівалі працэс прыватызацыі, мы не распрадалі свае прадпрыемствы, як гэта адбылося ў суседніх краінах». Дзякуючы гэтаму, са словаў першага віцэ-прэм'ера, цана кантрольных пакетаў некаторых прадпрыемстваў вырасла ў разы. Паводле чыноўніка, сёньня краіны падышла да новага разуменьня разьвіцьця эканомікі. Разьлік айчынных прамысловых гігантаў на шторазовае льготнае крэдытаваньне, падаткаабкладаньне і спрыяльны мытны рэжым ня можа працягвацца вечна. Мы мусім пераходзіць да цывілізаванага працэсу прыватызацыі шляхам акцыянаваньня, падкрэсьліў першы віцэ-прэм'ер.

Першым са сьпісу прамысловых гігантаў Беларусі будзе акцыянаваны МАЗ. Найбольш імаверным пакупніком экспэрты называюць расейскага алігарха Алега Дзерыпаску, які прымерваецца да Менскага аўтазаводу апошнія дзесяць гадоў. Усяго цягам гэтага году мусяць зьмяніць статус 176 прадпрыемстваў, сярод якіх завод імя Вавілава, БелОМА, завод «Тэрмапласт», Баранавіцкі аўтаагрэгатны завод, Гомельскі завод пускавых рухавікоў.

У 2009 годзе плянуецца акцыянаваньне БелАЗу, «Гомсельмашу», а таксама Маладзечанскага станкабудаўнічага заводу.

У 2010 годзе рэформа закране Менскі станкабудаўнічы завод імя Кірава, Гомельскі станкабудаўнічы завод, Аршанскі інструмэнтальны завод, Аршанскі ды Віцебскі станкабудаўнічыя заводы ды інш.

Прыватызацыйныя ініцыятывы ўраду сутыкаюцца з супраціўленьнем з боку кіраўніцтва прадпрыемстваў, якое, на думку газэты «Беларусы и рынок», папросту зьмірыліся з адсутнасьцю такіх ініцыятываў цягам апошніх гадоў.

**Сямён Печанко**



**Доўгія гады МАЗ быў гонарам дзяржаўнага сэктару эканомікі. На фота: спартовае сьвята.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

## СЬЦІСЛА

### Гістарычны рэкорд падзеньня даляра

Даляр абваліўся адносна эўра да новага гістарычнага рэкорду — у $1,6038. Прычынай падзеньня называюць нэгатыўны стан фінансавага рынку ЗША.

### Падаражэлі гарэлка і праезд

Зь 10 ліпеня згодна з пастановай Міністэрства эканомікі №137 падаражэў праезд у аўтобусах рэгулярных маршрутаў міжгародняга паведамленьня на 20%. Пастанова Мінэканомікі № 139 ад 11 ліпеня прадугледжвае падвышэньне розьнічных цэнаў на гарэлку на 4%.

### Расейцы падазраюць беларускі сыр

Наша ўсходняя суседка падазрае беларускіх вытворцаў у дэмпінгу і пачынае адпаведнае расьсьледаваньне, паведаміла гендырэктар Упраўленьня харчовай прамысловасьці Менгарвыканкаму Глафіра Ермаковіч. Адначасова прэм'ер-міністар Расеі Пуцін загадаў Фэдэральнай антыманапольнай службе разабрацца з сытуацыяй вакол беларускага сухога малака.

### Чарніцы ў цане

Літар ягадаў на рынках каштуе каля 5 тыс. рублёў. Нарыхтоўчыя пункты Белкаапсаюзу прапануюць за кілаграм чарніцаў 4—4,5 тысячы. Хатнія ягады, тыя ж чырвоныя парэчкі, у пяць разоў таньнейшыя. Зьявілася і маладая беларуская бульба. Цана вагаецца ад 750 да 1500 рублёў.

### Вяртаньне ўкладаў гарантаванае да 5000 эўра

Грамадзянам Беларусі з 1 студзеня 2009 г. гарантуецца вяртаньне 100% іх унёскаў (незалежна ад валюты ўкладу) у любым банку на суму, эквівалентную да 5000 эўра ўключна. Такая норма ўсталяваная законам Беларусі «Аб гарантаванай кампэнсацыі банкаўскіх унёскаў (дэпазытаў) фізычных асобаў». Паводле інфармацыі беларускіх банкаў, менавіта ўнёскі да 5000 эўра складаюць да 95% усіх унёскаў. Закон не распаўсюджваецца на абясцэненыя ўнёскі ў Ашчадны банк СССР і банк «Белбалтыя», што збанкрутаваў.

### Хто вінаваты ў сусьветным харчовым крызісе

Ажыятаж вакол біяпаліва спрычыніўся да павышэньня сусьветных цэнаў на харч на 75%, вынікае з сакрэтнай справаздачы Міжнароднага банку рэканструкцыі і разьвіцьця, надрукаванага брытанскай Guardian. Аналіз выявіў, што сусьветны харчовы рынак перажывае дэфармацыю праз рост папулярнасьці біяпаліва: людзі па ўсім сьвеце пачалі выкарыстоўваць зерне найперш для вытворчасьці паліва, фэрмэры займелі стымул адводзіць землі пад тэхнічныя культуры, вытворчасьць паліва справакавала спэкуляцыі на зерневых рынках. Паводле ацэнак МБРР, у выніку росту цэнаў на харч каля 100 млн чалавек у сьвеце апынуліся за рысай беднасьці.

Вытворцы біяпаліва называюць прычынаў росту цэнаў на харч рэзкае падаражаньне нафты.

**СП; паводле БЕЛТА, «Звязда», «Экономическая газета»**

# «Белсат» пачне афіцыйнае вяшчаньне на «Сырыюс-4» з жывога эфіру «Басовішча»

18 ліпеня а 18-й менскага часу «Белсат» афіцыйна пачне трансьляцыю на спадарожніку «Сырыюс-4». Адбудзецца жывы эфір з фэстывалю музыкі маладой Беларусі «Басовішча». А 19 ліпеня ў жывым эфіры «Белсату» канцэрт ляўрэатаў «Басовішча-2008» і госьця «Басоў» — гурту «Нэйра Дзюбель».

Тэставая трансьляцыя першага незалежнага беларускага спадарожнікавага тэлеканалу пачалася 9 ліпеня. Пашыраючы трансьляцыю на «Сырыюс», «Белсат» застаецца і на спадарожніку «Астра».

У сувязі з пачаткам працы на «Сырыюсе» з 18 ліпеня адбудзецца зьмена ў праграме «Белсату». Замест сёньняшняга 3-гадзіннага блёку, які паўтараецца адзін раз, перадачы «Белсату» будуць выходзіць у адным 6-гадзінным блёку з 18.00 да 24.10.

Штодня з панядзелка да суботы пасьля галоўнага блёку навінаў (перадача «Аб'ектыў»), якія з 1 ліпеня выходзяць са студыі ў жывым эфіры, прыкладна а 21.10 у эфіры будзе адна з найлепшых публіцыстычных праграмаў каналу (сярод іх — «Рэпартаж зь Беларусі», «Госьць «Белсату», «Кішэня», «Рэпарцёр», «YoLife!», «Маю права», «Хто ёсьць кім?») або дакумэнтальны фільм на гістарычную тэматыку ці з расповедам пра тыя бакі жыцьця Беларусі, пра якія немагчыма даведацца зь іншых тэлеканалаў.

Асаблівую ўвагу заслугоўваюць дзьве публіцыстычныя перадачы. У суботу — «Тыдзень з радыё «Свабода», падрыхтаваны журналістамі беларускай службы радыё «Свабода». Прэм'ера перадачы плянуецца пры канцы жніўня. А ў нядзелю традыцыйна — тэмы, якія датычаць большасьці з нас, у ток-шоў «Форум» з Эдуардам Мельнікавым.

Адначасова са зьменаю ў праграме ў эфір пачнуць выходзіць дзьве перадачы тэлеканалу «Нямецкая хваля» (Deutsche Welle): European Journal — тэлечасопіс з актуальнымі рэпартажамі з усёй Эўропы на палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя тэмы, а таксама Euromaxx — перадача пра эўрапейскі стыль жыцьця, культуру і адпачынак.

У пятніцу, суботу і нядзелю на «Белсаце» — найлепшыя мастацкія фільмы і забаўляльныя перадачы, сярод якіх — «Жаўтуха» і «Кухня».

Парамэтры «Белсата» на «Сырыюсе»: пазыцыя 5° E , палярызацыя H , частата 12 379,6 МГЦ

# Каб сэрца жыло

Гурт «Крамбамбуля» запісаў дуэтам з Русяй эксклюзіўную вэрсію песьні «Безь цябе» ў рамках акцыі «Сэрца жыве», накіраванай на збор сродкаў на апэрацыю па перасадцы сэрца для Міхася Ларына.

«Мы далучыліся да гэтага праекту, таму што добра разумеем, што здароўе — гэта штосьці, што сёньня ёсьць, а заўтра можа кудысьці зьнікнуць, — заявіў Лявон Вольскі. Горш за ўсё, калі менавіта так, як у Мішы — зьнянацку, безь якіх-кольвек прычынаў. Вельмі хочацца, каб у яго ўсё было добра», — адзначыў музыка.

Пералічыць грошы Міхасю вельмі проста — дастаткова зайсьці ў любое аддзяленьне «Беларусбанку» й мецъ з сабой рэквізыты ягонага рахунку. Квітанцыю запаўняць ня трэба, пашпарт не патрэбны.

**Рэквізыты рахунку:**

Філіял 511 ААТ «ААБ Беларусбанк», код 815 УНП 100349858 р/с 3819382103561для пералічэньня на рахунак №01000019 для Ларына Міхася.

**Паводле Telegraf.by, «Сэрца жыве»**

# Роля КДБ у мэдычных дыягназах

Алесь Каліта прызваны ў войска.

Каля 10 тысячаў навабранцаў папоўняць шэрагі беларускага войска падчас летняга прызыву ва Ўзброеныя Сілы краіны. Выконваць «сьвяты абавязак грамадзяніна Рэспублікі Беларусі» адправіцца і старшыня моладзевага крыла партыі БНФ Алесь Каліта. Паводле рашэньня прызыўной камісіі магілёвец Каліта будзе несьці службу Радзіме у Вайскова-паветраных сілах у частцы № 30151, што месьціцца ў горадзе Фаніпаль.

Яшчэ ў красавіку гэтага году рашэньнем Магілёўскай раённай камісіі лідэра моладзі БНФ прызналі непрыдатным да службы ў войску ў мірны час праз дэфэкт сэрца — у хлопца знайшлі анэўматычнае выпукленьне міжпрысеньневай пярэтыкі памерам 16 мілімэтраў. Аднак праз два месяцы з Магілёва ў Менск нахапіліся два супрацоўнікі КДБ і ўчастковы, якія наўпрост затрымалі Алеся на вуліцы ды перадалі позву ў Ваенны камісарыят для пацьвярджэньня дыягназаў на абласным узроўні.

18 чэрвеня камісія на чале са спн.Урухновай накіравала прызыўніка Алеся Каліту на дадатковае абсьледаваньне ў абласную бальніцу, дзе спэцыялісты зафіксавалі бязь зьменаў усё ж той дыягназ — захворваньне сэрца. Але і гэтая пастанова мэдыкаў ня сталася канчатковаю. Пасьля чарговага ўмяшаньня ў справу супрацоўнікаў Камітэту дзяржбясьпекі рашэньне адносна прызыву Алеся Каліты мусіла прыняць Цэнтральная вайскова-лекарская камісія (ЦВЛК) у Менску. Вырак гэтай інстанцыі стаўся відавочным — літаральна за паўтара тыдні выпукленьне зьменшылася да 5 мілімэтраў і хлопец адпаведна быў прызнаны прыдатным да службы ў войску зь нязначнымі абмежаваньнямі. Рашэньне прымалася Магілёўскай абласной прызыўной камісіяй на чале з Анатолем Гласам у закрытым парадку.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алесь Каліта падчас зьезду Моладзі БНФ.**

Алесь Каліта адразу для сябе пастанавіў абскардзіць рашэньне камісіі і дыягназ ЦВЛК у вайсковай пракуратуры і судах: «Відавочна, што нейкія дактары дакладна сфальсыфікавалі дыягназ, і я хачу даведацца хто».

Алесь Каліта лічыць рашэньне аб сваім прызыве неправамоцным, «бо яно засноўваецца толькі на двух супярэчлівых абсьледаваньнях».

У прынцыпе — руцінная гісторыя супярэчлівых дыягназаў, але міжволі ўзьнікаюць паралелі з гісторыяй прызыву яшчэ аднаго актывіста партыі БНФ Зьмітра Жалезьнічэнкі з Гомелю, які, адмовіўшыся ад прыняцьця прысягі, служыць у войску ўжо больш за паўгоду: «Я буду прымаць прысягу незалежна ад таго, якое рашэньне прыме суд. Мая сытуацыя не такая як у Жалезьнічэнкі: мяне выключылі ўжо даволі даўно і я нідзе дагэтуль не навучаюся. У прынцыпе ўлада зрабіла ўсё паводле закону. Адзінае, у чым бы я хацеў разабрацца, гэта хто столькі часу ў мяне адабраў, каб гэтыя людзі адказалі за тое, што яны абсалютна грэбліва паставіліся да майго часу, — кажа Каліта. — Натуральна, я буду несьці службу па-беларуску і буду таго патрабаваць і ад тых, хто будзе аддаваць загады. Акрамя гэтага, на сёньня я маю шэраг напрацовак некаторых прапановаў па паляпшэньні службы ў войску, каб яно было насамрэч беларускім, незалежным, заснаваным на нацыянальных каштоўнасьцях».

23 ліпеня з роднага Магілёва прызыўнік Алесь Каліта накіруецца ў вайсковую частку ў Фаніпаль на першыя зборы перад пачаткам службы.

**Адам Птушка**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

**8 ліпеня**

**Магілёў**

З Магілёўскага дзяржунівэрсытэту адлічылі студэнта I курсу **Расьціслава Панкратава**, сябра незарэгістраванага «Маладога фронту». Афіцыйная нагода — непасьпяховасьць. Са словаў Расьціслава, восеньню 2007 г. яго пачалі выклікаць на размовы супрацоўнікі КДБ, а з красавіка 2008 г. яму нібыта неаднаразова прапаноўвалі забраць дакумэнты з ВНУ па ўласным жаданьні.

**Нясьвіж**

Актывістку **Насту Азарку** выклікалі ў мясцовы аддзел КДБ на гутарку наконт выбуху ў Менску. Супрацоўнікі КДБ высьвятлялі, дзе яна знаходзілася ў ноч на 4 ліпеня, а таксама паказвалі фатаробат магчымага арганізатара тэракту ды пыталіся, ці не пазнае яна ў абрысах фатаробату каго са знаёмых.

**9 ліпеня**

**Віцебск**

Судовыя выканаўцы пералічылі ўсю пэнсію палітвязьня **Сяргея Парсюкевіча** па выслузе гадоў на рахунак калёніі, дзе той адбывае пакараньне. Зь іх 25% пойдзе на ўтрыманьне Сяргея, а 50% на выплату міліцыянту **Аляксандру Дулубу**, якога нібыта зьбіў Парсюкевіч. Астатнія 25% былі прызначаныя для ўтрыманьня непаўнагадовага сына палітзьняволенага. Аднак чыноўнікі паведамілі, што ў іх ў дакумэнтах ня значыцца, што С.Парсюкевіч мае сына. Цяпер, нягледзячы на тое, што ў прысудзе ўтрымліваюцца зьвесткі пра сям'ю Парсюкевіча, ягоная жонка павінна даслаць ў Шклоўскую калёнію заяву і копію дакумэнтаў сына, і толькі тады ёй перавядуць належную частку грошай.

**Барысаў**

Барысаўская актывістка сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада» **Алеся Ясюк** паведаміла журналістам, што да яе ў кватэру ўварваліся супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным ды зладзіліператрус. Пры гэтым ёй, паводле яе словаў, закулі рукі ў кайданкі.

**Астравец**

Дадому да сябра АГП **Ягора Краснова** прыйшлі два супрацоўнікі Астравецкага РУУС, каб высьветліць, дзе моладзевы актывіст быў у ноч з 3 на 4 ліпеня. У адсутнасьць Ягора пісьмовае тлумачэньне аб ягоным знаходжаньні ўзялі ў ягонай маці. Пры гэтым міліцыянтаў цікавіла ня толькі ноч на 4 ліпеня, але і тое, дзе яе сын быў апошнія дзесяць дзён перад выбухам.

**10 ліпеня**

**Менск**

З I курсу Белдзяржунівэрсытэту адлічылі маладафронтаўца **Алеся Круткіна**. Афіцыйная нагода — парушэньне ўнутранага распарадку ўнівэрсытэту: Алеся неаднакроць затрымлівалі і прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасьці. За гэта ён двойчы атрымліваў строгія вымовы ад адміністрацыі, і яму нават было прапанавана перавесьціся на завочнае навучаньне. У БДУ А.Круткін быў прыняты без уступных экзамэнаў, бо зьяўляецца пераможцам нацыянальнай алімпіяды па гісторыі Беларусі.

На станцыі мэтро «Ўсход» міліцыянты затрымалі паэта **Віктара Жыбуля** — мэталадэтэктар выявіў мэталічны прадмет у ягоным заплечніку. Акрамя таго яму паведамілі пра ягонае падабенства да фатаробату. Віктара адвялі ў апорны пункт, дзе ўзялі адбіткі пальцаў. Паэта пратрымалі 2,5 гадзіны, запісаць ягоныя пісьмовыя тлумачэньні прыехаў сьледчы.

**11 ліпеня**

**Віцебск**

Віцебскага распаўсюдніка незалежнай прэсы **Барыса Хамайду** даставілі ў Чыгуначны РУУС, каб зарэгістраваць ягоную заяву пра напад невядомага. Аднак у пастарунку высьветлілася, што сьведкам канфлікту між Хамайдам і невядомым мужчынам быў міліцыянт у цывільным, які паказаў, што распаўсюднік першым парушыў грамадзкі парадак. У міліцэйскім рапарце было запісана, што 60-гадовы апазыцыянэр нібыта нецэнзурна лаяўся на адрас беспрацоўнага 1971-га году нараджэньня, і апошняга адразу ж адпусьцілі. Суд Чыгуначнага раёну падтрымаў пазыцыю міліцыянта, прысудзіў апазыцыянэру трое сутак арышту.

**Менск**

У раёне вул.Нямігі былі затрыманыя сябры АГП **Міхаіл Пашкевіч**, **Віталь Стажараў** і **Кірыла Паўлоўскі**. Іх адвезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну, дзе склалі пратаколы паводле ч.1 арт. 17 КаАП («Лаянка ў грамадзкім месцы»). Судзьдзя суду Цэнтральнага раёну Тацяна Паўлючук пакарала К.Паўлоўскага арыштам на 10 сутак, В.Стажарава і М.Пашкевіча — на 15 сутак. Сьведкамі абвінавачваньня на судзе выступалі старшы сяржант **Дзьмітры Туркоў** і камандзір падразьдзяленьня **Дзьмітры Арбузаў**.

Варта адзначыць, што ўсе трое актыўныя ўдзельнікі выбарнай кампаніі: намесьнік старшыні «Маладых дэмакратаў» М.Пашкевіч зьяўляецца кіраўніком выбарнага штабу Аляксандра Дабравольскага і вылучаны палітрадай у Цэнтральную выбарную камісію ў якасьці назіральніка, В.Стажараў — кіраўнік менскай гарадзкой арганізацыі «Маладыя дэмакраты», а К.Паўлоўскі — кіраўнік «Маладых дэмакратаў» Цэнтральнага раёну сталіцы.

**Горадня**

Сыноў гарадзенскага журналіста **Міколы Маркевіча Аляксея** і **Міколу** выклікалі ў міліцыю. У сям'і аднаго з сыноў нарадзілася дачка. Са словаў М.Маркевіча, сьледчы **Юры Абрамаў** патэлефанаваў маладой маці ў радзільны дом, каб даведацца нумар тэлефону мужа. Пры гэтым ён казаў, што яе муж недзе хаваецца.

**Драгічын**

Супрацоўнікі спэцслужбаў заявіліся ў сям'ю нябожчыка **Канстанціна Мысьліўца** — былога актывіста партыі БНФ, лідэра апазыцыі ў райцэнтры Драгічын. Заява Людмілы Мысьлівец, што яе муж памёр яшчэ ў 2006 г., не зьбянтэжыла наведнікаў. Жанчыне, а таксама яе пасынку Кірылу загадалі прайсьці дактыляскапічную экспэртызу і даць пісьмовыя тлумачэньні аб сваім месцазнаходжаньні 3 ліпеня, — паведаміў берасьцейскі праваабаронца Ўладзімер Вялічкін.

**Клецак**

У Клецку выдавец мясцовага незалежнага бюлетэню **Сяргей Панамароў** спрабаваў патрапіць на сход прадпрымальнікаў у райвыканкаме. Дзяжурны міліцыянт прымусам вывеў яго на паверх ніжэй, пры гэтым Панамароў пашкодзіў сабе твар аб сьцяну. Ён наведаўся ў Клецкую пракуратуру, адкуль яго накіравалі на мэдэкспэртызу.

**13 ліпеня**

**Беларуска-літоўская мяжа**

У нядзелю ўвечары актывістаў **Вадзіма Бароўскага**, **Арцёма Ластавецкага** і **Пятра Рузава** зьнялі з аўтобуса на беларуска-літоўскай мяжы, калі яны вярталіся зь Вільні. Падчас праверкі рэчаў у В.Бароўскага быў знойдзены бел-чырвона-белы сьцяг і каля 20 старых налепак. Мытнікі склалі на хлопца адміністрацыйны пратакол за тое, што ён не зазначыў сьцяг і налепкі ў дэкларацыі. П.Рузава і А.Ластавецкага адвезьлі ў мясцовы РУУС для высьвятленьня асобы. Праз 7 гадзінаў іх адпусьцілі.

**14 ліпеня**

**Менск**

**Зьміцер Кавалгін**, кіраўнік Фрунзэнскай раённай арганізацыі АГП, і **Віктар Пятроўскі**, адзін зь лідэраў арганізацыі «Маладыя дэмакраты», былі затрыманыя ў раёне плошчы Перамогі ў Менску. Яны распаўсюджвалі ўлёткі з пасланьнем Аб'яднаных дэмакратычных сілаў да выбарцаў. У РУУС Цэнтральнага раёну Менску ў затрыманых зьнялі адбіткі пальцаў і забралі ўсе ўлёткі, а затым адпусьцілі.

**СП**

# Чорнае і чырвонае

Барак Абама не разумее пагрозаў, якія сыходзяць сучаснаму сьвету ад Расеі. Піша **Віталь Тарас**.

Днямі тэлекампанія «Мір», якая вяшчае на Беларусь, паказала амэрыканскі фільм «Трынаццаць дзён» (Thirteen day's), прысьвечаны супрацьстаяньню ЗША і СССР праз савецкія ракеты на Кубе. З тых падзеяў мінула шмат часу. Сёлета 6 чэрвеня адзначалася ўжо 40-я гадавіна забойства Робэрта Кэнэдзі, брата прэзыдэнта Кэнэдзі, забітага ў 1963-м. Абодва Кэнэдзі зьяўляюцца галоўнымі пэрсанажамі кінааповеду.

Здавалася б, фільм, пастаўлены ў 2000 г., павінен быў састарэць. Але зьмест карціны, прафэсійна зроблены на падставе гістарычных фактаў, амаль у дакумэнтальным стылі, падаецца актуальным.

### «Парвэню» і «гарыла»

Апрача асноўнай фабулы – Карыбскага крызісу, які паставіў сьвет на мяжу ядравай вайны, ёсьць у фільме яшчэ адзін, ня менш драматычны сюжэт. Процістаяньне прэзыдэнта Джона Кэнэдзі і амэрыканскіх генэралаў, а таксама, фактычна, усёй ягонай адміністрацыі, улучна з дзяржсакратаром Дынам Раскам. Паводле аўтараў, справа нават ня ў тым, што генэралы хацелі тады любой цаной апраўдацца за паразу ў Затоцы Сьвіньняў на Кубе і паказаць Хрушчову «кузькину мать».

Справа ў тым, што амэрыканскі істэблішмэнт лічыў Джона і Робэрта Кэнэдзі свайго роду «парвэню», выпадковымі людзьмі на палітычным Алімпе. І на тое былі свае падставы. Дастаткова сказаць, што Кэнэдзі быў першым і апошнім прэзыдэнтам-каталікам у гісторыі Злучаных Штатаў, ды яшчэ ірляндцам паводле паходжаньня.

Акрамя таго, вышэйшая кляса не магла дараваць маладым братам Кэнэдзі багацьця, якое дасталося ім у спадчыну, звычкі да шыкоўнага ладу жыцьця, арыстакратычных манераў, якія неймаверным чынам спалучаліся ў іх зь лібэральнымі ідэямі ў палітыцы ды эканоміцы. Надзвычайная папулярнасьць Кэнэдзі, іх вольная манера паводзінаў і асабліва — любоў Джона да жанчын раздражнялі палітыкаў старой фармацыі.

Бацька прэзыдэнта Джозэф Кэнэдзі быў паслом ЗША ў Англіі да пачатку Другой сусьветнай вайны і ўдзельнічаў у падрыхтоўцы Мюнхэнскай змовы ў 1938-м годзе, якая разьвязала рукі Гітлеру. Гэта дало падставу аўтарам фільму ўкласьці ў вусны Дына Раска зьедлівую рэпліку наконт Джона Кэнэдзі — маўляў, сын паўтарае памылку бацькі, спрабуючы ўціхамірыць агрэсара.

У тагачаснай крызіснай сытуацыі ўзьнік момант, калі Джон у сваім процістаяньні палітычнаму істэблішмэнту застаўся ў адзіноце — на ягоным баку засталіся, акрамя брата, усяго некалькі чалавек, у тым ліку тагачасны міністар абароны Робэрт Макнамара. Яго, дарэчы, савецкія карыкатурысты малявалі не іначай як у выглядзе гарылы зь ядравай дубінкай у руцэ — і гэта ў той час, калі Макнамара адыграў, можна сказаць, адну з галоўных роляў у вырашэньні крызісу мірным шляхам. (Гэта ён падаў ідэю марской блякады Кубы замест нападу на яе.) Джону Кэнэдзі ўдалося пераламіць сытуацыю, нягледзячы на жорсткі псыхалягічны ціск з боку ўласных палітыкаў, а таксама шантаж і татальную ману з боку СССР, пры амаль поўнай адсутнасьці інфармацыі аб сапраўдных намерах савецкага кіраўніцтва.

### Кэнэдзі і Абама

На пачатку гэтага году ў фэльетоне «Чаму я не хачу пісаць пра выбары ў ЗША» мне ўжо давялося выказваць думку, што толькі цуд, выглядае, можа перашкодзіць Бараку Абаму стаць прэзыдэнтам. За тры з паловай месяцы да прэзыдэнцкіх выбараў у гэтым ужо мала хто сумняецца. Але ў чым сувязь паміж асобамі кандыдата ад Дэмакратычнай партыі Барака Абамы і прэзыдэнта-дэмакрата Джона Кэнэдзі?

Яна бачыцца ня толькі ў тым, што браты Кэнэдзі ў свой час шмат зрабілі для працэсу дэсэгрэгацыі ЗША — наданьня афраамэрыканцам роўных правоў зь белымі. Працэсу, які зрабіў, урэшце, магчымым вылучэньне цёмнаскурага кандыдата на прэзыдэнты. Абраньне яго, безумоўна пакладзе пачатак новай эпосе ў амэрыканскай палітыцы.

Але ж ня толькі кандыдат ад рэспубліканцаў Джон Маккейн, многія іншыя амэрыканскія палітыкі і экспэрты выказваюць асьцярогі, што Абаму не хапае палітычнага досьведу. Па-сутнасьці, ён, як некалі Кэнэдзі, успрымаецца сучасным істэблішмэнтам як парвэню, выскачка. (Праўда, Абама — усё ж такі пратэстант). Але ў Джона Кэнэдзі былі ясна сфармуляваныя — прынамсі, у многіх найважнейшых пазыцыях — палітычныя і эканамічныя погляды, якіх ён цьвёрда трымаўся. Ці ёсьць такія ж ясныя погляды, цьвёрдыя перакананьні ў меркаванага будучага прэзыдэнта? Асабліва ў тым, што тычыцца геапалітыкі. Многія выказваюць у гэтым сумнеў.

Абама ўмела карыстаецца палітычнай кан'юнктурай, пры гэтым праяўляючы напорыстасьць і гнуткасьць адначасова. Аднак, ці дастаткова гэтых якасьцяў, каб ачоліць нацыю перад навалай звышскладаных праблемаў і пагрозаў, якія паўсталі перад Амэрыкай. І што яшчэ больш важна — перад сьветам, дзе ЗША, хочуць яны таго альбо не, адыгрываюць (адыгрывалі?) вызначальную для лёсу заходняй цывілізацыі ролю.

У амэрыканскіх прэзыдэнтаў XX стагодзьдзя, у тым ліку й у Кэнэдзі, не было ніякіх сумневаў што да прыроды камуністычнага рэжыму — стаялі на чале СССР Сталін, Хрушчоў або Брэжнеў. І таго, як належыць размаўляць зь дзяржавай, якая прызнае толькі мову сілы. ЗША ніколі ў гісторыі ня ставілі на «чырвонае».

Да пуцінскае ж Расеі Белы Дом Буша ставіцца так, быццам гэта цывілізаваная краіна, кіраўніцтва якой можна ўгаварыць «паводзіць сябе добра».

Тую самую лінію, выглядае, зьбіраецца працягваць і Барак Абама.

### Уэсьлі замест Кондзі?

Заклік Алены Бонэр (удавы акадэміка Сахарава) і экс-дысыдэнта Ўладзімера Букоўскага выключыць Расею зь «вялікай восемкі» за агрэсіўную палітыку і за тое, што яе ўлады ўсё больш груба парушаюць правы чалавека, застаўся непачутым кандыдатам ад дэмакратаў. Абама выступіў за далейшае сяброўства Расеі ў G-8. Яе выключэньне ён назваў «кепскай ідэяй», бо без Расеі, на ягоную думку, ЗША ня змогуць змагацца супраць распаўсюджваньня ядравай зброі. Ролю Расеі ў падтрымцы Тэгерану, які імкнецца стварыць ўласныя ядравыя тэхналёгіі, а таксама разьвівае ракетныя, Абама не згадаў.

Варта адзначыць, што адну з дамоўленасьцяў, дасягнутых на саміце ў Японіі, Расея парушыла ўсяго праз некалькі дзён па яго завяршэньні. Разам з Кітаем яна заблякавала прыняцьцё рэзалюцыі ААН пра санкцыі супраць дыктатарскага рэжыму Зымбабвэ. Гэта выклікала абурэньне Англіі і ЗША — не ў апошнюю чаргу таму, што прэзыдэнт Мядзьведзеў удзельнічаў у абмеркаваньні гэтых санкцыяў на саміце, дзе ўсе рашэньні прымаюцца кансэнсусам. Такім чынам, Расея дэманстратыўна парушыла дамоўленасьць. Ці замежнапалітычнае ведамства РФ наўмысна, ва ўгоду Пуціну, «падставіла» кіраўніка дзяржавы, ці ён сам не гаспадар свайму слову — ня так важна. Масква чарговы раз прадэманстравала, што ёй верыць нельга і што ёй пляваць на правы чалавека, тым больш, калі яны парушаюцца ў афрыканскай краіне.

Кандаліза Райс, адрозна ад узыходнай «чорнай зоркі», завяршае сваю палітычную кар'еру. Падчас свайго нядаўняга выступу на радыё «Свабода» ў Празе яна гаварыла аб важнасьці падтрымкі дэмакратыі нават там, дзе, здаецца, згасьлі ўжо ўсе надзеі. Адмовіцца ад такой падтрымкі, на яе думку, азначала б здрадзіць ідэалам дэмакратыі і тым, хто ў іх верыць. Вось чаму, паводле яе словаў, яна забараніла апошнім амэрыканскім дыпляматам пакідаць Беларусь і апускаць сьцяг ЗША над пасольствам у Менску.

Кандаліза Райс, выглядае, застаецца сярод апошніх ідэалістаў у міжнароднай палітыцы. Ідэалістаў у высокім сэнсе гэтага слова. На зьмену, так бы мовіць, рамантыкам вяртаюцца прагматыкі. Такія, якімі былі, напрыклад, Нэвіл Чэмбэрлен і Джозэф Кэнэдзі ў 1938-м.

Замежнай палітыцы, за выключэньнем вайны ў Іраку, яўна не адводзіцца ўдарная роля ў праграме прагматычнага кандыдата ад дэмакратаў на выбарах-2008.

Якой будзе гэтая палітыка пры новай адміністрацыі, застаецца гадаць. Многія экспэрты ўскладаюць спадзяваньні на тое, што Абама — дастаткова разумны і сучасны мэнэджар для таго, каб атачыць сябе не падхалімамі і тупымі выканаўцамі сваёй волі, а спрактыкаванымі прафэсіяналамі з моцнымі маральна-валявымі якасьцямі. (Менавіта такіх прафэсіяналаў яўна бракуе ў атачэньні Аляксандра Лукашэнкі ў цяперашні, крызісны для яго момант.)

Кажуць, сярод кандыдатаў на будучага дзяржсакратара ў адміністрацыі Барака Абамы фігуруе Ўэсьлі Кларк — былы камандуючы аб'яднанымі ўзброенымі сіламі НАТО падчас вайны ў Югаславіі. Паводле некаторых зьвестак, продкі генэрала паходзяць зь Беларусі…

# Расея ўсё яшчэ страшыць

Страх беларусаў перад расейскай мадэльлю капіталізму можа стаць вызначальным для геапалітычнага выбару краіны. Піша **Васіль Аўраменка**.

Сацыёлягі кажуць пра амбівалентнасьць грамадзкіх чаканьняў: адначасова нашыя людзі хочуць мець рынкавыя адносіны і рэгуляваныя цэны, даганяць Эўропу і заставацца ў саюзе з Расеяй, ламаць заганы сыстэмы і захаваць «стабільнасьць»... Гэткія ваганьні адлюстроўваць хістаньні і ў кіроўных галовах, прынамсі, у галоўнай зь іх.

А што калі падысьці да праблемы з другога боку? Чаго сёньня найбольш баяцца беларусы?

Традыцыйны адказ — «абы не было вайны» — траціць актуальнасьць. Нават нягледзячы на татальную афіцыйную прапаганду вайны (праз «гераічны подзьвіг у ВАВ») і маніякальныя пошукі ворагаў за межамі і ўнутры краіны, просты люд ня верыць у імавернасьць замежнай агрэсіі ці грамадзянскай вайны. Не баіцца сярэднестатыстычны беларус і «буржуйскіх страхоцьцяў» — свабоды, дэмакратыі, вольнага рынку, расьпісаных нашай прапагандай самымі чорнымі фарбамі. Па-першае, многія былі на Захадзе і бачылі на ўласныя вочы, як там «кепска». А па-другое, большасьць проста не дае веры, што такое калісьці магчыма і ў нас. А вось чаго многія рэальна баяцца — дык гэта «дзікага расейскага капіталізму». Досьвед суседзяў, па-свойму асьветлены беларускімі СМІ, і кантакты з расейскай рэчаіснасьцю (найперш праз гастарбайтэраў) стварылі ў масавай сьвядомасьці непрывабны вобраз сучаснай Расеі. Тым больш што пэрыяд «дзікага» капіталізму пакрысе завяршыўся эрай алігархіі, што таксама, мякка кажучы, ня вельмі натхняе наш электарат. Пікантнасьць сытуацыі яшчэ ў тым, што беларускі прота-капіталізм, замарожаны ва ўмовах лукашызму на эмбрыянальнай стадыі (т.зв. «рынкавага сацыялізму»), вымушаны будзе ў найбліжэйшыя год — два выйсьці ў вялікі сьвет. Дыскусіі — што лепш, капіталізм ці камунізм, — ужо ня будзе, а вось якім шляхам ісьці — «дзікім» расейска-алігархічным ці «памяркоўным» эўрапейскім — ёсьць сэнс задумацца. І тут, як ні дзіўна, могуць быць сюрпрызы.

Калісьці прэзыдэнт назваў беларусаў «тымі ж расейцамі, толькі са знакам якасьці». Што гэта за знак, і на якім месцы ў нашага чалавека стаіць, ніхто не ўдакладніў. Я паспрабую выправіць гэты недагляд ідэалягічнай вэртыкалі.

Калі ўмоўна вызначаць працэнт «эўрапейскасьці» расейцаў, то гэта будзе каля 50%. Іншую палову мэнтальных традыцый Расеі будуць складаць «бізантыйства», «татаршчына», «панслявянства» ды іншыя культурна-гістарычныя прыкметы, якія выразна аддзяляюць яе ад іншай Эўропы і лічацца прычынай «асобнага» шляху, адрознага ад заходніх узораў. Калі гэтак жа прааналізаваць мэнталітэт беларусаў, то доля іхнай «эўрапейскасьці» дзеля гістарычных абставінаў будзе большай — хай нават на 15—20%. Аднак гэтае «крыху» і можа быць вызначальным пры геапалітычным выбары. Так, беларусы больш памяркоўныя, рацыянальныя, працавітыя і лепш кіраваныя, чым расейцы, гістарычна яны ў большай ступені эўрапейцы, чым азіяты. Напэўна, гэта і меў на ўвазе Лукашэнка, калі ставіў на беларуса «знак якасьці».

«Дадатковы» працэнт эўрапейскасьці і ёсьць адрозьненьнем тутэйшых «тожа рускіх» ад вялікаросаў. І вось, калі раптам паставіць пытаньне рубам — «які варыянт капіталізму вы захацелі б — расейскі ці эўрапейскі?» — беларусы, памеркаваўшы, хутчэй за ўсё выбралі б другі. Бо эўрапейскі (літоўскі або польскі) шлях да капіталізму ім больш блізкі і сымпатычны.

Нягледзячы на моўныя адрозьненьні ад сваіх заходніх суседзяў, 500 год сумеснага жыцьця адбіліся на нас больш, чым 200 год з усходнімі. Дарэчы, інтуіцыйна гэта адчувае і такі «сьвежасьпечаны» беларус, як А.Лукашэнка.

Ягоная заява, што някепска нам было б раўняцца на швэдзкую мадэль «сацыялізму», акурат і высьвечвае патаемную мару тутэйшага чалавека. Адзінае, што пад узьдзеяньнем савецкіх традыцый прэзыдэнт РБ пакуль саромеецца вымавіць слова «капіталізм» (каб не напалохаць стары электарат), аднак сутнасьці гэта не мяняе, бо нават для яго расейскі шлях здаецца неадпаведным традыцыям і характару беларусаў. І тут, канечне, дылема: жорсткая эканамічная залежнасьць ад Расеі і нежаданьне паўтараць яе прыклад. Ці дазволіць расейскі капітал, што дамінуе ў нашай эканоміцы, будаваць іншую, нерасейскую мадэль сацыяльна-эканамічных зносінаў? Ці здолеюць беларусы падпарадкаваць замежныя ўплывы? Як правесьці эканамічныя пераўтварэньні і захаваць палітычную «цнатлівасьць» тутэйшай улады? Вось пытаньні, якія сёньня ва ўсёй сіле паўстаюць, ды ня так перад простымі беларусамі, як перад тымі, хто трымае стырно ўлады і марыць яшчэ доўга яго ня страціць.

*Магілёў*

## Unia




Dolam, БМА-group, 2008

«Поб'ю окна, поб'ю рамы, пошлю к мілой телеграму».

Дзякуючы сваёй здаровай нахабнасьці гэты гурт за два гады літаральна прабіўся на вялікую рок-сцэну. Беларускі фолк-рок цяпер перажывае ня лепшыя часы і адкрыцьцяў у гэтым кірунку ў апошнія гады няшмат, а вось Unia вынятак. Іх працавітасьць не аспрэчыш і падаць сябе яны могуць як сьлед. Музычныя акцэнты яны нібы расстаўляюць слушна, з уменьнем выкарыстоўваюць у цяжкарокавых аранжыроўках дуду і акардэон. Unia — адна зь нешматлікіх камандаў, якая можа зрабіць на сцэне шоў, прытым за іх гучаньне таксама сорам не бярэ.

Безумоўны посьпех альбому — «Свахначка» зь лёгкім псыхадэлічным прысмакам і трохі цяжэйшая «Крынічанька» з сакавітай рытм-сэкцыяй. Але на гэтым радасьці сканчваюцца. Пасьля праслухоўваньня некаторых трэкаў складваецца ўражаньне, што музыкі вельмі далёкія ад беларускай культуры. Надта ўжо тхне банальнай дэкаратыўшчынай і непрыхаванай правінцыйнасьцю. Асабліва тое адчуваецца ў трэку «Кухарочкі». Нямаведама, дзе Unia знайшла той тэкст, але слухаецца дадзены твор надта ўжо дзіка: «Поб’ю окна, поб’ю рамы, пошлю к мілой телеграму». Мо гурту з гэтай нагоды перакласьці назву на расейскую?

Алег Хаменка (вакал якога цалкам завалены ў трэку «Хлопец пашаньку пахае») неяк сказаў, што без праблемаў можа сыграць «Валенкі» так, што песьня загучыць як сапраўдная беларуская народная. Толькі каму гэта будзе трэба?

## Тайлянд

Бангкок-рок, інтэрнэт-альбом, 2008

http://www.tay-land.ru

Спроба аб'яднаць у адно ўсходнюю філязофію, тонкі гумар і любоў да расейскага року.

Працяг «тайскай» рок-опэры з элемэнтамі кітчу ад былога «кэвэкашніка». Спроба аб’яднаць у адно ўсё на сьвеце — усходнюю філязофію, тонкі гумар і любоў да расейскага року. З гэтай нагоды бачыцца два варыянты разьвіцьця падзеяў — Дзяркову альбо трэба зрабіць саўнд яшчэ больш бруднейшым і тады ягоная творчасьць можа набыць культавую панкафарбоўку. Ці пазбавіцца электрычнасьці ды ісьці па сьвеце з гітарай наперавес.

«Тайлянд» сапраўды вельмі асабісты праект, і за плыньню сьвядомасьці Андрэя губляюцца ўсе выдуманыя (а часам надуманыя) музычныя фішачкі і выпакутаваныя гітарныя сола тут толькі замінаюць. Ён часам нагадвае Міхалка (асабліва ў песеньцы «Стекло» — «Я скоро стану Буддой, мне не нужна зарплата»), часам Шадзька («Конец света»), а месцамі падаецца, што ў якасьці запрошанага вакаліста ў «Тайляндзе» пяе Самойлаў з «Агаты Крысьці». Пра водгульле «Пікніку» наагул згадваць ня будзем. Але пры гэтым цяжка назваць «Тайлянд» другасным праектам. За ім адчуваецца арыгінальнасьць і густоўнасьць. І яшчэ тэксты Дзяркова можна расьцягваць на цытаты, там, дзе ён сам не займаецца цытаваньнем. «Моя новая девушка очень похожа на президента США» — +1

## Meduza




Я стал другім, Медиа-груп, 2008

Калі «стоксаў» ды Neo яшчэ можна было перажыць, то Meduzu...

Значна прыпазьніўся з сваім дыскам гэты гурт, вядома ж, калі ён разьлічвае на посьпех. Калі «стоксаў» ды Neo яшчэ можна было перажыць, то Meduza выпадае з гэтага шэрагу. Падаецца, што гэта халасты стрэл. Яны ня стануцца беларускім «Мумі-Тролем» ці хоць бы «Зверями». Нестае на тое харызмы ды незапраграмаванай душэўнасьці. А самае галоўнае — не адчуваецца Ўласнага. Песьні Жэні Воўчака напісаныя нібы па матывах пачутага ў юнацтве — Кузьмін, «Секрет», «Браво» (слухаем «Еду домой», «Я стал другим»). Ён, як той юнак, што прагне пісаць вершы, але адзінае, на што здольны, — займацца ненаўмыснай цытацыяй ужо напісанага. Таму цяжка прыняць тое, што робіць Meduza. Хоць мяркуючы з добрапрычасанага гуку і колькасьці музыкаў, што бралі ў ім удзел, — праца праведзеная неймаверная. Досыць прадумана ўведзеныя духавыя, што ўпрыгожылі некалькі слабых кампазыцыяў. Альбом «Мэдузы» — гэта той выпадак, калі працу, выкананую з доляй прафэсіяналізму, усё адно хочацца назваць самадзейнасьцю.

## Flat




Smile of fortune, Вігма, 2008

Самая заўважная настальжы-каманда на абсягах нашай краіны.

Гэты альбом як музэйны экспанат. Мімаходзь агледзець яго можна, але дакранацца няма ніякай патрэбы. Smile of fortune — гэта шчырае прызнаньне ў любові да ангельскай музыкі. Flat — пэўна, самая заўважная настальжы-каманда на абсягах нашай краіны. Усё, што ім трэба — гэта 1960-ыя, зь іх незабыўнай рамантычнай аўрай. І ставяцца яны да сваёй музыкі гэтак жа, як музэйныя калекцыянэры да майстэрскай працы мінулых часоў. Не сказаць, што такі падыход музыку Flat неяк ажыўляе — яна хутчэй падаецца зьмярцьвелай, як тая штучная кветка, што цешыць вока, але ня мае паху.

Альбом складзены з аўтарскіх рэчаў, але такое адчуваньне, што музыкі ўчыстую перайграюць клясыку року. Гэткая бясконцая ода лівэрпульскай чацьверцы зусім не раздражняе, але роўна з тым не выклікае аніякіх іншых эмоцыяў. Годная музыка фону.

## NHS




700, lacinka.org, 2008

Хто сказаў, што саксафон не беларускі народны інструмэнт?

Малады этна-гурт схітрыўся заняць сваю нішу, узяўшы ў рэпэртуар народныя песьні (адзін твор гурту Kult на гэтым дыску зусім не да месца). Яны не мудрагеляць з электронікай ды і гітарны драйв ім не патрэбны, каб давесьці энэргетыку беларускага фальклёру.

Хто сказаў, што саксафон не беларускі народны інструмэнт? NHS паставілі на духавыя і не памыліліся. Клярнэт, саксафон ды бубны — ім гэтага дастаткова. Гэты гурт можна назваць прадстаўніком трэцяй хвалі «фолк-мадэрну», які ўзяў найлепшае ад першапраходцаў і здолеў пазьбегнуць стэрэатыпнага падыходу, уласьцівага шмат каму зь яго папярэднікаў. У гэтых сьпевах можна ўгледзець уплыў «Камэраты» ды Кірчука, Вайцюшкевіча «баляднага» пэрыяду і зусім крыху «Крыві», але папраўдзе гэты дыск можна паставіць побач з альбомамі згаданых выканаўцаў. Прыджазаваныя фолк-песьні NHS слухаюцца зь вялікай прыемнасьцю, бо адчуваецца ў іх арыгінальнасьць падыходу, якая пры гэтым зусім не парушае першаасновы. Адзінае, што «700» цяжка разглядаць як адзіную канцэптуальную праграму, хутчэй, гэта выпадковы падбор запісаных кампазыцыяў.

**Сяргей Будкін**

# Новая аўдыёкніга Ўладзімера Арлова

«Таямніцы полацкай гісторыі» — гэта своеасаблівае прызнаньне вядомага пісьменьніка ў любові да роднага гораду.

«Таямніцы» ўвайшлі ў сьпіс 100 найбольш папулярных беларускіх кніг XX ст, складзены «Нашай Нівай»




ш у к а й ц е ў д ы с к а р н я х і ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў

## Анатоль Цыркуноў

*Бог ня роўна дзеле.*
*Ф.Багушэвіч*

Мусіць чортава журы
Дзеліць Божыя дары:
У адных ля мора вілы,
У другіх — у пуні вілы,
Адзін есьць шашлык з «дымком»,
Другі — бульбу з бураком.
Адзін п'е віно «бардо»,
Другі розную бурду.
Адным — кірзавыя боты,
Другім — «мазды» і «таёты»,
Яшчэ й яхты на прыкмеце…
Як то будзе на тым сьвеце?



**КОСАЎСКАМУ ПАЛАЦУ ПАШАНЦАВАЛА БОЛЬШ, ЧЫМ НЯСЬВІЖУ. Андрэй Дыбоўскі, аўтар сайту «Глёбус Беларусі», апублікаваў у блогу здымкі рэканструкцыі палацу Пуслоўскіх у Косава. «Івацэвіцкі раён. Пачалася рэканструкцыя палацу Пуслоўскіх 1838 году. Расчышчаны склепы ў левай частцы цэнтральнага аб'ёму, у левым крыле пачалі класьці ўнутраныя сьцены з новай цэглы. У адрозьненьне ад рэканструкцыі ў Нясьвіжы, пакуль нічога не пабурана…»**

## Свабоды бяз крытыкі — няма

**Я ня згодзен з тлумачэньнямі прыманага закону пра СМІ і пратэстую супраць яго прыняцьця.** Бачу ў ім зьдзек з свабоды слова і думкі, якія нам дае Канстытуцыя, у канчатковым выніку гэта зьдзек зь недатыкальнасьці асобы.

Свабоды бяз крытыкі — няма! Гэта павінен разумець кожны незалежны грамадзянін свабоднай незалежнай краіны!

**Мікола Шаравар, Салігорск**

## Для каго перакладаюць на расейскую?

**2 чэрвеня на «Ладзе» дэманстраваўся дакумэнтальны фільм «Зорнае прыцягненьне». Пра лёс Барыса Кіта, нашага славутага земляка.** Словы Б.Кіта, прамаўляныя ім найчысьцейшай беларускай мовай перакладаліся на «вялікі і магучы». Для каго на беларускім канале перакладаюць беларускія словы на расейскую мову?

Пачуцьцё прыніжэньня сталася такім вострым яшчэ і таму, што Б.Кіт зьяўляецца для мяне не зусім староньнім чалавекам. Ён крышку паўплываў на лёс маёй мамы. Ён быў дырэктарам Гандлёвай школы ў Маладэчне, у якой і вучылася мама.

Пасьля адступленьня немцаў усіх вучняў органы НКВД дапытвалі на прадмет удзелу ў Саюзе Беларускай Моладзі. Многіх пасадзілі, хаця ніякай палітыкі ў школе не было. Немцы даводзілі, што беларусам дастаткова толькі ўмець чытаць шыльды ды аб'явы, а Кіт вучыў па праграме сярэдняй навучальнай установы з добрым адсоткам элемэнтаў вышэйшай школы. Ня дзіва, што мама часта ва ўспамінах пра тыя часы казала: «Вучыцца было вельмі цяжка, але цікава». І мабыць, Кіт трохі «вінаваты» ў тым, што мама пасьля вайны стала настаўніцай...

Ці ж настане той час, калі ў грамадзтве будуць ня мы і яны, а толькі МЫ?

**Сяргей Космач, Маладэчна**

## У Берасьці ўшанавалі памяць дзеяча БНР

**У рэдакцыі газэты «Брестский курьер» адбыўся круглы стол, прысьвечаны памяці навукоўца й грамадзкага дзеяча, аднаго з прэм'ер-міністраў і міністра замежных справаў ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі Аляксандра Цьвікевіча.**

У ім бралі ўдзел мясцовыя гісторыкі і краязнаўцы, прадстаўнікі партыяў і арганізацыяў гораду. Асноўнымі дакладчыкамі былі гісторыкі Анатоль Сідарэвіч зь Менску і Міхась Стралец зь Берасьця.

Краязнавец Яўген Бяласін расказаў, як удалося адшукаць сувязь з сынам (Віктарам) Цьвікевіча, які жыў у Санкт-Пецярбургу, а таксама дачкой, што жыла ў Хабараўску.

Сярод прапановаў удзельнікаў круглага стала была і думка распачаць збор подпісаў для ўшанаваньня імя Аляксандра Цьвікевіча ў назьве адной з вуліцаў у цэнтры гораду.

**ІБ, Берасьце**

## Экскурсія па гістарычным цэнтры Магілёва

**1 ліпеня ў Магілёве адбылася экскурсія, зыходным пунктам якой стала адноўленая ратуша — сымбаль аднаго з самых старажытных гарадоў Беларусі.** Арганізатарам пешай дзьвюхгадзіннай экскурсіі, якую правёў вядомы гісторык Ігар Пушкін, стала суполка Магілёўскага ТБМ.

Першая частка экскурсіі, якая сабрала больш за 50 магілёўцаў, натуральна, была прысьвечаная адбудаванай ратушы. Ігар Пушкін распавёў пра гісторыю пабудовы ратушы, яе ролю ў жыцьці гораду на берагах Дняпра. Ратуша, як падкрэсьліў сп.Пушкін, найпершая адзнака самадастатковасьці гораду, сымбаль яго багацьця. Магілёў, які знаходзіўся на скрыжаваньні найважнейшых гандлёвых шляхоў, дзе назіралася спалучэньне бізантыйскай і заходнеэўрапейскай традыцыяў і культураў, быў адным з самых вядомых, нароўні зь Вільняй, гарадоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Тысячагадовая гісторыя Магілёва насычаная трагічнымі і велічнымі падзеямі. Магілёўцы мужна баранілі свой горад ад захопнікаў, вялі гандаль, займаліся рамёствамі, будавалі храмы і ўхвалялі Бога музыкай і сьпевамі. Пачуцьцё волі заўсёды вызначала характар гораду. У другой частцы экскурсіі І.Пушкін распавёў пра тое, як выглядаў сярэднявечны Магілёў, дзе праходзілі яго межы і чым было адметнае жыцьцё месьцічаў.

Многае можна было даведацца пра тагачаснае рэлігійнае жыцьцё гораду, пра суіснаваньне ў ім прадстаўнікоў розных рэлігійных канфэсіяў — праваслаўных, каталікоў, юдэяў. Як вядома, Магілёў быў як цэнтрам адзінай праваслаўнай япархіі на тэрыторыі Беларусі ў Рэчы Паспалітай (архіяпіскап Георгі Каніскі), так і галоўным горадам рымакаталікоў у Расейскай імпэрыі ў канцы XVIII — пачатку XX стст. (арцыбіскуп Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч).

Асабіста я на працягу экскурсіі пераканаўся ў тым, што Магілёў мае вельмі багатую і ўнікальную гістарычную спадчыну. Спадчыну, у якой скрыжаваліся лёсы выбітных людзей самых розных часоў. Спадчыну, якая адлюстравалася ў велічных помніках архітэктуры. Далёка ня ўсе з гэтых помнікаў, на жаль, захаваліся, але яны павінны захавацца ў нашай памяці — памяці ўдзячных нашчадкаў, сапраўдных магілёўцаў, патрыётаў роднага гораду.

Пры канцы экскурсіі старшыня Магілёўскага ТБМ Алег Дзьячкоў пад воплескі прысутных падзякаваў Ігару Пушкіну за выдатны гістарычны экскурс і прэзэнтаваў яму адмысловыя календары, на якіх паказаныя вядомыя гістарычныя асобы, помнікі архітэктуры, якія ўславілі наш горад.

Улетку з удзелам Ігара Пушкіна запланаваная яшчэ адна тэматычная экскурсія па Магілёве — далучайцеся!

**Юрась Каласоўскі, Магілёў**

## Vinsent пабіўся за беларускую мову

**Рэпэр Vinsent запісаў дэбютны альбом «Беларускі рэп». Музыка плённа папрацаваў у студыі, былі прапісаныя ўсе вакальныя партыі, цяпер альбом знаходзіцца на стадыі зьвядзеньня й мастэрынгу.** Альбом уключае ў сябе толькі новыя творы Vinsent'а. Тут і лірыка, і моцныя грамадзянскія, патрыятычныя трэкі, знайшлося месца нават сюррэалізму і сацыяльнай пародыі.

Падчас запісу альбому надарылася, мякка кажучы, непрыемная прыгода. Vinsent запісваў чарговы трэк. У гэты час у студыі, акрамя гукарэжысёра, знаходзіўся яшчэ адзін даволі вядомы музыка (імя не называецца з прычынаў этыкі). Яму не спадабалася мова выкананьня Vinsent'а (усе тэксты музыкі — беларускамоўныя). Потым той пачаў абражаць і самога рэпэра, ягоныя асабістыя якасьці. Vinsent такога не дараваў. Крыўдзіцель дастаў два моцныя ўдары ў твар і паваліўся долу. Завязалася бойка. Гукарэжысёру прыйшлося выконваць функцыі рэфэры і разьнімаць музыкаў. У выніку — падбітае вока ў Vinsent'а, зламаны нос у крыўдзіцеля.

Vinsent так пракамэнтаваў інцыдэнт: «Увогуле я чалавек не канфліктны. Але існуюць такія сытуацыі, калі немагчыма трываць. Так было і тут. Ён абразіў маю мову й мяне, атрымаў па заслугах. Але запіс альбому працягнуўся. І думаю, ад гэтага мае песьні сталі яшчэ больш жывымі. Цяпер усё запісана і справа за гукарэжысёрамі: стварыць файны саўнд. Папярэдне рэліз альбому «Беларускі рэп» заплянаваны на восень 2008 г.».

**Павал Белавус, Берасьце**

## Віня-Пых абвяшчае Файны-Конкурс

**Выдавецтва «Белы Крумкач» і «Беларускі культурна-асьветніцкі цэнтар у Познані» абвяшчаюць конкурс на найлепшы здымак са сваім мядзьведзікам.** Вашыя здымкі зь дзяцінства з плюшавым мядзьведзем дасылайце на адрас vinia.pych@gmail.com да канца ліпеня. Уласьнік найлепшай фатакарткі атрымае ўнікальны падарунак — фота пераможцы будзе надрукаванае ў другой кнізе прыгодаў Віня-Пыха. Тры найлепшыя здымкі будуць узнагароджаныя кніжкамі. Вынікі конкурсу будуць падведзеныя ў жніўні і апублікаваныя на афіцыйнай старонцы выданьня www.vinia-pych.com. Арганізатары таксама пакідаюць за сабой права публікацыі дасланых здымкаў у жывым дзёньніку Віня-Пыха www.vinia-pych.livejournal.com.

**Віталь Воранаў, Познань**

## Конкурс для маладых гуртоў на Be Free

**На сайце euroradio.fm пачнецца першы тур інтэрнэт-галасаваньня за трэкі маладых беларускіх гуртоў, якія хочуць трапіць на Be Free.** Па выніках некалькіх тыдняў галасаваньня будуць адабраныя дзесяць фіналістаў, сярод якіх арганізатары фэсту абяруць тры гурты, што выступяць на фэсьце 9 жніўня. Свой трэк у фармаце mp3 (у якасьці, ня горшай за 128 kbps) разам з кантактнай інфармацыяй і апісаньнем гурту, а таксама фота можна дасылаць на скрыню фэсту fest.svabody@gmail.com.

Свой конкурс будзе і для фанаў, якія захочуць трапіць на Be Free «for free»: аўтары найлепшых камэнтароў і тыя, хто правільна адкажа на пытаньні віктарыны на старонцы і ў эфіры «Эўрарадыё», атрымаюць у падарунак дармовую вандроўку на фэст. Падрабязнасьці пра конкурс — у хуткім часе на нашым сайце www.festsvabody.org!

## Музычная складанка да юбілею БНФ

**«БМAgroup» разам з культурніцкай камісіяй партыі БНФ плянуюць адзначыць юбілей Фронту выданьнем музычнай складанкі «20 гадоў — 20 гітоў».** Удзел у праекце возьмуць вядомыя беларускія рок-выканаўцы і барды. Грамадзкасьць, а таксама экспэртнае журы адбярэ 20 сьпеваў, якія будуць сымбалізаваць пэўны год з 1988 па 2008. Так, імаверна, распачне альбом нефармальны гімн БНФ «Фронт» Сержука Сокалава-Воюша. На дыск несумненна ўвойдуць гіты канца 1980-х, калі «талакоўцы» і «майстроўцы» ладзілі незалежныя канцэрты гуртоў «Бонда», «Мроя», Ulis. 1990-я гады рэпрэзэнтуе цэлая пляяда бардаў — Алесь Камоцкі, Віктар Шалкевіч, Андрэй Мельнікаў, гурты «Крама», N.R.M., Deviation і іншыя. Пэрыяд 2000—2008 прадставяць сучасныя рок-зоркі, пераможцы гіт-парадаў і рок-фэстываляў. Не абыдзецца безь сюрпрызаў.

Кожны ахвотны можа паўдзельнічаць у кампіляваньні складанкі. Для гэтага трэба будзе ўзяць у сядзібе БНФ адмысловую анкету і пазначыць абраныя сьпевы адпаведна году.

Ініцыятары перакананыя, што выданьне складанкі станецца грамадзка значнай падзеяй.

Складанка будзе распаўсюджвацца на дысках, а таксама праз інтэрнэт.

# ВОДГУКІ

## Узаконенае забойства («НН» №20)

Чытала артыкул «НН» пра аборты і водгукі на яго. Праблема вельмі глыбокая. Водгукі, як і сам артыкул, — мужчынскія. Яны, вядома, не цяжараць, не нараджаюць. Выбіраць павінна жанчына, бо ёй выношваць дзіця, ёй нараджаць, ёй гадаваць. І на ўсё гэта трэба мець сілы, здароўе і сродкі. Патрэбен дах над галавой, дапамога дзяржавы і родных. Часам нічога гэтага няма. Калі за выхаваньне дзяцей пачнуць плаціць грошы, як за працу, — хоць бы такія, як за мыцьцё падлогі, — тады і вырашыцца пытаньне. Гэта і будзе сапраўднае гендэрнае раўнапраўе.

**Людміла Ліцьвінава, Менск**

## Якасьць жыцьця: Менск — апошні ў Эўропе («НН» №21)

А так і ёсьць. Найгоршыя крамы. Найменш галерэяў, канцэртаў, культурных падзеяў. Моўная дыскрымінацыя. Муляж замест старога гораду. Найніжэйшыя заробкі. Культ сілы. Культура хамства і даляра. Усё ад хамства ідзе, усёпранікальнага хамства, непавагі да інтэлекту, уласнасьці, культурнае традыцыі.

**мінчанін**

* * *

Крытэры тут падабраныя выключна ў разліку на замежнага турыста, які на тутэйшай мове не размаўляе і вырашае свае пытаньні з дапамогай стосу крэдытак. Да замежнікаў Менск сапраўды ня надта дружалюбны, хоць і не варожы. Так, абыякавы. Для мясцовага ж, які ведае, якую краму наведаць і дзе пагуляць у вольны час, горад зусім някепскі.

**Руды Тамаш**

* * *

На свае вушы чуў як БТ казала, што «ў Менску адным зь нямногіх гарадоў Эўропы і СНД танная і даступная чыстая вадаправодная вада».

**Алесь**

* * *

Менск. Плюсы: 1) адносна чыстае паветра; 2) грамадзкі транспарт; 3) многа паркаў, зеляніны, зон адпачынку; 4) не занадта многа хамаў на вуліцы; 5) бясьпека; 6) месцы для заняткаў спортам. Мінусы: 1) нізкія (для мэгаполісу) заробкі; 2) мала гістарычнай архітэктурнай спадчыны; 3) зусім мала выдатных клюбаў, адсутнасць начнога жыцця; 4) татальнае панаваньне міліцыянтаў; 5) няма вулічных музыкаў ды мастакоў; 6) чэргі (нядаўняя зьява).

**Мікіта**

* * *

Ну ня могуць майстры «халоднай» вайны сядзець бяз справы. У нас былі аповеды пра дохлых пацукоў, у іх — пра тое, што Менск апярэдзілі Прыштына (сталіца Косава), Тырана, Скоп'е, Падгорыца ды іншыя балканскія сталіцы. Разьлік на тое, што яны павераць, бо не бываюць у нас, а мы ў іх. Ведаеце, бэрлінскае мэтро ды бухарэсцкія гатэлі, кажуць, ня лепшыя за менскія. Думаю, і іншыя эўрапейскія сталіцы ў нечым нам саступаюць. Хто быў, той скажа.

**Вінцук**

## Вялікая прыгода ў маім жыцьці («НН» №21)

Прачытаў нагбом. Даўно не адучваў такой асалоды. Дзякуй!

**пятро**

## Гравюра Цюнта і ўлады («НН» №22)

Няўжо нехта можа даць веры, што ўлады, якія руйнуюць Горадню, могуць ацаніць каштоўнасьць гравюры? На гэта іх умовілі, і падзякаваць трэба прафэсару Вячаславу Шведу, які здолеў пераканаць на гэта ўлады. Вялікі вам дзякуй, спадар Швед, за вашыя чыны.

**Spraviadlivy**

* * *

А вы напэўна, уяўляеце, што ўлады — гэта зялёныя чалавечкі з антэнамі, якія зваліліся палі зь месяца? Гэта людзі, зь якімі трэба размаўляць. Да высноваў розуму яны не глухія. Аблвыканкамы фінансуюць выданьне добрых фальклёрных зборнікаў. Людзі з Адміністрацыі ініцыююць выданьне Энцыкляпэдыі ВКЛ. Калі спатрэбілася выратаваць пояс Вітаўта, В.Рабцэвіч напісаў ліст у Адміністрацыю — дапамагло. Хто з мастацтвазнаўцаў альбо партыйцаў спрабаваў рэальна давесьці да ўлад што-кольвек пра лёс Нясьвіжскага замку?

**Сьмех у залі**

## Гармідар дэмакратыі: Украінскія выбары зь сярэдзіны

Нам не патрэбны такі «беспредел», як у Кіеве, але нам патрэбная дэмакратыя. Такая, як, напрыклад, у Чэхіі ці Літве. Вось толькі тып дэмакратыі і яе разьвіцьцё залежаць ад сьветапогляду і мэнталітэту, які пераважае ў грамадзтве. Таму наша дэмакратыя будзе, вядома, не такой, якую мы хочам бачыць, яна будзе далёкай ад дасканаласьці. Але дэмакратыя — гэта ня нешта нерухомае і нязьменнае, гэта працэс, рух уперад ці назад. Украінцы толькі ў пачатку свайго шляху да сапраўднай дэмакратыі, але яны ўжо ідуць ім так, як атрымліваецца, як умеюць. Як кажуць: «Нам бы вашыя праблемы...»

**Дзяцюк**

## Камэдыя выраджэньня (№23)

Мне пінігінская пастаноўка «Пінскай шляхты» не спадабалася. Пінігін не адкрыў Амэрыкі. Толькі замест таго, каб зрабіць мастацтвам сваіх гледачоў крышачку лепш, набліжае іх да быдла.

**Чэсь**

## «Я пераклаў Калевалу» (№23)

Калі я быў малы, тата прывёз зь Менску «Калевалу» (пераклад М.Машары, ДВ БССР, 1956) ў пераказе для дзяцей А.Любарскай. Сам чытаў і сынам, калі дарастаюць да гадоў пяці, чытаю. У кніжцы той цудоўныя малюнкі Н.Качаргіна, хлапцам падабаюцца. Дзякуй вялікі спадару Якубу. Спадзяюся ўбачыць ягоную новую кніжку.

**Міхал Залескі, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Будслаў

Фотарэпартаж
Юліі Дарашкевіч.



Трыццаць тысяч чалавек з усёй краіны і з замежжа сабраліся ўвечары 1 ліпеня на сьвята іконы Маці Божай Будслаўскай — нябеснай апякункі Беларусі.

Найбольш паломнікаў прыйшло зь Віцебскай дыяцэзіі. У найбольшым на ўсю краіну фэсьце бралі ўдзел мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч, апостальскі нунцый арцыбіскуп Марцін Відовіч усе каталіцкія біскупы краіны, а таксама бальшыня ксяндзоў і ўніяцкіх сьвятароў.





## Уражаньні пілігрыма

**Да пілігрымкі я далучыўся раніцай 1 ліпеня ў Сітцах.** У гэтай вёсцы з насельніцтвам паўтысячы чалавек сёлета начавалі 230 глыбоцкіх пілігрымаў. Але дзякуючы мясцовым каталікам, якія сапраўды адказна ставяцца да арганізацыі начлегу пілігрымаў, месца хапіла для ўсіх. Увечары 30 чэрвеня на стадыёне ў Сітцах глыбоцкія каталікі гулялі ў футбол зь мясцовай моладзьдзю. Ці то на поле выйшлі ня самыя лепшыя глыбоцкія футбалісты, ці то занадта стаміліся глыбачане за першы дзень пілігрымкі, матч скончыўся з лікам 7:2 на карысьць Сітцаў.

Цешыць тое, што ў нас у Глыбокім падрастае пакаленьне каталіцкай моладзі. Сёлета два хлопцы пачнуць навучаньне ў сэмінарыях, і праз шэсьць год, калі дасьць Бог, Віцебская дыяцэзія атрымае двух ксяндзоў-глыбачанаў. Сярод моладзі даводзілася бачыць шмат юнакоў і дзяўчатаў зь цьвёрдымі рэлігійнымі і нацыянальнымі перакананьнямі... Спадзяюся, што яны зробяць яшчэ шмат добрых справаў на карысьць Касьцёлу і Беларусі.

Некалькі значкаў «Я люблю Беларусь», якія я ўзяў з сабой у пілігрымку, у мяне літаральна вырвалі з рук — і ўсё роўна ўсім не хапіла :). Так што цяпер я ўпэўнены: Глыбокае мае будучыню, бо ёсьць у горадзе добрая моладзь.

«Молімся за нашу спакутаваную Бацькаўшчыну, каб у ёй нарэшце запанавала свабода, праўда, справядлівасьць і Божая любоў», — такі заклік прагучаў у малітве вернікаў падчас Імшы для пілігрымаў, — і адгукнуўся словамі вернікаў, зьвернутымі да Бога: «Выслухай нас, Пане». Тысячы маладых людзей, якія штогод зьбіраюцца ў Будславе — гэта доказ таго, што пакуль беларусы вераць у Бога, краіна будзе жыць. Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч на галоўнай Імшы 2 ліпеня распавёў пра сваю нядаўнюю сустрэчу з Бэнэдыктам XVI. Папа пераказаў яму словы кардынала Тарчызіё Бэртоне, які за некалькі дзён да гэтага вярнуўся ў Ватыкан зь Беларусі і зазначыў, што ўбачыў тут «жывы Касьцёл». Калі Мітрапаліт сказаў гэта, шматтысячны натоўп вернікаў перарваў казаньне апляддысмэнтамі.

Гэта толькі вонкавы бок таго, што адбывалася сёлета ў Будславе. Ёсьць яшчэ рэчы, якія немагчыма перадаць словамі. Толькі Бог ведае, што адбывалася ў сэрцах людзей. Толькі Бог ведае, які плён прынесьлі і прынясуць малітвы тысячаў людзей, словы, прамоўленыя сьвятарамі ў пілігрымках, з амбонаў і ў канфэсіяналах... Тое, што адчуваеш, калі знаходзісься побач з абразом Маці Божай, перад якім на працягу стагодзьдзяў маліліся нашыя продкі, проста не паддаецца якому-кольвек апісаньню...

**Кастусь з-пад Глыбокага**

# Пра славу і блякласьцьць Грунвальду

З дыскусійным тэкстам выступіў **Генадзь Сагановіч**. Значэньне Грунвальдзкай бітвы ў падручніках па гісторыі Беларусі перабольшанае, піша ён.

Бітва пад Грунвальдам, рамантызаваная пісьменьнікамі і паэтамі, стала адным з цэнтральных сюжэтаў гістарычнай сьвядомасьці беларусаў, адной з тых нямногіх падзей, якімі са школкі вучаць ганарыцца. Мне ж як гісторыку ясна, што якую б фрустрацыю гэта ні выклікала, нам даўно пара адыходзіць ад прапагандысцкіх штампаў і павучыцца ставіцца да Грунвальду больш цьвяроза.

Каб пачаць пераацэнку Грунвальду, дастаткова зьвярнуць увагу на тое, якое сьціплае месца атрымала гэтая бітва ў беларуска-літоўскім летапісаньні. У самых даўніх зводах нашых летапісаў пра яе можна знайсьці літаральна некалькі радочкаў, або й ніякай згадкі, і толькі «Хроніка Быхаўца» зьмясьціла больш-менш разгорнутае апісаньне генэральнай сечы з армійяй Ордэну. Але, што істотна, аўтар хронікі ня зьвязваў з разгромам Ордэну нічога лёсавызначальнага для сваёй дзяржавы ці тым больш для славянства, а проста ўсхваляў ваяцкасьць сваіх суайчыньнікаў: маўляў, прускае войска разьбілі, «гарады і землі пабралі», а рэшту — «выпалілі і выпленілі», пасьля чаго «зь вялікім гонарам… на ўвесь сьвет славу здабыўшы... да сваіх зямель даехалі».

Спачатку ў нашай гістарыяграфіі славутая перамога ацэньвалася таксама досыць стрымана. І ў нашаніўскіх публікацыях, і ў першых сынтэзах айчыннай гісторыі (Ластоўскага, Ігнатоўскага, Доўнара-Запольскага) ёй адводзілася сьціплае месца і не прыпісвалася ніякай лёсаноснасьці. Але пасьля Другой сусьветнай вайны прэзэнтацыя Грунвальду і яго ацэнкі радыкальна зьмяніліся, і спрычыніліся да гэтага, зразумела, зусім не навуковыя фактары. Савецкія гісторыкі пісалі, што ад немцаў зыходзіла «адвечная сьмяротная небясьпека» для славянаў, і толькі перамога пад Грунвальдам спыніла іхную векавую агрэсію, пра гераізм «рускіх палкоў» у гэтай сечы, і г.д. Акурат такі міт Грунвальдзкай бітвы добра знаёмы нам па падручніках, энцыклапэдычных даведніках і папулярнай літаратуры савецкай эпохі. Але парадокс у тым, што ў Беларусі і пасьля распаду Савецкага Саюзу, калі гісторыкі ўрэшце разьняволіліся, тэндэнцыя гіпэрбалізацыі Грунвальду ня толькі не аслабла, а наадварот, стала ўмацоўвацца.

Сапраўды, у сучаснай навучальнай літаратуры Грунвальдзкая бітва заняла нябачанае раней месца, а ў яе апісаньні нязьменна сьцьвярджаецца так знаёмы па савецкіх часах набор тэзаў: ідэя сьмяротнай пагрозы з боку Ордэну ды абарончага характару вайны 1409—1411 гадоў, тэза пра эпахальнае значэньне бітвы, яе выратавальнасьць для славянаў і падобнае. Ня толькі ў падручніках, але і ў навуковых публікацыях у нас можна прачытаць пра пляны Ордэну стварыць «вялікую нямецкую дзяржаву» зь землямі Польшчы, Літвы і Беларусі, пра пастаянную пагрозу «духоўнага і фізычнага вынішчэньня» (або й «анямечваньня»!) літоўцаў і беларусаў, якая зыходзіла ад рыцарскай дзяржавы, ды іншыя неймаверныя байкі… Можна прачытаць нават пра «вялікую вайну» з Ордэнам як барацьбу «за выжываньне славянства»!

Цікава, што нічога падобнага не артыкулявала ані «Хроніка Быхаўца», ані які-колечы іншы помнік айчыннага гісторыяпісаньня. Міф адвечна варожых і агрэсіўных немцаў, запачаткаваны Длугашам, быў нашмат пазьней інкастэляваны ў масавай сьвядомасьці панславізмам як антытэза міфу нямецкіх нацыяналістаў пра «нямецкую культурную місію» на Ўсходзе, а затым гіпэртрафаваўся ў выніку сусьветных войнаў. Але палітычная міфалягізацыя Грунвальду — асобная праблема, а нас цікавіць цьвярозы гістарычны погляд на знакамітую падзею, балазе яна больш за сто гадоў дасьледуецца гісторыкамі, вынікі працы якіх мы ня можам ігнараваць.

Пачнем з плянаў Ордэну і характару вайны 1409—1411 гг.

Па-першае, Ордэн і ў свае найлепшыя часы ня меў ніякіх плянаў стварэньня «вялікай дзяржавы» (тым болей зь землямі Беларусі), бо гэта пярэчыла б яго мэтам, ды было б і не пад сілу. Пагатоў пасьля Крэўскае уніі, калі ордэнская дзяржава незваротна слабела і паволі схілялася да саюзу з ВКЛ.

Пасьля Крэўскае уніі ордэнская дзяржава незваротна слабела і схілялася да саюзу зь Вялікім Княствам Літоўскім.

Па-другое, «Вялікая вайна», падобна да іншых войнаў тых часоў, яшчэ ня мела этнічнага характару і не павінна выдавацца за славянанямецкае супрацьстаяньне. Не гаворачы пра склад войску саюзьнікаў, трэба ўлічваць, што трэціна жаўнераў ва ўладаньнях Ордэну (як і яго войску) была славянскай.

Па-трэцяе, той быццам «выратавальнай» для славянаў вайны магло б і ня быць, калі б да яе сьвядома не вялі справу Ягайла зь Вітаўтам. Вялікі магістар Конрад Юнгінген бачыў будучыню сваёй дзяржавы ў саюзе з Польшчай і ВКЛ (з ужо ахрышчанай Літвой), і нямала дзеля гэтага рабіў. Што праўда, ягоны наступнік Ульрых Юнгінген вызначаўся задзірыстасьцю, аднак і зь ім магчыма было залагодзіць справакаваны Вітаўтам канфлікт. Няўступлівасьць жа вялікага князя і польскага караля вынікала зь іх перакананасьці ў слабасьці Ордэну. Сапраўды, перад вайною адна Польшча ў некалькі разоў пераўзыходзіла ордэнскую дзяржаву па сваім дэмаграфічным патэнцыяле, а разам саюзьнікам проста не было чаго баяцца.

Цяпер колькі «некарысных» заўваг пра саму бітву і значэньне перамогі. Не забывайма, што колькасна войска Ордэну сама мала ўдвая саступала злучаным сілам Ягайлы і Вітаўта, так што зыход палявой бітвы быў практычна перадвырашаны. Што нямецкія рыцары складалі значна менш за палову харугваў вялікага магістра, а добрую траціну — палякі і прусы. І што перамога ў той славутай бітве, аплачаная вялікай крывёю, чыста парыцарску выглядала б лепш, калі б яна была здабытая не пры такой дыспрапорцыі сілаў, і не ў глыбіні Прусіі, і калі б Вітаўт не павёў у хрысьціянскую Эўропу татараў, і калі б пераможцы не займаліся брутальным рабункам, і да т. п., і г. д.




Але перамога ёсьць перамога, і, не гадаючы, зірнем на яе непасрэдныя рэальныя вынікі. Вось жа, падпісваючы ў 1411 годзе мір з Ордэнам, пераможцы задаволіліся кантрыбуцыяй і вяртаньнем Жамойці, дый то адно на час жыцьця Ягайлы й Вітаўта! А палякі й ня згадалі пра Гданьскае Памор'е, якое так і засталося за Ордэнам. Так што, па вялікім рахунку, нікога бітва не ратавала і нічыіх лёсаў не вызначала! Нават лёсу пакананага Ордэну: хоць разгром грунтоўна падарваў сілы і паскорыў яго канец, гістарычна ордэнская дзяржава была асуджаная задоўга да Грунвальду, і ня менш значным яе прысудам можна лічыць заключаную яшчэ ў 1385 г. Крэўскую унію.

Зразумела, гістарычныя міфы — рэч натуральная, і нават карысная для развіцьця нацыі. Але ўсяму ёсьць разумная мяжа. І зьмена міфічнага ўспрыманьня немцаў як «адвечных ворагаў», а Грунвальдзкай бітвы — як «выратаваньня» ад фізычнага зьнішчэньня ці асыміляцыі беларусаў, на спакойнае і рацыянальнае стаўленьне да адной зь вялікіх падзей нашай ваеннай гісторыі, была б і разумнай, і больш годнай памяці нашых далёкіх прашчураў, што склалі галовы ў той векапомнай сечы.

**Бітва пад Грунвальдам**

(15 ліпеня 1410 г.) — бітва злучанага войска Польшчы і ВКЛ з войскам Тэўтонскага ордэну, якая адбылася ў час Вялікай вайны (1409—1411) недалёка ад вёскі Грунвальд (цяпер Дуброўна, Польшча).

Войска Ордэну (51 харугва, каля 15−20 тыс. коннікаў, пяхоты і артылерыстаў) складаліся з рыцараў Ордэну, іх васалаў, а таксама нямецкіх, французскіх, ангельскіх, швайцарскіх добраахвотнікаў і наймітаў.

У складзе саюзных войскаў (50 польскіх і 40 харугваў ВКЛ, татарскія, чэска−мараўскія атрады, 30—40 тыс. коньніцы і пяхоты) беларускія землі прадстаўлялі Гарадзенская, Ковенская, Лідзкая, Смаленская, Мсьціслаўская, Аршанская, Полацкая, Віцебская, Пінская, Берасьцейская, Ваўкавыская, Драгічынская і інш. харугвы.

Войскі Ордэна сталі фронтам у 2 км між Грунвальдам і Танэбэргам (цяпер Стэмбарк) у дзве лініі. Правае крыло першай лініі ўзначальваў Конрад Ліхтэнштэйн, левае — Фрыдрых Валенрод, другую лінію — сам вялікі магістр. Саюзнікі сталі ў тры лініі даўжынёю ў 2,5 км між Грунвальдам і Людвігсдорфам. На левым крыле былі палякі пад камандаваннем кароннага маршалка Збігнева з Бжэзя, трэцяй лініяй камандаваў кароль Ягайла, на правым флянгу сталі войскі ВКЛ зь Вітаўтам, на краі правага флангу — татарская конніца хана Джэлал−эд−Дзіна.




Бітва пачалася апоўдні з атакі коньніцы ВКЛ. Напад быў сустрэты артылерыйскім залпам (адно зь першых ужываньняў палявой артылерыі). Сьледам у бой пайшлі астатнія харугвы, якім ужо не пагражала небясьпека ад гармат і лучнікаў. Цяжкая рыцарская кавалерыя Валенрода рушыла ў контрнаступ. Адначасова ў бой уцягнуліся польскія войскі першай лініі і правы флянг Ордэну.

Лёгкая літоўская кавалерыя не змагла процістаяць тэўтонцам і стала адступаць. Іншая вэрсія — такі быў плян, каб разарваць крыжацкі фронт. Валенрод кінуўся наўздагон, аднак цяжкая конніца Ордэну не магла рухацца хутка, што дало час Вітаўту перагрупаваць войскі. Удар крыжакоў стрымалі «рыцары зямлі смаленскай», якія не адступілі. На дапамогу гэтым палкам Вітаўт выслаў некалькі харугваў.





Польскія войскі, пацясніўшы Ліхтэнштэйна, пачалі акружаць Валенрода яшчэ і з правага флянгу. Каб выправіць сытуацыю, Юнгінген павёў у бой другую лінію, аднак насустрач рушыў Ягайла з рэзервам, а літоўская конніца Вітаўта пасьляхова вярнулася на поле бою і абярнула Валенродавых рыцараў. У куламесе быў забіты Юнгінген.

Пачалася паніка. Частка тэўтонскіх войскаў адмовілася працягваць бітву, частка кінулася наўцёкі.



Нягледзячы на палявы посьпех, сталіцу Ордэну, Марыенбург, саюзныя войскі ўзяць ня здолелі.

Завяршыў Вялікую вайну Торуньскі мір 1 лютага 1411 г. Ордэн губляў частку тэрыторыяў і выплачваў кантрыбуцыю.

Шэраг ганзейскіх гарадоў адмовіліся ад саюзу з паслабелым Ордэнам, які страціў войска, прыток наймітаў і рыцараў з Эўропы скараціўся. Але як самастойная дзяржава Ордэн праіснаваў яшчэ больш стагодзьдзя.

# літаратурны сшытак «НН»

*ліпень 2008*

## Вецер з поўдня

У ліпеньскім Літаратурным сшытку «НН» новыя вершы Хадановіча — з далёкай Калюмбіі — і некалькі ўкраінцаў.

Палітычныя і гістарычныя эсэ Міколы Рабчука друкаваліся ў «НН» і «ARCHE» ўжо ня раз. Астатніх пісьменьнікаў нашаніўская аўдыторыя прачытае ўпершыню. Яны ва Ўкраіне зрабілі сабе імёны, хоць і належаць да наймалодшага пакаленьня. Імя перакладчыцы не выпадковае. Беларускія літаратары адпаведнага пакаленьня маюць з украінцамі цесныя кантакты. Свая інтрыга ёсьць у тым каб пазнаваць у іх творах узаемаўплывы зь беларускімі аднагодкамі. Прылуцкі, Мартысевіч, Хадановіч, Палынская, а яшчэ — блогеркі Ліянэлія, Елавая — і пішуць у блізкім духу, і жывуць падобным жыцьцём. Жыцьцём вялікага гораду і постсавецкай краіны, дзе амбіцыі духу разьбіваюцца ва ўбогую матэрыяльную рэчаіснасьць, а на адлегласьці рукі заваблівае імпэрыя спажываньня... Хадановіч нават зьняўся аголеным разам з сваімі ўкранскімі суфэстывальнікамі.


**Андрэй Хадановіч.**
Калюмбійскі дывэртысмэнт. Вершы ....... 13

**Мікола Рабчук.**
Як я зрабіўся чэхаславакам. Эсэ ....... 14

**Галіна Крук.**
Вершы ....... 15

**Ірэна Карпа.**
Бляндынчык. Апавяданьне ....... 15

**Марыя Вайцяшонак.**
Макі для Няфрэт. Апавяданьне ....... 16

**Андрэй Лянкевіч.**
Ваўчыны бацька. Фотарэпартаж ....... 18

**Аляксандар Фядута.**
Гатэль «У загіблага вершатворцы».
Адзін сэзон у Купалаўскім ....... 20


**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**

# Калюмбійскі дывэртысмэнт



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

1. ЗАЙЗДРАСЬЦЬ

«Божа, як танчаць калюмбійцы!»

Крыху падумаў і дадаў:
«Я хацеў бы пісаць вершы так,
як танчаць калюмбійцы!»

Яшчэ крыху падумаў і дадаў:
«І проста танчыць, як калюмбійцы,
таксама хацеў бы!»

2. ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ

На скрыжаваньні спыняецца матацыкл.
Кіруе дзяўчына ў шаломе.
Ашаламляльна прыгожая.

Ззаду хлопец без шалома.
Сядзіць і —
з рызыкай для жыцьця —
не трымаецца за яе.

І ўсе калюмбійцы навокал
стаяць і думаюць:
«А я б за такую трымаўся.
Нават з рызыкай для жыцьця!»

3. СЫМБАЛЬ МІРУ

У самым сэрцы Калюмбіі,
на авэню El Colombiano
галубка сядае на дах,
а голуб — на галубку.

Тут магла быць мараль:
«Make love, not war!»

Але і безь яе ўсё робіцца правільна!


зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Левым вокам**: фэльетоны, гумарэскі, карыкатуры / Лёлік Ушкін. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. — 146 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

Прэзэнтацыя кнігі пройдзе 18 ліпеня на Ўправе БНФ (вул. Машэрава, 8). Пачатак а 18.00.




**Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы.**




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.**




**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.**




**Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца**




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Як я зрабіўся чэхаславакам

**Мікола Рабчук.** Эсэ да 40-годзьдзя падзеяў 1968 году.



## 1.

Кожны год мы бавілі летнія канікулы на імправізаваным лецішчы — у ладнай, на чатыры пакоі, з двума асобнымі ўваходамі, хаце нашых дзеда і бабулі пад Луцкам. Нас было там шмат — мой брат і бацька, мае стрыечныя браты і сёстры, іхныя бацькі і, вядома ж, дзед і бабуля, якія стаічна трывалі гэтую ардынскую навалу ды нават, здаецца, шчыра ёй радаваліся. Дні былі доўгія і сонечныя, а жыцьцё бясхмарнае. Мы цешыліся бестурботнасьцю, мы запасілі яе на цэлае жыцьцё, плаваючы ў рэчцы, ловячы рыбу, гойсаючы за мячом, лазячы па дрэвах, пераказваючы да позьняе ночы жудасныя гісторыі ля вогнішча зь печанай бульбай.

Мне было пятнаццаць, і я ня надта цікавіўся палітыкай. Мы нават ня мелі тэлевізара на нашым «лецішчы» і, галоўнае, зусім не адчувалі ў ім патрэбы. Аднак нашы бацькі і дзед слухалі-такі «галасы» на старасьвецкай «Сьпідоле» ўпярэмежку з навінамі з кухоннай «брахалкі». І мы, хоць і былі дужа заклапочаныя ўласнымі, куды важнейшымі, справамі, адчувалі: нешта дрэннае робіцца ў іхным незразумелым і нецікавым для нас сьвеце. Брудныя словы «ўльтыматум», «савецкая пагроза», «контрарэвалюцыя» запаўзалі з розных бакоў у нашу сьвядомасьць. І мы адчувалі: гэта акурат тыя словы, якія робяць нашых бацькоў напружанымі і вымушаюць іх замаўкаць ці пераводзіць тэму гаворкі пры кожным нашым набліжэньні. Яны былі савецкімі грамадзянамі, а мы — іх савецкімі дзецьмі, і яны яўна не хацелі, каб мы чулі іхныя палітычныя размовы. Але мы адчувалі: нешта нядобрае робіцца ў Чэхаславаччыне і навокал, нешта такое, што ў кожны момант можа скончыцца вайной — якою б немажліваю ні выглядала яна пад пагодлівым летам сярод райскіх летніх канікулаў.

І калі савецкія войскі ўсё ж уварваліся ў Чэхаславаччыну, мы ўбачылі сваіх бацькоў цалкам прыгнечанымі — так, нібыта яны самі былі чэхамі ды славакамі і іх урад аказаўся скінуты, а краіна — зноў акупаваная чужынцамі. Самым дзіўным, аднак, было тое, што пазыцыя нашых бацькоў нас зусім не зьдзівіляла.

Нашы бацькі не былі дысыдэнтамі, але, як і большасьць заходніх украінцаў, яны ніколі не адчувалі асаблівых сымпатый ні да саветаў, ні да Масквы, ні да камунізму. Як і большасьць заходніх украінцаў, яны дэманстравалі паказную лаяльнасьць да рэжыму і, калі трэба, бралі публічны ўдзел у яго рытуалах. Але ў прыватных размовах, у штодзённым побыце яны не шкадавалі зьедлівых словаў на адрас улады, сыстэмы і ўсяго савецкага ладу. Зьяўляючыся нармальнымі бацькамі, яны зусім не хацелі зрабіць з нас прафэсійных антысаветчыкаў, асудзіўшы на пастаянныя і небясьпечныя канфлікты з паліцэйскім ладам. Яны не вялі з намі ніякіх палітычных размоваў, хутчэй наадварот — усяляк іх пазьбягалі. Але з выпадковых рэплік, жэстаў, грымас, спантанных рэакцый на афіцыйную прапаганду мы не маглі не адчуваць іх глыбокай пагарды да сыстэмы і ўсяго яе ідэалягічнага шалупіньня.

Яшчэ ў малодшым школьным узросьце, зацікавіўшыся хакеем, я заўважыў, што ані мой бацька, ні дзядзька ніколі не хварэюць за зорную і непераможную савецкую зборную. Наадварот, яны заўсёды хварэлі за яе праціўнікаў — ці то шведаў, ці фінаў, ці нават безнадзейных швайцарцаў. І я без найменшай прапаганды разумеў галоўнае: гэта — ня *наша* зборная. І разам з бацькам, дзядзькам, з усімі сябрамі я ад душы зычыў ёй пройгрышу. І калі гэта нарэшце здарылася, калі дзівосная чэхаславацкая зборная разграміла саветы на чэмпіянаце сьвету 1969 году, мы ня помнілі сябе ад шчасьця. Мы плакалі, абдымаліся і цалаваліся; мы былі чэхамі і славакамі ў тое імгненьне, і мы пачуваліся адпомшчанымі за ўсё — і за танкі на вуліцах Прагі, і за полчышчы Мураўёва на вуліцах Кіева, і за Батурын, і за Палтаву, і за голад 33-га, і за ўсё, усё, усё.



**Мікола Рабчук**

украінскі інтэлектуал, працуе ў жанры «гісторыі ідэяў». У 1980-я як антысаветчык вымушаны быў працаваць тэхнічным работнікам у заапарку. У 1997 стаў сузаснавальнікам часопісу «Крытыка». Аўтар кніг «Дылемы ўкраінскага Фаўста» і «Ад Маларосіі да Ўкраіны».

## 2.

Праз некалькі год я хутка вырас і, здаецца, пасталеў. У апошні школьны год я ўжо меў доступ да разнастайнага самвыдату ды іншай нелегальшчыны. Маім бацькам, зразумела, гэта ня вельмі падабалася, і я як умеў прыхоўваў ад іх сваю «падпольную» дзейнасьць. Літаратуру мне пастаўляла Ірына Калінец[*] — яна акурат працавала тады ў маёй школе. Да настаўніцтва яе не падпускалі і блізка, але і на сьціплай бібліятэчнай пасадзе яна ўмудралася весьці даволі актыўную асьветніцкую, ці, як яна гэта называла, прапаведніцкую работу.

Цікава, што сярод тэкстаў, якія я ад яе атрымліваў, былі ня толькі творы Дзюбы, Мароза, Сьверсьцюка, Чарнавола[**], але і чэхаславацкія публікацыі пэрыяду «Праскай вясны». Перш за ўсё гэта быў «Украінскі каляндар» за 1968 год і двухмесячнік «Дукля», які выдавала ў Прашаве, дый, здаецца, і дагэтуль яшчэ выдае, усходнеславацкая ўкраінская меншасьць, а таксама — некалькі добрых кніжак таго самага выданьня, у прыватнасьці аднатамавікі Антоніча і Віньнічэнкі[***] з грунтоўнымі літаратурна-крытычнымі прадмовамі.

«Дукля» таго пэрыяду друкавала ня толькі забароненых ва Ўкраіне пісьменьнікаў, але і перакладала найцікавейшых чэскіх і славацкіх аўтараў, а таксама публікавала пераклады асноўных дакумэнтаў «Праскай вясны». Зь іх было больш чым відавочна, што ніякай «контрарэвалюцыі» ў Чэхаславаччыне не было, а была досыць шчырая (і досыць наіўная, як я зразумеў пазьней) спроба пабудаваць нешта накшталт «сацыялізму з чалавечым тварам». Гэтыя дакумэнты мелі для мяне ў той час асаблівую каштоўнасьць, паколькі ўсё больш маіх таварышаў вярталіся з арміі з прамытымі мазгамі, перакананыя на палітзанятках, што інтэрвэнцыя ў Чэхаславаччыну была неабходная, бо нямецкія войскі нібыта вось-вось мелі перайсьці граніцу, а здрадніцкі контрарэвалюцыйны ўрад у Празе вось-вось зьбіраўся іх запрасіць.

Маім наступным антысавецкім крокам, такім чынам, сталася вывучэньне чэскай і славацкай моваў (славацкая, бліжэйшая, давалася значна лягчэй). Мэта была зразумелая — чытаць кнігі і перыёдыку «Праскай вясны» ў арыгінале. Арыгіналы можна было атрымаць ня толькі ад знаёмых, але і знайсьці дзе-ніздзе ў бібліятэцы або нават у правінцыйных кнігарнях «Дружба», дзе ўкрытыя пылам творы Клімы і Голуба ляжалі побач з поўнымі зборамі Хо Шы Міна і Цэдэнбала[****].

Саветы чамусьці ўвялі дадатковую цэнзуру на кнігі і перыёдыку з Чэхаславаччыны толькі ў жніўні, ужо пасьля таго, як іх танкі акупавалі краіну і фактычна ніякая дадатковая цэнзура не была патрэбная. Бюракратычная інэрцыя і непаваротлівасьць савецкай сыстэмы мелі свае перавагі. Я ўспомню пра гэты забаўны факт праз трынаццаць год, калі саветы дакладна гэтак жа ўвялі дадатковую цэнзуру на польскія кнігі і часопісы толькі пасьля таго, як генэрал Ярузэльскі ўвёў ваеннае становішча і, адпаведна, жорсткі цэнзурны кантроль. Сапраўды, лепш позна, чым ніколі.

Адным словам, няхай Гасподзь недзе там блаславіць постфактум савецкіх ідэолягаў ды бюракратаў за іхную тупасьць і расхлябанасьць. Бо інакш я наўрад ці прачытаў бы ў маладосьці Грабала і Вацуліка, Шкворэцкага і Кундэру. І ўжо напэўна не пераклаў бы канцэптуаліста Ладзіслава Новака і не зрабіў бы зь яго тэкстаў прыгожай самвыдатаўскай кніжачкі з ілюстрацыямі Ўлодка Каўфмана.

Спэцыфічным рэхам шырока разрэкламаванай на пачатку 1970-х чэхаславацкай «нармалізацыі» быў чарговы наступ ва Ўкраіне на «ўкраінскі буржуазны нацыяналізм». Яго кульмінацыяй сталі палітычныя арышты 1972—1973 гадоў, масавыя чысткі культурна-асьветных установаў і далейшае закручваньне русіфікатарскіх гаек. Асабістыя кантакты паміж украінскімі і чэскімі ды славацкімі інтэлектуаламі, што былі наладзіліся ў 1960-я, фактычна перапыніліся. Я практычна нічога ня ведаў тады пра тыя кантакты, хоць і разумеў, што ні «Дукля», ні ўкраінскія кніжкі з Усходняй Славакіі не маглі зьявіцца ў маім львоўскім асяродзьдзі без спрыяньня ўкраінцаў з Прашава, Кошыц ці Браціславы.

Толькі цяпер, пасьля публікацыі лістоў і ўспамінаў украінскіх ды чэскіх дысыдэнтаў той пары, мы можам ацаніць нефармальныя кантакты паміж Прагай і Кіевам, а таксама, у прыватнасьці, адметную ролю, якую адыгрывалі ў іх Зіна Генік-Беразоўская і іншыя чэхаславацкія грамадзяне ўкраінскага паходжаньня — як выхадцы з Усходняй Славакіі, так і нашчадкі ўкраінскай антыбальшавіцкай эміграцыі 1920-х.

## 3.

Чэхаславаччына была першым замежжам, якое я наведаў у час перабудовы ў 1987—1988 гадах — як толькі мяне пачалі выпускаць з саўдэпіі. У Празе, дзе я намагаўся размаўляць па-чэску, мяне прымалі за паляка. У Браціславе, дзе я размаўляў па-славацку, мяне прымалі за югаслава. Ніхто чамусьці не падумаў, што я ўкраінец, або жыхар СССР, або, крый божа, расеец. І першых, і другіх у савецкай арміі, якая вызваляла чэхаў ад чэхаў, было нямала. Я б таксама мог там быць, калі б нарадзіўся на некалькі год раней. Бог усьцярог мяне ад гэтай асабістай ганьбы, але не ад ганьбы нацыянальнай.

Я завёў сабе трохі сяброў у Празе і Браціславе і прывёз для іх цэлую торбу «падрыўной» літаратуры — таму што гэта быў сапраўды рэдкі і вельмі кароткі пэрыяд у гісторыі, калі палітычны рэжым у маёй краіне аказаўся больш прагрэсіўны і ліբэральны, чым у іхнай. Мы пілі піва ў Празе і белае віно ў Браціславе, і я расказваў калегам неймаверныя рэчы пра тэксты, якія ў нас друкуюцца цалкам легальна, і тэмы, якія абмяркоўваюцца зусім адкрыта, і масавыя акцыі, што праводзяцца без уладных дазволаў ды паліцэйскіх рэпрэсій. Мае сябры хацелі, каб перабудова дайшла і да іх, і я запэўніваў, што дойдзе, — бо гэта быў сапраўды час вялікіх спадзяваньняў і абнадзейлівай усходнеэўрапейскай салідарнасьці, ня зьнішчанай яшчэ цынізмам шыракай-шродэраў ды іншых фэргойгенаў.

І калі перабудова праз год дайшла-такі да Прагі, яна аказалася такой жа вялікай, прыгожай і неймавернай, як і перамога іх хакейнай зборнай у 1969 годзе. Гэта была сапраўды аксамітная рэвалюцыя, мяккая цьвёрдасьць, сіла бясьсільных. І, як тады, я зноў адчуў сябе на кароткае, але надзвычай шчасьлівае імгненьне — чэхам. Славакам. Немцам. Вугорцам. Баўгарам.

А неўзабаве, на пачатку сьнежня, мне выпала паехаць з калегам-журналістам у Варшаву. Мы дамовіліся пра інтэрвію з Адамам Міхнікам у яго дома. Гаспадар, аднак, бавіўся. Яго жонка частавала нас чаем і выбачалася: «Адась вось-вось прыйдзе». І ён сапраўды прыйшоў, аж уляцеў у пакой, падскокваючы, ня помнячы сябе ад шчасьця і выгукваючы апошнюю навіну, якой мы ўсе чакалі: «Wyperdolili Causescu!»

Гэта была адна з найсьвятлейшых хвілін маго жыцьця, адна з самых запаветных спраўджаных мараў — перамога маю каманды над неадольным монстрам, трыюмф сілы слабых над бясьсільлем дужых. Ён быў у той момант румынам, і мы — таксама.

Я сапраўды ня ведаю, ці шмат румынаў, славакаў, чэхаў адчувалі сябе ўкраінцамі ў трывожныя дні Аранжавай рэвалюцыі. Я толькі ведаю, што многа палякаў былі ўкраінцамі ў тыя дні. Але я веру, што ня толькі палякі.

Гэта, уласна кажучы, усё, што я магу прыгадаць пра 1968 год, які расьцягнуўся ў маім жыцьці амаль на паўстагодзьдзя.

*2008*

[*] Жонка ўкраінскага паэта-дысыдэнта Ігара Калінца.

[**] Украінскія дысыдэнты, кожны зь якіх правёў гады й дзесяцігодзьдзі ў савецкіх турмах. Пасьля падзеньня СССР Вячаслаў Чарнавіл узначаліў Народны рух Украіны, атрымаў званьне Героя Ўкраіны пасьмяротна. Іван Дзюба стаў акадэмікам і кіраўніком інстытуту Акадэміі навук. Яўген Сьвярсьцюк узначаліў Украінскі ПЭН-цэнтар. Валянціна Мароза разам з трыма іншымі дысыдэнтамі ў 1979 годзе выменялі на двух савецкіх шпіёнаў. У ЗША ён выкладаў у Гарвардзкім унівэрсытэце, у 1990-м вярнуўся ва Ўкраіну.

[***] Украінскія пісьменьнікі (Віньнічэнка таксама палітычны дзеяч УНР), замоўчваныя ў Савецкай Украіне.

[****] Кіраўнікі камуністычнага Віетнаму і Манголіі.

**ГАЛІНА КРУК**

# Вершы

***

зрэдку да мяне заходзіць чачэнка–сьмяротніца,
сядае за стол, і мы доўга гутарым пра дзяцей
бо пра што ячшэ могуць быць размовы ў жанчынаў
з такімі прасьветленымі тварамі
— учора мой упершыню спытаўся пра сьмерць, — кажу я, —
і я блытана спрабавала патлумачыць яму, чаму...
— мой мяне разумее без тлумачэньняў, — кажа яна, —
ведаеш, яны цяпер так хутка дарастаюць
да першага стрэлу...
— як да першага прычасьця, — думаецца мне,
але гэта ўжо з нашай — soft–вэрсіі — вечнасьці
мы так часта спрабуем выхаваць нашых сыноў лагоднымі,
што яны ўрэшце рэшт паміраюць ад страты годнасьці
— a la guerre comme a la guerre —
кажа яна з досьведу сваёй францускай філялёгіі
і чачэнскай гісторыі
і мне няма чым запярэчыць з досьведу сваёй украінскай,
абцяжаранай недарэчнымі памяншальна–ласкальнымі суфіксамі
і суцэльнымі знакамі мяккасьці
мы так рупліва вучым нашых сыноў паліткарэктнасьці,
што яны ўрэшце рэшт паміраюць ад ніякаватасьці
— сьвет не пакідае нам іншага выйсьця, —
кажа яна, разьвітваючыся,
і я папраўляю яе валасы, што выбіліся,
раскошныя чорныя валасы
пад дабротнымі вайсковымі ботамі —
пройгрышная роля маці
ў касавым расейскім м’юзыкле

***

сьніцца мне бомбасховішча на ваколіцы памяці.
апошняе, што захавалася са школьных урокаў ваенкі
*— вайны больш ніколі ня будзе,* — казала настаўніца,
*але кожны з вас, дзеці, павінен памятаць:*
*у выпадку ядзернага выбуху,*
*ужываньня зброі масавага паражэньня*
*ці іншага казусу*
*трэба спускацца ў бомбасховішча, пазьбягаючы панікі,*
*браць з сабою толькі неабходныя рэчы, нічога лішняга,*
*цёплую вопратку, на выпадак калі вайна пратрывае да холаду —*
*бомбасховічы, каб жа вы, дзеці, ведалі, не ацяпляюцца*
— а хіба нам і так там ня будзе горача? —
кідаў хтосьці з «камчаткі» дасьціпную рэпліку
*— а цябе, Грынавец, могуць туды не пусьціць увогуле,*
*месца хопіць ня ўсім,*
*запасы вады і прадуктаў абмежаваныя...*
я ўжо ведаю,
ў гэтым армагедоне ня ўдасца пазьбегнуць панікі,
колькі дзяцей затопчуць
на спуску ў апошняе бомбасховішча?
не ўяўляю сабе, як, Божа, ты будзеш рабіць выбарку —
кожны дзесяцітысячны?
кожны мільённы?
а як жа пагрэшнасьць?
я веру, што абыдзецца без дыскрымінацыі
па поле, па расе, па веравызнаньні,
хочацца верыць...
колькі глыткоў паветра кожнаму зь іх дастанецца,
пакуль яны будуць чакаць свайго deus ex machina...
*— кожны клас,* — казала настаўніца, —
*трымаецца свайго настаўніка*
*і ячшэ раз паўтараю, не насіцца ў праходах між нарамі,*
*мець пры сабе ў нагруднай кішэньцы бірачку з іменем,*
*напісаным каліграфічным, а не такім, як у цябе, Федчанка, почыркам...*
навошта? — зьдзіўляюся я дагэтуль,
відаць, для таго, каб анёлы,
якія будуць выносіць душы (бо ніхто так напраўду ня выжыве)
каб анёлы ў белых шатах з чырвоным крыжом
(і паўмесяцам?)
каб анёлы ведалі, як, малы, да цябе зьвяртацца...

**Пераклала з украінскай Марыя Мартысевіч**



**Галіна Крук**

паэтка, аўтарка зборнікаў «Мандри у пошуках дому», «Сліди на піску», «Обличчя поза світлиною». Працуе на катэдры ўкраінскай літаратуры Львоўскага нацыянальнага ўнівэрсытэту імя Івана Франка.

# Бляндынчык

Ірэна Карпа.

— Excuse me? — перапытаў вылюдак. — Прастуй, кажу, адсюль! — таўханула яго на ўсходы я.



**Ірэна Карпа**

украінская пісьменьніца, тэлевядучая, зорка шоў–бізнэсу, якая зрабіла публічным нават сваё вясельле, сьпявачка (гурт «Qarpa»), музыка якога ўяўляе сумесь індастрыялу, панк–року, гардкору і псыхадэлічнага трып–гопу. Аўтарка раманаў «Фройд бы плакаў», «Перламутравае порна», «Bitches Get Everything».

— Ну-ну... — загрукатаў прывід са змроку прыбіральні. Давялося зачыніць і яго.

— Ух! — я ўселася на канапу і абцерла пот. Зь пятага паверху зноў нешта скінулі на мой балькон. Можа, нарэшце, самагубства? Чорта лысага: суіцыдальныя думкі замучылі толькі старое футра. Падаючы, яно яшчэ й зламала мой кактус.

— У-у-у, бывай, адзіны сябра... — я заплакала.

— Слёзы я, наверно, наревела их... — завыла лярва-суседка і беспардонна папхала да майго тэлефону. Той зьвягнуў на яе проста пад пальцамі, і я схапіла слухаўку.

— Га?

— У сраццы нага! (Каханы быў вытанчаным ком тужур.) Ты зьбіраесься ўступаць у партыю радыкальных мясаедаў?

— Не... Я ем толькі грэчку з цыбуляю.

— Ну й правільна, я таксама гэта... купіў сабе соевае крэсла й канапу з вотруб’я.

— От жа... — я кінула слухаўку. Суседка жвава шпурляла бігудзі ва ўнітаз і шалёна цешылася бульканьню. Я ўздыхнула і пайшла з расчыненай кватэры.

— Каханка сабе знайсьці ці што? — спытала я пэнсіянэрку ля пад’езду. Тая спрабавала ўдарыць мяне кавенькаю, але прамазала.

— А што, ідэйка — люкс! — і я адразу подскакам завярнула налева. Ну не: у гэтым квартале каханкі ня водзяцца. Тут жывуць адно спарахнелыя бабулькі з сваімі катамі. А катоў я нешта ня вельмі... О!!! Цю-цю-цю, які бляндынчык! Прыгажун!

— Хадзі-хадзі, ня бойся, — я прысела на кукішкі і працягнула да яго рукі. Бляндынчык зладзеявата азірнуўся, а тады — р-раз! І скокнуў да мяне ў абдымкі.

— Танчыць умееш? — жартаўліва насупілася я.

— Ну, толькі калі дужа п’яны... — засмуціўся Бляндынчык. — Затое ў мяне сьветлыя вочы і да д’ябла добры торс!

— Угу. Тады злазь на зямлю і пацалуй мяне ў плячо.

Бляндынчык скарыўся.

О, і вусны нішто сабе: мякенькія, пяшчотныя. — Ну, добра. Значыць, будзеш маім Каханкам.

— Ур-ра! — вусны і вочкі зноў заскочылі мне на шыю.

— Ух які ж ты... аўтарытарны! — я скінула яго зь сябе, як мадам гаржэтку. — Давай руку. Ідзі прыстойна і не мілуйся, пакуль ня просяць.

— Цяпер жа нас стала двое: я і Бляндынчык. Так і ў партыю ўступаць ня страшна.

— Мабыць, апроч Маркеса нічога і не чытаў? — галянтна запыталася я.

— Полковнику никто не пишет… — зашчабятаў Бляндынчык. — А куды мы ідзем?

— Цыц. Пабачым, — сказала я, бо панятку ня мела, куды вяду гэтую непараўнаную істоту. Можа, цалавацца? О, тады — блізу мора! Да мора на мэтро не заедзеш, дык мы злавілі жоўтае таксі. Рамантыка...

— Хвалькі ціха гайдалі чаек, матрацы ды сьмецьце. За паласатым шэзлонгам маячыў бязьлюдны куточак. Я пасьцяліла Бляндынчыка і сабралася была пазяхаць, але раптам...

— Ой, а ты ж файна цалуесься! — расплюшчыла я вочы. — Дзе навучыўся?

— У цябе... — апусьціў вочкі.

— Ды ну?

— Ага. Проста ўсё паўтараў за табою, — і выканаў яшчэ адзін ачмуральны пацалунак. «Але ж, — разважала я між тым, — калі ты — маё люстэрка, дык я што — ледзь не вычварэнка?!»

— Каралева... — прастагнаў Бляндынчык.

Мне стала сьмешна: гы, якое дурнаватае слоўца.

— Прабачце, вы б не маглі вызваліць тэрыторыю дзіцячага пляжу? — пацікавіўся яшчэ адзін бляндынчык (у міліцэйскай форме).

— А мы яе не кабалілі! — нахаміў мой.

— Як жа мяне дастала гэтая сьпёка! – пажаліўся міліцэйскі і сеў да нас. Я расшпіліла яму каўнер кашулі.

— Можа, панырцаваць? — лянотна мовіла я.

— У цябе? — пажвавеў Бляндынчык.

— Нырцаваць нудотна, — заўважыў міліцэйскі, — і, апроч усяго, забаронена.

Мы расцалаваліся зь міліцэйскім і пайшлі да некага дадому. Апынулася, што да майго Каханага, бо ні ў мяне, ні ў Бляндынчыка дому не было. Не, у мяне, здаецца, зранку быў, але нейкі дзіўны... Дый да Каханага бліжэй. І сьцены ягонага пад’езду лепш размаляваныя.

— Каханага альбо ключоў, на жаль, не знайшлося. У паштовую скрынку Бляндынчык ніяк ня ўлазіў, дый месца там толькі на аднаго. Ох...

— Можа, ты галодная? (Божа мілы, колькі клопату!) — Не, жыцьцё маё, я ня ем. Змагаюся за здаровае суіснаваньне: я ня ем расьлінаў, — камары не ядуць Мяне.

— А-а-а... — павёўся Бляндынчык.

— А ты як?

— Ну, цяпер як і ты! — бадзёра прагнаў ён бурчаньне ў страўніку.

— Хадзем, дурненькі, я прыстараюся табе грэчкі.

— З цыбуляю?

— А як жа!

— Я... Я, дадушы, люблю цябе! — рэха ад пацалунку абляцела тры кварталы. «Час варушыць мазгамі!» — скеміла я.

— Ты кахаў калі-небудзь?

— Так...

— Ну, я ня маю на ўвазе першую настаўніцу ці голую цёцю ў кіно.

— А, тады яшчэ не. То бок ДА ЦЯБЕ яшчэ не.

— Што-о-о?!! — (не, гэта ня я так загарлала). Нейкая рудая распусная краля выскачыла з-за рогу нібы Піліп з канапель і перапалохала майго Бляндынчыка да ікаўкі.

— Гапіку, да мяне! — шчоўкнула яна скураным канчуком і так трасянула бразготкамі на цыцках, што мяне ажно дрыжыкі схапілі. Бляндынчык казеліўся на яе як трус на пажарны шлянг і не пераставаў ікаць. Найдурней выглядала я, з разяўленым ротам назіраючы за канцом свайго шчасьця. Рудая самка колькі разоў драпежна клацнула зубамі, а пасьля заўсьміхалася з жадобай. Бляндынчык, ці Гапік, такое сабе хамідла, нават не азірнуўшыся, падабраў гэтае «замест хваста» і папоўз да рудой. Тая пачухала яму за вухам, і яны гідотна зацягнулі: «Полковнику никто не пишет…» Абняліся, страшыдлы, і бывай, маё ты цуда сінявокае... Хаця б валасок бялявы адстрыгла — дзе там... пайду, напэўна, бігудзі ў каналізацыі лавіць, бо яшчэ, крый божа, у партыю мясаедаў захочацца. Радыкальных.

...Эх, бляндынчык, бляндынчык...

**Друкуецца паводле http://lib.proza.com.ua**

# Макі для Няфрэт

Апавяданьне. Марыя Вайцяшонак.

Ад самай раніцы, як толькі на рэшце прыехала на лецішча, дзень перазапаўняўся патаемным сэнсам.

Пэўней сказаць, не прыехала, а прыляцела. Вясна пачалася рана, я засьпяшалася зьвязваць клункі, валізкі, і раптам палі халады. І не пасьпеўшы ад'ехаць па цяпле, я як у паветры ўвесь той час — стома бы на шляху доўгага пералёту, хоць яшчэ і зь месца была не скрануўшыся. Цяпер рупіла хутчэй узяцца за работу. Ці я з хаты, ці я ў хату — усё яшчэ ў вузлах ля парогу. Не разглядацца, хто дзе на вёсцы, не падымаючы галавы ад зямлі, пакуль, як той казаў, «кросны не пастаўленыя».

Але як было не загаварыць, убачыўшы суседа Мар'яна?

— Як зімавалася? — быццам звычайны такі пароль тых, хто жыве зімой у горадзе.

— Спаў апрануўшыся… з сабакамі разам… хата сьвіціцца, лядоўня, ня хата… Я і ўлетку сплю ў адзежы. Ты распранесься, ляжаш, расслабісься, а д'ябал ужо тут! Падыдзе, украдаючыся, да цябе, цёпленькага, і спакусу падсуне пад нос. А я ваяр Хрыста — р-раз! і на нагах! і ў страі! Мяне не спадманеш!

Стаіць гэты ваяр, абшукаўшыся, твар нерухомы, застылы, на галаве па самае брыво цёплая панчоха, завязаная на цемені гарбузовай завяззю. Няма мне калі яму патураць, няма калі, кажу.

— Няма калі?! Ніколі не кажы гэтага, не падманвай нікога… Можа ня быць хлеба, солі, запалак, але гэта часовы недахоп. Часу ў чалавека неабмежавана — вечнасьць…

Мяне бы злавілі за руку, затрымалі, з надарванага пачка сыплецца семя радысы мне пад ногі, на дарогу. Стаю асалавеўшы, аж вушы заклала, бы дала нырца ў бясконцую раку часу. Адпусьціў боль нязьдзейсьненага, боль скваспнасьці, боль згуб, боль зайздрасьці — вызваленьне ад усяго матэрыяльнага, тленнага. Сэрца пульсавала, як на гіпнатычным сэансе.

Ледзьве пачула: ён сьмяяўся. Сьмех, застаялы ў грудзях, вырываўся балотным бульканьнем, бы я наступіла нагой на слабка зацягнутае цемя багавіньня, у рудую ваду, патрывожыла балотны дух, самога Багніка. Сьмяюся, рабіў і рабіў яшчэ заходы, каб адсьмяяцца, як надыхацца. «Вар'ят» — апаматвалася я канчаткова, шкадуючы, што во нечым жа сарвала ягоныя слабыя зашчапы.



**Марыя Вайцяшонак**

пісьменьніца, піша даткліва псыхалягічную прозу, з вытанчаным і асабістым маўленьнем. Аўтарка кнігі прозы «Сад нявінняасьці» (2002). Апошняя кніга прозы «Кола» выйшла ў каталіцкім выдавецтве «Пра Хрыста» (2004).

Ён не любіў дачнікаў. Яны, дачнікі, лічыў, нічога каштоўнага ня зробяць на зямлі, гэта, маўляў, спрэс атручаныя людзі. Сьцены ў горадзе, мэбля, фарбы, газ выдзяляюць атруту, людзі сьпяць у кватэрах — усё гэта ўзьдзейнічае на соннага чалавека, ім галовы баляць. Прыедуць у вёску, порк-порк і назад, у горад, — яны ўжо ў наркатычнай залежнасьці ад гарадзкога чаду. Іх нізавошта ня вернеш у пустыя бацькоўскія хаты. Во, паглядзі, казаў неяк, што робіць палкоўнік на сваім бацькоўскім «лецішчы», — заўсёды ягоны доказ чалавечай абыякавасьці. Зямля тут, маўляў, укладалася, шукаючы супакой, вякамі, а ён паадразаў ейныя пагоркі-смочкі, абкарнаў ейнае жывое цела, выпрастаў, як сьсечанае дрэва, гэблікам, думаеш, рабіў пляц для гольфу? Не, у яго ў галаве ня зьвіліны, а паралельныя прамыя, як на пляцдарме.

Пачуўшы голас гаспадара, з-за пагорку выйшлі да яго козы, наперадзе казёл Пярун. Казёл не ішоў, яго зямля выносіла на сабе хваляй, як які піратцкі човен: нерухомая галава з расахатымі рагамі маскай, чорныя козы ззаду чорнымі рабінямі, мелка перабіраючы нагамі, цесна адна да адной, бы закальцаваныя цэпам. Мне б хутчэй скончыць гэтае спатканьне (баюся Перуна, ніколі ня ведаеш, калі ў яго ўскіпіць злосьць), а Мар'ян бавіўся ўвачавідкі. Ён напытваў сабе сякую-такую работу. Я паабяцала даведацца ў суседкі Надзі, потым яму наказаць. Няма часу хадзіць па хатах, праўда, але ж трэба нешта здумляць. Надзя звычайна ня любіць наймаць. Яна раўнавала чужога чалавека да сваёй зямлі, да сваёй работы, яна зь ёй у цесным зьвязе, нікога каб трэцяга пасярод. А сіл бракуе. Карова будзе з дня на дзень цяліцца, гной з хлява ня выцягнуты, жаліцца. Можа б, Мар'яна паклікаць? Не, не, яна ў свой хлеў бадзялага чалавека ня пусьціць, крычыць. Быццам гэта ў сям'ю, дзіўлюся. Абцiскае вакол сябе сямейную коўдру, толькі што ня лежачы яшчэ ў ложку, зьнямоханая, старая. Зімой не заробкі — няма заробку нагул. Вясной — Мар'ян падбіраў вывернутую зь дзежак капусту каля склепаў, перакіслую, сьлізкую, мёрзлую бульбу, пустыя, палавыя агуркі. І гэтым быццам мерку ўсім паказваў, чым ён можа абысьціся за сталом, і разьлічваліся ўсім, чым сабе нягожым, што нічога не каштавала, але перападала і харошае. Ніколі ня дзякаваў, лічыў, што ўсё паслана Богам, а людзі толькі выконваюць ягоны загад. Ня брыдзіўся калінікалі зайсьціся і на сьметніцу ў лесе і, як удалы грыбнік, знайсьці там тое, чаго другі і ня ўбачыць. Часьцяком наведваліся да яго вяскоўцы то па жалезны прэнт да плоту, то па юшку да печы — у яго быў цэлы склад знаходак, выдумляў з жалезьзя розныя інсталяцыі.

Памог амаль задарма — дурны, рыбы, рака побач, ня ловіць — дурны. У грыбы ня ходзіць, лес каля ганку — дурны. І агарод ня садзіць. Ён вельмі заняты, тлумачыў усім.

З самай раніцы, выпіўшы гарачай, калі нават і салодкай, вады, падперазаўшыся вяроўчынай, ішоў у лес разам з козамі. Ніколі ня браў на іх палку ў руку ці каб ішоў ззаду з гільканьнем, падганяючы. Ішлі ўсе разам. Здалёк нахіленая ягоная постаць, галава, убраная ў плечы, разьмераная хада, толькі па адзежы і пазнаеш, што ў статку чалавек. Сабакі ззаду. У лесе па грыбах раптам трапіш на іхны сьлед, казьліны дух стаіць клубам, густым роем, як зь зямлі, падымаецца і падымаецца з патрывожанага кочава. Ён чысьціў лес, козы заўсёды пасьвіліся побач. Падразаў атожыльле, каб відаліся камлі, адкідваў крывыя галіны, робячы сылюэт дрэва скульптурным, бы трапным ударам пэндзля. Вымяраў пэрспэктыву на цаўё сякеры, групіраваў купкамі, сямейкамі, каб не знарочыста было, як у рэгулярным парку, а захоўваліся лясныя зрухі самой прыроды. Абыходзіў круга кожнае дрэва, зблізку, здалёк, неба зьмяняла колер, неба гасла, з дня ў дзень — новы малюнак. «Людзі будуць тут гуляць…» — казаў, калі хто пытаўся, што ён тут робіць і навошта.

Але ніхто гуляць не прыходзіў. Тады стаў слаць праз рэчку кладкі, каб можна было трапіць у ягоны міт самым кароткім шляхам. Унутраным зрокам ён бачыў тут дзівосныя прысады, паляны залётніку, ветраніцы, майніку, шышшыны, асеньнюю брызгліну марыў распаўсюдзіць уздоўж рэчышча, брызгліна чырвонай бранзалеткай на вузкай, як запясьце, рацэ. «Я цяжка раблю… мне сілы трэба…» — патрабавальна глядзеў людзям у вочы, маўляў, дзеля сілы трэба добра пад'есьці. Бы яны яго нанялі на гэтую цяжкую работу і павінныя яму дапамагчы ўсім чым.

Вецер у лесе, павярхоўны, бы з мора, хвалямі, закалыхваў, супакойваў, Мар'ян засынаў стоячы, як конь, спаўзаў на зямлю, сабакі ўкладаліся на зімовай звычцы побач. Сон у лесе чуйны, сон не чалавечы, расчыняў пашчы, высалопліваў языкі. Сонца паварочвала да іх галаву, і яны ўсе саграваліся. Іх мог разбудзіць толькі голад. Маладзейшы сабака прачынаўся, цалаваў гаспадара, зьлізваючы на ягоным падбародзьдзі сьлінкі, як сочыва, і ён падхопліваўся. Асалавела азіраўся, ізноў за сякеру, за лапату, каб зьдзейсьніць тое, што сьнілася. Лета — поўдзень году.

І зноў чакаў. Каго?! Праўда, неяк палкоўнік прыводзіў сваіх гарадзкіх гасьцей, каб іх пацешыць, забавіць, што гэты дурань робіць, тыя пыталіся назвы дрэў, кветак, бы прыляцеўшы зь іншай плянэты. Ён ня мог даўмецца, што людзі ў вёсцы ня ходзяць у лес на спацыр, а толькі па патрэбе: грыбы, ягады, лясіна да плот. Былі хвіліны, калі ён кідаў свае прылады, дзе яго спыніў адчай, ішоў да вады, вымываўся, пераапранаўся, намерваючыся зьехаць куды-небудзь, дзе яго зразумеюць. Маўляў, тут людзі прызямлёныя сваімі спадзяваньнямі, думкамі толькі на прыбытак, іншы сьвет ім невядомы. Углядаўся ў люстэрка на самога сябе, украдаючыся, быццам на чужога чалавека з-за пляча. Ад чыстай халоднай вады лягчэй не рабілася. Гэтую зямлю ня змыеш нічым, яна прыкарэла ня толькі да ягонай адзежы — ён ужо пусьціў у яе свае карані.

Ізноў пераапранаўся. Толькі вырваўся з грудзей сьмех, сьмех з усхліпам, дробны, дзіцячы, як ад шчакоткі.

Хто ён такі ёсьць?

Мы жылі амаль побач. А я звычайна зьбіралася да яго наведаціся, як у вялікую дарогу, бы сыходзіла з дому назаўсёды, адракаючыся ад свайго клопату, сыходзіла, зьнясіліўшыся будзённасьцю. Сваёй нікому тут не патрэбнай, напорыстай працай ён, дзіва што, усяляў у душу раўнавагу, пачуцьці нейкай малавядомай сярод людзей згоды зь лесам, з вадой, зь зямлёй — праца без заробку, нават без падзякі, една тое, дурны і дурны. Сякерай, рыдлёўкай зьнішчаў як не ва ўсім сьвеце пераборкі паміж сваім і чужым. І аніводнай на твары змаршчынкі — ён працаваў у ахвоту.

Ручай ляснога ветру струменіў па вуліцы да старых дубоў, дзе жыў Мар'ян, ягоная хата апошняя ў вёсцы, заўсёды неяк зьбянтэжаная ад чужога вока, бы засьпеў яе голай, бяз вопраткі. На панадворку нагу не пераставіць — казінае стойбішча да самага парогу, Пярун будзіў гаспадара рогам у дзьверы. Пастукаеш, Мар'ян выйдзе, ніколі не запрашаючы ў пакоі. Ён зачыніўшыся заўсёды і ўдзень, у ім асьцярожнасьць зьвера. Ён можа сысьці, пакінуць нару, калі які чалавек забрыдзе, выявіць, што ён тут жыве. І цяпер выйшаў не адразу, неяк галавой уперад, сагнуўшыся ў дзьве столкі. Аказалася, Пярун ударыў, і ня першы ж раз.

— Ндобра гэта, каб свая скаціна кідалася на гаспадара, — кажу, — трэба зь ім нешта рабіць.

— Ён ведае, за што зьбіў, і я ведаю, гэта сям'я, — адказвае памяркоўна. – Трэба яму трэнажор змайстраваць, каб сілу сваю дзікую мог скінуць, не магу пакуль здумаць з чаго, як…

Сабакі з хаты кулем праз дзірку ў парозе, кідаючца лашчыцца, чуюць, што прынесла нешта зьесьці. Мар'ян бярэ з рук пакункі, як ахвяру, ня дзякуючы. Я часта паміж імі, Мар'янам і ягоным Богам. Дамовіліся, што падыдзе часам, дапаможа адрамантаваць мне столь у склепе, і яшчэ, кажу, напытала яму заробак: старая бабка прасіла перакапаць лехі.*

Наастатку, пакідаючы гэтае «сьвяцілішча», спрабую давесьці яму, што якраз жа самая пара што-небудзь пасеяць у зямлю, найперш — бульбу.

— Сад, агарод — гэта сэзонная творчасьць, дзеля сябе самога…

Маўляў, трэба працаваць дзеля вечнасьці.

Ах, дайце спокуй! У мяне самой цяпер няма анічога, акрамя кавалка зямлі. Трапіўшы пад скарачэньне (усё жыцьцё будавала масты), я, інжынэрка з чырвоным дыплёмам, доўга шукала працу. У каторы раз па абʼяве прыходзіла на перамову, мяне, сталую жанчыну, як не расьпілоўвалі напалову, лічачы колцы ўзросту, бы на дрэве, абыякава праводзілі, абшукваючы вачыма, па сухіх сьцёгнах, і адмаўлялі. Дарэмна старалася, каб не заўважылі, што кульгаю (пасьля аўтамабільнай аварыі), замест кія хадзіла з парасонам. Мне раілі заняцца бізнэсам, адчыніць шапік на стадыёне, але мне замінаў мой чырвоны дыплём. Там трэба было хітраваць, спадманваць, таргаваць чужым, я ж, савецкая выдатніца, умела прадаць толькі сваю працу, тое, што зроблена сваімі рукамі… У мяне цяпер анічога, акрамя сотак, жыцьцё толькі дзеля сябе самой, ня болей. Кожную вясну раблю перасадкі, кампаную расьліны, кветкі, кампаную колеры, пільнуючыся бесьперапыннага квітненьня да позьняй восені. Зямля мяне выратавала ад роспачы, ад вар'яцтва. Я быццам ужо згадзілася са сваім лёсам выгнанай дачкі, атрымлівала іншы раз нават асалоду ў сваім зацішку.

Але вось гэты чалавек побач. Ён не запасіўся на зіму, не шукаў сабе выгодаў, хлеба няма, кажа, часьцей хлеба, ці запалак, ці газы. Каля яго ахінаў той спакой, якога часта не ставала ў маім садзе-агародзе. Бы пасьля сьпёкі паўднёвай, здарожыўшыся, ступіш у цень перавесьці дух, здыхацца каб.

Быццам ішла дагэтуль па пустэльні.

Або ў навальніцу, у непагадзь скочыш на ганак, сядзеш — нічога нарэшце цябе не турбуе, ня рупіць, і раптам адчуваньне: я так даўно не была дома, проста так, бяз працы ў руках, не пасядзела зь ім, з Домам. Мне рэдка ўдаецца пажыць у ахвоту, бяз дай прычыны.

Дом — месца маёй душы.

Ужо я разьвіталася, ён раптам папрасіў пастаяць, пайшоў у хату, выносячы адтуль

* грады (дыял.)

карціну. Паварочвае палатно тварам… макі… шмат макаў. У мяне круціцца галава, гледзячы на іх — макі не стаяць нерухома нават у вазе. Створкі бутонаў лопаюцца, вызваляючы скрутак, скамечаны, тонкі, як з папіруснай паперы, ён разгладжваецца на вачах. Вецер вуснамі дакранаецца, абрывае пялёсткі, а там, на заднім пляне, макі ў зацішку, дыхаюць, кратаючыся, полымем сьвечак, ласосевая афарбоўка, васкавы налёт на лісьцях. Мак-самасейка, можа, недзе на маўрытанскіх газонах, можа высока на альпійскім лузе. Горача, паветра мроівам, паветра пчаліным роем. Гром бокам, полем, па прасёлачнай дарозе, гром вечаровы, крохкі, бы проста цукар крышаць шчыпцамі да гарбаты. Колькі ж часу я тут стаяла, адыходзілася, ізноў вярталася?!

— Хто мастак? — пытаюся.

— Ня ведаю… ня памятаю… — адказвае і ідзе з карцінай у хату.

Я ніколі не пыталася ў яго пра мінулае, мы бы дамовіўшыся не пытацца ні пра маё, ні пра ягонае. Мы тут абое ў чужой вёсцы, як замужам па другім разе таксама за разьвядзёнкам. І сама вёска ні ў кога з нас не цікавіцца: хто мы? адкуль? зь якой прычыны тут маемся?

Зрэдку да яго прыяжджала жанчына. Выходзіла з машыны, ішла лёгкім юнацкім крокам, чорныя пакручастыя валасы раз-пораз адкідвала рукой з ілба, бы ўвесь час ішла па ветры. Было нешта іншаземнае ў ейнай амаль дзікай прыгажосьці. Такой жанчыне сустрэчны мужчына мог усклікнуць: «О, Італія! Неба над табою!» Другі — абазваць жыдоўкай. Твар не асьвечаны ні позіркам, ні ўсьмешкай, вытанчаны скульптурна, бы з даўно згубленых запасьнікаў нашай памяці, нерухомы, на ім толькі блікі, цені лістоты дрэў, а можа, цені аблок? Выходзіла з машыны як са «скорай дапамогі», абцяжараная таямнічым абавязкам, сьпяшаючыся, ні на кога ня гледзячы, і гэтак жа хутка вярталася, адʼяжджала.

Пасьля ейнага візыту яму прыкметна горшала. Якраз я неяк была трапіўшы на такі момант. Марʼян сьмяяўся, ходзячы па панадворку, спыніўся, стаў дапытвацца: «Ты бачыла ейныя завушніцы-скарабэі?! Бачыла?!» Якія завушніцы? У каго? Гаварыў блытана, дробнымі словамі, я нічога не разумела. Сьпяшаўся выгаварыцца, як выпаліць нейкае балючае месца ўнутры. Зьбівалася пена на вуснах: «Ты бачыла? бачыла? Яна адʼехала?» — крадучыся пазіраў на вуліцу. Хто? Тая чорная жанчына?

Вядома, адʼехала, бо я сама нарэшце вярнулася да змыслаў — рэдка якая жанчына не адчувала сябе, сваё цела побач зь ёй проста балванкай, нарыхтоўкай без апрацоўкі, ня болей. Але ж аніякіх на ёй завушніц не было?! Якая паміж сувязь? Ён блюзьніў, любоўна дакранаючыся да дрэва ля ганку, гладзіў вушак, кідаўся да Перуна, нешта яму нашэптваў і раз-пораз пазіраў на дарогу ўсьлед чорнай жанчыны. Яны што, каханкі зь ёй? Палохаюся згадкі. Дзівуся згадкі.

Аднойчы ён неяк прыйшоў без маёй на тое просьбы, быццам ён сёньня свабодны, можа калі што якое дапамагчы, гаварыў, пастукаўшы ў вакно. Я якраз бегла да студні, сьпяшалася, выцягнула вядро, падняла вочы… На ім расшпіленая кашуля да самага пупа, распрацаванае, пругкае цела, ключыцы, рэбры блішчэлі, як у дасьпехах, сівы дым пошасьці курыўся кучарамі на грудзях, цьвілі вусны. Стаіць нязвыкла блізка. Дух Перуна даўкі, нясьцерпна — фэрамоны зьвера, які пачуў твой жывёльны дух полу ў час любоўных ловаў. Страх, агіда… падымаю зь вечка студні поўнае вядро, узьліваю на яго, быццам незнарок, ускрыкваю, выбачаюся. Ён не зварухнуўся, а круп сухі! Кентаўр няшчасны, злуюся пра сябе, ізноў маланкава кідаю вядро ў студню, цэп грыміць, бы гатова тут бараніцца вадой, зямлёй у вочы, ускідваючы капытамі. Сёньня мне, кажу, на дзіва абыякава, нічога ня трэба і бягу ў хату, маўляў, печ паліцца, зачыняюся, доўга пасьля таго не наведваючыся да таго кентаўра, хоць была пільніца. Зачыняюся і нарэшце даю сабе



РЭНЭ МАГРЫТ «ПЕСЬНЯ КАХАНЬНЯ»

волю. Выгаворвала ўслых на ўсю хату ўсім мужыкам, свайму былому мужу, ад якога незьлічона мусіла вяртацца з таго замужжа і нарэшце вярнулася. Цяпер стаю, як на скрыжаваньні, нікім не захінёная, не абароненая. І наастатку во гэты… кентаўр! І прыкрае, бабскае: няўжо я яшчэ жанчына пасьля ўсяго, калі ён так?!

Не, яна, іншаплянэтная істота і Марʼян?! Не, гэта немагчыма! «Ты бачыла на ёй завушніцы-скарабэі, бачыла?!» — несьцішона паўтараў і паўтараў. Мне было ні то сысьці, ні то застацца зь ім. Раптам абсеў, паглядзеў на мяне пільна, бы нарэшце пазнаючы: «Гэта была… Няфрэт…» Няфрэт… Няфрэт… так звалі Нефярціці... Што ён гаворыць? Я ўжо зьведала ягоныя астранамічныя асацыяцыі, калі ён, прыйшоўшы — а я прала бялізну — сказаў, каб не разьвешвала сушыць на панадворку, бо, маўляў, сёньня прачнулася Этна, пыл, попел у паветры. Час, адлегласьць спрэс не далей плоту, а то й парогу. Але, як аказалася, Няфрэт не фантазія. Марʼян гаварыў на дзіва чыста, упершыню. Няфрэт — так звалі чорную жанчыну мастакі, ягоныя сябры. Гэта вельмі дарагая жанчына, казаў, яна любіць раскошу, паездкі за мяжу, падарункі. А ён не зарабляў, працаваў шмат, але пэйзажы не куплялі, маўляў, такі цяпер глямурны час, мастацтва на ўзроўні рамяства. Яны кахаліся. На дзень ейнага нараджэньня ён сказаў: «Прабач, я нічога табе ня здолею падараваць, акрамя… «Макаў», толькі што закончыў маляваць…» Яна засьмяялася ў вочы і ў той жа вечар яе бачылі зь бізнэсмэнам. Хутка выйшла замуж. А ён сам кінуў майстэрню, горад, зьехаў сюды, у вёску. Так, яна зрэдку наяжджае да яго, іншы раз жаліцца: багаты муж шмат грошай пакідае ў казіно і сама сябе разводзіць, маўляў, ягоныя сябры езьдзяць на паляваньне ў Афрыку, таксама дарагая забава, дык хай сабе, затое муж удома…

На гэты момант ён успомніў усё. Потым твар зьнерухомеў, ніводнай грымасы, бы заліты воскам — ён вяртаўся да сябе сёньняшняга.

Аказалася, лес — гэта цяпер ягоная зялёная студыя?! Жалюзі з дажджу разьвешвалі пераборкі паміж заламі. З раніцы да вечара зьмяняліся адценьні дрэва, каменя, прырода, як старыя майстры, не разбаўляла фарбы, накладала адну на другую. І кожны дзень як новае палатно. Малевіч першым адмовіўся ад рам для карцін, Марʼян, пэўна, тут быў другі за ім. Для мастака важная менавіта заваёва прасторы, і ён яе нарэшце меў. Хай сабе пакуль што разьмясьціўся ня тое, каб у неартавым месцы, сюды заходзілі дзікі, ласі, вецер. Самае страшнае быць невядомым, непатрэбным, але… але ён спадзяваўся. Сьвятло ў ягонай майстэрні і наагул залежыць ад тэмпэратуры, ад пары дня, пары году. Сьвятло залежыць ад самога мастака. У пяць гадзін раніцы — ты адзін чалавек, спазьніўся, у восем устанеш — ужо зусім іншы, казаў неяк. Другім разам наракаеш на надворʼе восеньскае, маўляў, хмарна, маркотна. А мне, кажа, адна птушка калі праляціць — і неба ўжо здаецца абжытым.

Я ўсё часьцей атрымлівала задавальненьне, як і ўсе ў вёсцы, ад таго, што ўзышло, што вырасла. І калі ўдалося выбраць бульбу да дажджоў, а Марʼян перакапаў агарод, паспытала невядомую дагэтуль уцеху і зразумела: гэтым можна жыць, гэтага дастаткова, каб болей, то і сэрца ня вытрывае. Нешта з гароду добра збывалася багатым дачнікам, тыя анічога не вырошчвалі, такія-сякія і здабыткі быццам. Недалёка жыў чалавек, які марыў пра вечнасьць як пра ўласны дом. А можа, сапраўды, дом творчага чалавека зусім не на зямлі?..

І адзін год, і другі, і трэці. Толькі аднойчы, прыехаўшы вясной на лецішча, пачула навіну: Марʼяну пагоршала.

Яму як ветрам нарвала, казалі, тры дні запар якраз тады быў вялікі вецер. «Што ты мне прынесла? — крычаў ён на старую суседку. — Я так цяжка раблю, а ты мяне шалупіньнем корміш!» Ён крычаў на свайго Бога за тое, што не дадаў яму, крычаў на старую бабу — пасрэдніцу паміж імі, за адным разам. Казалі, цяпер ён абы крок ступіў, дапамог каму што якое, патрабуе разьлічыцца па вышэйшым разрадзе, як той казаў. І наагул, рэдка дапамагае — цяпер ён малюе… малюе голых жанчын, казалі бабы, дасьціпна прыплюснуўшы вочы. Усю зімку маляваў, з хаты не выходзіў на сьвет. Яму пагоршала, маўляў, пагоршала, чым было.

Утрапеўшы стаю, слухаю і разумею: ён проста цяпер стаў падобны да нас, ён паздаравеў. Чорная жанчына напытала яму купцоў. А як жа, прыяжджалі на інамарках, куплялі, не таргуючыся. Складаў грошы, маўляў, будзе будавацца, сабе дом і галерэю.

Я згубіла нават свой посах.

Мы рэдка сустракаліся, я болей не заходзілася да яго наведацца. Але ягоная прысутнасьць адчувалася нават сярод белага дня і цёмнай ночы. Быццам у садку анікога, раптам адлучылася цень ад дрэва, ідзе па сьцежцы, намацала нешта на зямлі, нахілілася, спыніўшыся — ён меў моду зайсьціся, падняць яблык. Ён зачыняўся ў шуфлядзе буфэта, і я аніяк не магла адчыніць, тузалася зь ім. Ноччу мышы маскаталі[*], гойсалі па стале з дробным, здушаным сьмехам — рыхтык ягоным строем. Ён усхліпваў агеньчыкам у ліхтары і гас. Ён гойдаўся на гірах гадзіньніка ў вітальні, яны бразгалі аб падлогу і падымаліся ізноў — стрэлкі рухаліся ў адваротны бок. Губляла і губляла некалькі разоў на дзень пярсьцёнак з рукі і кожны раз знаходзіла, бы іх у мяне было незьлічона, як у егіпецкай царыцы — ізноў ён на памяці. І нават калі бачыла Марʼяна здалёк, за ім ззаду ішло цэлае зборышча начных істот…

Хадзіла ўборкі[**] восень зь зімою, зіма зь вясною. Сады не зацьвілі. Толькі аднойчы глянула ў вакно, а там: пасмамі зачапіўся за гальлё яблынь дым. Тая дымачка, як напачатку цьвіценьня, калі толькі пупышкі пачалі лопацца. Ён зрэдку яшчэ чысьціў лес, паліў вялікае вогнішча.

Яшчэ іншы раз за ім прывідам ішло хлапчаня. Стаптаныя чаравікі, босы палец тырчэў парасткам. Ён трымаў абедзьвюма рукамі захіненую крысом каптаніка клетку з птушкай, можа, апошняй на сьвеце. Чым далей іхныя постаці то зьліваліся, то ішлі побач, ня ведаючы межаў паміж зямлёй і небам, не адчуваючы межаў часу.

Толькі вымавіцца ўсьлед ім адно трапяткое слова — дзіця…

Удасца добра прадаць лішкі бульбы, тоесёе з агароду, я выкуплю ў яго «Макі», вядома, калі да гэтага часу не падаражэе хлеб з малаком...

[*] дробна пастуквалі, шыбуршэлі (дыял.)
[**] дужалася, барукалася (дыял.)

# Ваўчыны бацька



Фатограф «НН» Андрэй Лянкевіч пабываў у гасьцях у правадыра ваўчынае зграі.

Зьміцер Шамановіч скончыў біяфак Віцебскага пэдунівэрсытэту і асьпірантуру пры Акадэміі Навук. Ён арнітоляг па спэцыяльнасьці. Вольна гаворыць па-ангельску. Адразу пасьля асьпірантуры, з маладой жонкай, зьехаў працаваць у заказьнік «Красны бор».

Той заказьнік месьціцца на поўначы Беларусі, на Расоншчыне і Верхнядзьвіншчыне, пры глухой мяжы з Расеяй. Недзе там за антычнымі часамі жылі неўры, якія, паводле Герадота, двойчы на год ператвараліся ў ваўкоў. Нешта такое прыгадваецца, як дазнаесься пра захапленьне Зьмітра.

Калі паляўнічыя забіваюць дарослых зьвяроў, Шамановіч забірае «на выхаваньне» тыднёвых ваўчанят. Старэйшых прыручыць ужо малаімаверна. Зрэшты, тое, што робіць Зьміцер, гэта нават не прыручэньне. Ён не прымушае ваўкоў жыць паводле чалавечых законаў. Наадварот: фактычна, прымае шчанюкоў у сваю зграю. Як тлумачыць Шамановіч, яго стасункі з ваўкамі — гэта стасункі важака і падначаленых. І, каб драпежнікі падпарадкоўваліся, ён штовесну мусіць «адстойваць» гэтую пасаду, дэманструючы сваю сілу канкурэнтам зь ліку падрослых «шэранькіх ваўчкоў».

Жонка Зьмітра, Ірына, таксама арнітоляг, таму разумее і падзяляе яго апантанасьць жывёльным сьветам. І ні яе, ні іх малую дачку Яніну ня дзівіць наяўнасьць ваўкоў на падворку — у спэцыяльным вальеры. Да людзей навокал ваўкі ставяцца зь цікавасьцю і асьцярогай, бачачы падабенства да Сяргея.










# Гатэль «У загіблага вершатворцы»

## Няхай жа будзе і…



30 чэрвеня, акурат паміж чарговай гадавінай гібелі галоўнага паэта беларусаў і чарговым сьвяткаваньнем Дня вызваленьня, у галоўным тэатры Беларусі ставілі, зразумела, спэктакль, прысьвечаны ягонай (галоўнага паэта) памяці. Піша **Аляксандар Фядута**.

Калі дапусьціць, што сярод гледачоў Купалаўскага ёсьць людзі, якія ня ведаюць, хто такі Янка Купала, дык ужо з самага пачатку спэктаклю «Сны аб Беларусі» яны даведаюцца пра дзьве рэчы: Купала — гэта беларускі паэт, які загінуў у нейкім маскоўскім гатэлі. Акалічнасьці гібелі невядомыя: зачытваецца ўслых НКВДысцкае (імаверна, праўдзівае) заключэньне пра падзеньне Івана Дамінікавіча Луцке... — даруйце, Луцэвіча, — з амаль фізіялягічнымі падрабязнасьцямі. Падаў у лесьвічны пралёт зь дзявятага паверху, ад чаго «кроплі крыві яго гарачай», гаворачы словамі іншага загіблага пры загадкавых акалічнасьцях савецкага клясыка, праліліся ўжо на сёмым паверсе.

У найлепшых традыцыях «фізіялягічнага нарысу» (быў такі жанр у літаратуры) узнаўляецца і побыт эпохі. Сцэна дэкараваная калёнамі а ля сталінскі ампір, жырандолямі-коламі, падсьвечаная чырвоным сьвятлом, закліканым, імаверна, сымбалізаваць салжаніцынскае «чырвонае кола», што пракацілася па жыцьцях мільёнаў і мільёнаў савецкіх (і антысавецкіх) грамадзянаў. Па сцэне ходзяць людзі ў форме і цывільным, пакаёўкі і цень паэта, які аніяк ня можа супакоіцца і ўжо пасьля гібелі чытае вершы і дае паказаньні пра сваё жыцьцё.

Прыблізна такім жа чынам паказанае і мінулае паэта. Толькі жанр ужо іншы — не «фізіялягічны нарыс», а паэма ў найлепшых традыцыях этна-сымбалізму, уласьцівага росквіту творчасьці Купалы. І вось тут якраз Уладзімер Савіцкі, пастаноўшчык і аўтар сцэнічнае кампазыцыі ў адной асобе, трапляе ў ім жа самім пастаўленую пастку.

Рэч у тым, што адна этна-сымбалічная паэма ў рэпэртуары купалаўцаў ужо ёсьць. Гэта «Сымон-музыка», пастаўлены ў свой час Міколам Пінігіным. І ўжо таму «Сны аб Беларусі» глядзяцца як своеасаблівы «дубль» пінігінскага спэктаклю. Падабенства ўзмацняецца, калі ўлічыць, што з уласна «паэмных» тэкстаў у абедзьвюх пастаноўках выкарыстоўваюцца абсалютна аналягічныя сцэны — фальклёрнае сьвята, п'янка ў карчме, крах сямейнага дабрабыту. Замест песьні жабракоў, праўда, — песьня музыкаў-блазнаў.

Глядзіш — і разумееш, што ўсё гэта ты ўжо бачыў, на той самай сцэне, толькі ў трохі больш удалай пастаноўцы.

Рэч тут не ў ігры актораў. Акторы добрыя, і чаго-чаго — а чытаць вершы Купалы купалаўцы ўмеюць вельмі нават добра. Міхаіл Зуй і Ганна Хітрык, якія граюць маладога паэта і ягоную каханую (такое адчуваньне, што, зьвёўшы гэтую рамантычную пару ў ролях пары камічнай у «Пінскай шляхце» Пінігін акурат і змусіў іх спарадыяваць іх жа ўласных пэрсанажаў з пастаноўкі Савіцкага), бліскучы Аляксандар Падабед, загрыміраваны пад менскі помнік Купалу, так, што нельга адрозьніць; нават абсалютна не прапісаныя аўтарам інсцэніроўкі (ці аўтарам п'есы?). Паэтава Маці (Зоя Белахвосьцік) і паэтаў Бацька (Мікалай Кірычэнка), якія сымбалізуюць Матчыну любоў і Бацькоўскі гонар; нават Людзі ў форме і ў цывільным, якія зьяўляюцца на імгненьне, Русалкі і Марысіны Бацькі — усе яны запамінаюцца, у кожнага свая інтанацыя. Зразумела, што адзін і той самы прыём немагчыма выкарыстаць два разы, як немагчыма двойчы ўвайсьці ў адну і тую самую раку. Купалаўскі тэатар паспрабаваў гэта зрабіць — і прайграў у двубоі з самім сабой.

Тым больш што спроба ўдала спалучыць біяграфію грамадзяніна СССР І.Д.Луцэвіча, які існаваў на праўдзе, і біяграфію чалавека, пад помнік якому так дбайна загрыміраваны Аляксандар Падабед, якому і граць амаль няма чаго — толькі вершы застаецца чытаць, — таксама няўдача — на наш погляд. З «Сымонам-музыкам» было ўсё прасьцей: у адпаведнасьці з жанрам гісторыя станаўленьня творцы расказвалася выключна сымбалісцкімі сродкамі. Але як толькі сымбалізм заканчваецца, як у нашым выпадку, застаецца не рэалізм нават, а ў поўнай меры сацыялістычны рэалізм. Таму што быў такі жанр у савецкім тэатральным мастацтве — «дацкі спэктакль». То бок не спэктакль, вядома ж, на дацкай мове ці паводле п'есы дацкага аўтара, а спэктакль, прымеркаваны да чарговага юбілею. І быў на схіле савецкай эпохі ў Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры нават адзін зь нямногіх удалых «дацкіх спэктакляў» — паводле п'есы Міхаіла Шатрова «Так пераможам!» — пра запавет У.І.Ульянава. Там хворы Ленін ачуньваў, прыязджаў у працоўны кабінэт, дзе і зьяўляліся яму цені паплечнікаў, каб можна было зь імі наноў спрачацца, разважаць і да т.п. Хто ведаў гісторыю КПСС, той Бухарына ад Сьвярдлова адрозьніць мог. Хто ня ведаў — даваў веры акторам і рэжысёру. Але, на шчасьце, Ленін не пісаў (будзем спадзявацца) вершаў, а то падабенства двух спэктакляў пра ажыўшыя помнікі было б і ўвогуле забойчым.

Проста таму, што паказаная ў тым ужо напаўзабытым спэктаклі МХАТ трагедыя Леніна, якая сталася трагедыяй для агромністай краіны (і нават больш як адной краіны), з таго спэктаклю ўсё-ткі прарысоўвалася хоць неяк. А зразумець з інсцэніроўкі Ўладзімера Савіцкага, чаму, уласна кажучы, сігануў Купала ў той лесьвічны пралёт у гатэлі «Масква», проста немагчыма. Таму што Купалы на сцэне «купалаўскага» ўвечары 30 чэрвеня — не было!

Ёсьць грым Купалы (дакладней, помніка Купалу). Ёсьць вершы Купалы. Ёсьць нагода для таго, каб паставіць «дацкі спэктакль», прысьвечаны Купалу (а з такім самым посьпехам — ці няпосьпехам? — гэта мог бы быць спэктакль, прысьвечаны Пушкіну, Шэкспіру, Дантэ, Эклезіясту, цару Саламону і ўсякаму іншаму паэту, які калісь жыў на нашым глёбусе…) А вось трагедыі Купалы — няма.

Ну ня скокнуў жа паэт зь дзявятага паверху толькі таму, што ён піў?! Гэта занадта простае тлумачэньне (адзінае зразумелае, дарэчы, тлумачэньне, калі меркаваць з таго, якія сьведчаньні дае на сцэне Аляксандар Падабед Аляксандру Паўлаву: ён, маўляў, і ў запой сыходзіць, і на склероз пакутуе — нават слаўны «Саюз Пісьменьнікаў Беларусі» ні запою, ні склерозу чамусьці рады не дае). Але другая вэрсія, прынятая сярод часткі нашай інтэлігентнай публікі, не прарысоўваецца зусім: для Людзей у форме і цывільным гэтае самагубства ажыўшага помніка аказваецца зусім нечаканым. А раз уся цэнтральная частка купалаўскай біяграфіі — і зь першай, няўдалай, спробай самагубства, і зь «ляўкоўскім цыклем», і з вайной, якая ўзрушыла паэта, — застаецца, як той казаў, за кадрам (толькі адзін намёк — куплет зь ліста «Вялікаму Сталіну ад беларускага народа»), то…

…то як скажаце гэта разумець?

Ды так і разумейце, таварыш глядач! Напіўся да шаленства і скокнуў у лесьвічны пралёт! Трэба было не руйнаваць маскоўскі гатэль «Масква», а проста перайменаваць яго ў нешта накшталт «Гатэль «У загіблага вершатворцы» — пазычыўшы назву ў старой і цалкам савецкай фантастычнай аповесьці братоў Стругацкіх.

Ня думаю, што дзеля гэтага быў пастаўлены спэктакль на сцэне Купалаўскага. Вой, ня думаю…

Скажам, калі б на сцэну на паклон столькі часу пасьля прэм'еры «Дзікага паляваньня караля Стаха» дагэтуль разам з выканаўцамі выходзіў бы пастаноўшчык спэктаклю, гэта было б справядліва: у тым спэктаклі паводле Караткевіча кожны выкарыстаны рэжысёрам прыём апраўданы, прадуманы, вывераны. Грае ўсё. Калі на сцэну на паклон пасьля «Сноў аб Беларусі» выходзяць толькі акторы, гэта ня менш справядліва: паўтаруся, што вершы чытаць яны ўмеюць — прычым вельмі добра. Але тады і выпускайце CD з чытаньнем вершаў і пяяньнем песьняў!

А 30 чэрвеня мне ўпершыню было шкада патрачанага часу.

**Аляксандар Фядута, глядач**




# Балівар

Піша Вацлаў Шаблінскі.

Канфлікт паміж Калюмбіяй з аднаго боку ды Вэнэсуэлай і Эквадорам з другога яшчэ раз пака заў хісткасьць балівaрыянскай ідэі, на якую любяць спасылацца лацінаамэрыканскія левыя — Фідэль Кастра, Уга Чавес, Эва Маралес. Што такое баліварыянская ідэя? І хто такі Сымон Балівар?

Падчас аднаго са сваіх падарожжаў Хрыстафор Калюмб адкрыў зямлю, дзе індзейцы жылі проста на вадзе, у хатках на сваях. Вялікаму генуэзцу гэта нагадала звычаі гораду сьвятога Марка, таму ён назваў краіну «маленькай Вэнэцыяй» — Вэнэсуэлай.

## Вялікая ідэя

Гішпанскі кароль вырашыў засяліць новую калёнію сваімі самымі беднымі і гордымі падданымі — баскамі. Аднаго з такіх пасяленцаў звалі Сымон Балівар. Ягонаму цёзку і нашчадку наканавана было стаць вызваліцелем Лацінскай Амэрыкі.

Сымон Хасэ Антоніё дэ ля Сантысіма Трынідад дэ Балівар і Палясіяс Блянка нарадзіўся 25 ліпеня 1783 г. у Каракасе. Сям'я Балівараў была адной з самых багатых у Вэнэсуэле. У маладога Сымона было ўсё для бесклапотнага цікавага жыцьця. Ён падарожнічае ў Эўропу, сустракаецца са знакамітымі людзьмі. У Мадрыдзе крэола нават бяруць у сьвіту гішпанскага інфанта.

Аднак Балівара больш за ўсё хваляваў лёс бацькаўшчыны. Ён марыў паўтарыць тое, што зрабілі ў сябе паўночныя амэрыканцы. Неўзабаве нагода зьявілася. У 1810 г. Напалеон акупаваў Гішпанію, і дэ факта калёніі засталіся бяз мэтраполіі. У Каракас вяртаецца легендарны ўдзельнік вайны за незалежнасьць Злучаных Штатаў і Вялікай Францускай рэвалюцыі генэрал Францыска дэ Міранда. Шмат гадоў гэты чалавек езьдзіў па Эўропе, сустракаючыся з прадстаўнікамі эўрапейскай эліты, у тым ліку з шляхтай Рэчы Паспалітай (Пацамі, Сапегамі, Станіславам Аўгустам Панятоўскім), каб зацікавіць іх ідэяй паўднёваамэрыканскай незалежнасьці.

## Злучаныя Штаты Паўднёвай Амэрыкі

З ініцыятывы Міранды Вэнэсуэла абвяшчаецца незалежнай рэспублікай. Балівар робіцца адным з самых палкіх прыхільнікаў генэралісімуса, такое званьне Міранда атрымаў ад паплечнікаў. Аднак гішпанцы хутка пераходзяць у наступ. Мэтысы, індзейцы, нэгры не любілі крэолаў, якія стаялі на чале незалежніцкага руху, і не аказалі супраціву новым канкістадорам. У выніку Міранда трапіў у палон. Балівар быў вымушаны зьбегчы ў суседнюю з Вэнэсуэлай Новую Гранаду, дзе ўладу яшчэ ўтрымлівалі патрыёты-незалежнікі. Новагранадзкі ўрад пасылае вэнэсуэльца з атрадам у выведку, але ён вырашае рухацца далей і ў чэрвені 1813 г. абвяшчае Другую Вэнэсуэльскую рэспубліку. Яму быў дадзены тытул вызваліцеля — Лібэртадора (El Libertador). Аднак і Другая рэспубліка праіснавала нядоўга. Балівар зноў на эміграцыі. Ён абдумвае прычыны паразы. У новых маніфэстах вызваліцель абяцае свабоду рабам, зямлю — сялянам. Гэта дае свой плён. Рух за незалежнасьць робіцца нарэшце агульнанародным. Былыя нявольнікі ідуць у адным шэрагу са сваімі панамі.

Імя Балівара робіцца сымбалем свабоды для многіх. Каб узяць удзел у барацьбе з Гішпаніяй, на паўднёваамэрыканскі кантынэнт прыяжджаюць сын маршала Мюрата, а таксама пляменьнік Напалеона і пляменьнік Касьцюшкі. Касьцюшка-малодшы быў сярод удзельнікаў бітвы пры Аякуча 1824 г., якая паклала канец гішпанскаму панаваньню на мацерыку.

Паўставала пытаньне, што рабіць далей. Балівар лічыў, што вызваленыя краіны павінны скласьці Злучаныя Штаты Паўднёвай Амэрыкі — Вялікую Калюмбію. Такое ўтварэньне, якое ўключала ў сябе Новую Гранаду, Вэнэсуэлу, Эквадор, Панаму, было абвешчана ў 1828 г., а Балівар стаў яго дыктатарам. Аднак вызваліцель відавочна не падыходзіў да такой ролі. Ён лічыў ніжэй за свой гонар перасьледаваць апанэнтаў. У выніку ад Калюмбіі адлучыліся Вэнэсуэла і Эквадор.

## «Як мора араць»

Неўзабаве Балівару давялося бегчы са сталіцы вялікай Калюмбіі Багаты. Памёраў вызваліцель у выгнаньні. Вынікі свайго жыцьця ён падсумаваў у наступным сумным выслоўі: «Служыць незалежнасьці — як мора араць. Гэтыя краіны, безумоўна, трапяць у рукі бязглуздага натоўпу, каб затым перайсьці пад уладу дробных тыранаў усіх колераў і расаў». Гэтае прароцтва спраўдзілася.

Вэнэсуэла стала здабычай шэрагу дыктатараў, найбольшую вядомасьць зь якіх атрымаў Хуан Вісэнтэ Гомэс. Менавіта Гомэс стаў правобразам для галоўнага героя «Восені патрыярха» Маркеса.

Калюмбія — гэтую назву захавала Новая Гранада — ператварылася ў арэну для шматлікіх грамадзянскіх войн, якія цягнуцца і да сёньня.

Цяпер імя Балівара карыстаецца павагай на ўсім кантынэнце. Аднак спробы прэзыдэнта Чавэса адрадзіць баліварыянізм успрымаюцца суседзямі — Калюмбіяй і Пэру — з асьцярогай. Яны бачаць у гэтым імкненьне Каракаса да панаваньня ў рэгіёне.

## Вачыма агента савецкай выведкі

Пра Балівара пісалі розныя слынныя пісьменьнікі. Сярод іх Габрыэль Гарсія Маркес, Іван Франко, Эміль Людвіг. Трапіў у гэты лік і Карл Маркс. Ня маючы працы, аўтар «Капіталу» згадзіўся напісаць для амэрыканскай энцыкляпэдыі том на літару «б». Вызваліцелю там была дадзеная адмоўная характарыстыка. Таму ў савецкіх даведніках Лібэртадор характарызаваўся як абаронца інтарэсаў буржуазіі і паноў. Парушыць гэту схему адважыўся Ёсіф Грыгулевіч, нараджэнец Віленшчыны, лёс якога аказаўся цесна зьвязаны з Паўднёвай Амэрыкай. Гэты ўдзельнік заходнебеларускага вызваленчага руху, сябар Таварыства Беларускай Школы, прыяцель Максіма Танка накіраваўся змагацца з фашызмам у Гішпанію, а ў далейшым лёс гарачага віленчука аказаўся зьвязаны з Паўднёвай Амэрыкай — ён працаваў там агентам савецкай выведкі.

Ібэраамэрыканскі досьвед віленскага камунара стаў матэрыялам для дваццаці кніжак. Сярод іх біяграфіі Балівара і Францыска Міранды, якія выйшлі ў сэрыі «ЖЗЛ» пад псэўданімам «Лаўрэцкі». Працы Грыгулевіча-Лаўрэцкага не засталіся незаўважанымі ў бацькаўшчыне яго героя. Наш зямляк атрымаў ордэн Міранды, быў прыняты ў асацыяцыю калюмбійскіх пісьменьнікаў. Творы Грыгулевіча паслужылі матэрыялам і для гэтага нарысу.

**Дзяржава Балівара ў момант свайго найбольшага пашырэньня**








№5'2008. Спэцыяльны нумар, прысьвечаны Беларусі пад нямецкай акупацыяй:
Пэр Андэрс Радлінг, Андрэй Пачобут, Увэ Гартэншлегер, Леанід Рэйн, Леанід Сьмілавіцкі… 512 старонак

# Новы нумар часопісу ARCHE

Падпісацца на ARCHE можна ў любым паштовым аддзяленьні. Падпісны індэкс 00345




**Славянскі канкан на «Славянскім базары».**

### У Гомелі цырульніца пакінула кліентку без валасоў

16-гадовая дзяўчына зьвярнулася ў цырульню за паслугай меліраваньня валасоў. У выніку яна атрымала хімічныя апёкі трэцяй ступені , пасьля моцнай алергічнай рэакцыі, засталася без валасоў. Высьветлілася, што дзяўчына рабіла меліраванне ўпершыню. Распачатая крымінальная справа.

### У Дняпры патануў дырэктар «Гомельтранснафты»

Аляксей Касьцючэнка патануў у часе рыбалкі 12 ліпеня. Трагічны выпадак здарыўся ў вёсцы Верхнія Жары Брагінскага раёну. А.Касьцючэнка лавіў рыбу на маторцы на сярэдзіне Дняпра. Паводле папярэдняй версіі, у выніку рэзкага манэўру ён выпаў з лодкі, спрабаваў даплысьць да берагу, але патануў. Цела знайшлі ўвечары наступнага дня.

### У Нямеччыне разьбіўся аўтобус зь беларусамі-перагоншчыкамі

Здарэньне адбылося ў панядзелак на аўтастрадзе Бэрлін — Гановэр. Мікрааўтобус «Фальксваген-Каравела», у якім знаходзіліся беларусы, урэзаўся ў грузавік, які стаяў. Паводле адной з вэрсій, вадзіцель мікрааўтобуса заснуў за рулём. Загінулі пяць грамадзян Беларусі. Яшчэ трое беларусаў з цяжкімі траўмамі дастаўлены ў бальніцу. Яны ехалі ў Нямеччыну купляць аўтамабілі.

### Алімпійцаў стымулююць пажыцьцёвай скваркай

На ўшанаваньні нацыянальнай жаночай баскетбольнай зборнай краіны генэральны дырэктар ЗАТ «Белатміт» Барыс Цыпорын заявіў, што ў выпадку выйгрышу камандай мэдалёў любой вартасьці на Алімпіядзе-2008 кожны гулец будзе пажыцьцёва забясьпечаны мяснымі і каўбаснымі вырабамі.

Ён таксама паабяцаў, што «мясная пэнсія» чакае кожнага беларускага спартоўца, якому ўдасца падняцца на найвышэйшую прыступку п’едэстала ў Пэкіне.

### Беларус таемна вёз з Украіны старажытны абраз

Старажытны абраз адабралі ў грамадзяніна Беларусі супрацоўнікі пункту пропуску «Новыя Ярылавічы». Абраз, загорнуты ў радно, знаходзіўся за заднім сядзеньнем у салёне аўтамабіля Фальксваген Джэта.

На абразе выяўлены Ісус Хрыстос, які правай рукою блаславіяе, а ў левай трымае разгорнутае Дабравесьце. У дачыненьні да беларуса супрацоўнікамі мытні была ўсчатая адміністрацыйная справа. Пасьля правядзеньня экспэртнага дасьледаваньня гісторыка-культурнай каштоўнасьці абраза й высьвятленьня абставінаў справы матэрыялы будуць перададзеныя ў суд.

### Нашых рыцараў не пусьцілі на Грунвальд

«Беларускія рыцарскія клюбы ня выканалі новых патрабаваньняў, што тычыцца падрыхтоўкі дасьпехаў. Сярод іншага гэта тычыцца адмысловых накладак на ногі, якія засьцерагаюць ад калецтва», — сказаў адзін з арганізатараў «Дзён Грунвальду» Яцэк Шыманьскі. Паводле яго, ёсьць таксама праблемы, «зьвязаныя з уваходам Польшчы ў Шэнгенскую зону». Паводле сп. Шыманьскага, у наступным годзе «беларускія харугвы напэўна возьмуць удзел у інсцэніроўцы бітвы». Інсцэніроўкак бітвы пад Грунвальдам прайшла 12 ліпеня на гістарычным месцы — там, дзе яна адбылася ў 1410 годзе.

### У НХЛ яшчэ адзін мянчук

Абаронца нацыянальнай зборнай Беларусі Ўладзімер Дзянісаў падпісаў кантракт зь «Нью-Ёрк Рэйнджэрз». Такім чынам беларуская дыяспара ў НХЛ вырасла да шасьці чалавек. Браты Андрэй і Сяргей Касьціцыны гуляюць у «Манрэалі», Міхаіл Грабоўскі перайшоў у «Таронта», за «Каларада Эвэланш» гуляе Руслан Салей. Заключыў кантракт з «Дэтройтам» Сяргей Коласаў.

### «Беларусьфільм» анімаваў прымаўкі і геральдыку

Падрыхтоўчы пэрыяд да здымкаў новага мультфільму «Беларускія прымаўкі» завяршыўся на кінастудыі «Беларусьфільм».

Сюжэтамі мультыплікацыйнай стужкі зьяўляюцца беларускія прыказкі і прымаўкі. Сцэнарыст і рэжысэр мультфільму — Міхал Тумеля.

Ужо гатовыя сцэнар, стылёвыя эскізы, эскізы пэрсанажаў. Здымкі пройдуць да лістападу.

Тымчасам, на кінастудыі скончана трэцяя частка праекту «Аповесьць мінулых гадоў». Гэта працяг цыклю мікраметражных анімацыйных фільмаў пра паходжаньне і сымболіку гербаў беларускіх гарадоў. Мастацкім кіраўніком праекту зьяўляецца Ігар Волчак.

У новую мультыплікацыйную стужку ўваходзяць фільмы пра гербы Полацку, Шклова, Мазыра, Чэрвеня, Пружанаў і Навагрудку — па адным горадзе на кожную вобласьць краіны.

«Шэсьць старажытных беларускіх гарадоў маюць шматвяковую гісторыю, у геральдыцы іх гербаў адлюстраваная самая разнастайная тэматыка» — піша сайт кінастудыі . «Гэта дазваляе адлюстраваць у сюжэтах ня толькі гістарычныя падзеі, але і гаспадарчую дзейнасьць жыхароў гэтых гарадоў, распавесьці пра старажытныя рамёствы, якімі займаліся нашы продкі».

### У Маладэчне скралі ровар у швэдзкага падарожніка

У Маладачанскі РАУС па дапамогу зьвярнуўся 24-гадовы грамадзянін Швэцыі. Ён вырашыў пракаціцца ў адзіночку на ровары з Скандынавіі ў Турцыю, выбраў маршрут цераз Беларусь і напярэдадні прыехаў у Маладэчна.

Велатурыст паставіў ровар ля гасьцініцы і з думкай, што ў такім людным месцы нічога ягонай маёмасьці не пагражае, пайшоў уладкоўвацца на начлег. Калі хвілін праз дзесяць ён выйшаў на ганак, то зь зьдзіленьнем пабачыў, што ад ровара ні пылу ні сьледу. Разам зь ім зьніклі намёт, спальны мех, заплечнік, інструмэнты, адзеньне, аптэчка, запчасткі й правізія на суму 1375 эўраў. У міліцыю пацярпелы адразу не пайшоў, бо думаў, што хтосьці проста ўзяў ровар пакатацца. Ён зьвярнуўся да адміністратара гасьцініцы з пытаньнем, што магло здарыцца, аднак моўны бар’ер ня даў ім паразумецца. Таму на парозе РУУС даверлівы швэд зьявіўся толькі наступнай раніцай. Ровар пакуль знайсьці не ўдалося. Усчатая крымінальная справа. У Стакгольм госьць вернецца самалётам.

### «Барсэлёна» заплаціць за Глеба 22,5 млн эўра

Лёнданскі»Арсэнал» пагадзіўся прадаць беларускага футбаліста Аляксандра Глеба гішпанскай «Барсэлёне» за 22,5 млн эўра. У свой час «Арсэнал» набыў яго ў нямецкага «Штутгарту» за 15 млн. Кантракт футбаліста з каталёнскім клюбам разьлічаны на чатыры гады, за якія Глеб заробіць агулам каля 14 млн эўра.

### У Жодзіне чалавеку пералічылі на картку 170 тысяч эўра

За дзень да гэтага 27-гадовы жыхар Жодзіна паклаў сабе на картку 170 тысяч рублёў, і раптам пабачыў там тую самую лічбу, толькі ў эўра. Звар’яцелы ад шчасьця работнік заводу пачаў лётаць па ўсім горадзе і здымаць грошы з розных банкаматаў. Частку грошай ён адвёз да цешчы, якая адразу ж іх закапала. А сам выправіўся сьвяткаваць. У банку выявілі, што касірка памылілася ў валюце налічэньня. Мільянэра выклікалі ў міліцыю на прафіляктычную гутарку. Ён аддаў усю суму. Пазбыўшыся мільёнаў, ён выправіўся з жонкай адпачываць у Сочы.

### У Горадні забаранілі гандляваць півам на прыпынках

Мясцовыя ўлады лічаць, што гэта палепшыць санітарны стан гораду. Забарона тычыцца 60 шапікаў. Цікава, што іншыя слабаалкагольныя напоі прадаваць не забаранілі.

**Паводле: Ул. інф., СП, АТ, радыё «Свабода», БелаПАН, Эўрарадыё, «Звязда», «КП в Беларуси», «СБ-Беларусь Сегодня», «Высокий Вал», Life.ru**

# Спадчына Пірасмані і нашчадкі інсургента

Грузінскі мастак стаў там, дзе не знайшлося пакуль месца нашым геніям — Алене Кіш і Язэпу Драздовічу. Пра Ніко Пірасмані піша **Сяргей Харэўскі**.

Колькі б нашае ўяўленьне нямалявала сабе далёкую каўкаскую краіну, усё адно жацца не зусім праўдаю. І нават калі хто пабывае там, гэтыя летуценныя ўяўленьні не развейваюцца. Бо кожны ўбачыць акурат тое, што ўжо малявала яму ягонае ўяўленьне. Таму, што Грузія — краіна міфаў. Міфаў пра герояў Антычнасьці і Сьвятых апосталаў, пра горы, мора і Сонца. Міфаў пра Пірасмані…

Ніко Пірасмані вызначаўся між сваіх сучасьнікаў і суайчыньнікаў дарам надзвычай вобразнага ўспрыняцьця рэчаіснасьці. Ён жыў і ствараў свае карціны на мяжы XIX—XX стст. На сёньня твораў Ніко Пірасмані вядома ня больш як дзьвесце. Найбольш вядомыя ягоныя работы — «Велікоднае ягня», «Леў і сонца», «Алень», «Сямейны пікнік», «Артачальская прыгажуня», «Дзяўчынка з паветраным шарам», «Маргарыта». Праўда, акурат «Маргарыту» ў Менск не прывезьлі. Гэта такі партрэт, вядомай хіба адно ў Тбілісі, французскай сьпявачкі Маргарыты дэ Сэўр. Яе вобраз стаў адным з самых вялікіх міфаў пра мастака, які нібы патрациў усё, што ашчаджаў, на кветкі для яе. Андрэй Вазьнясенскі напісаў пра гэта верш, зьмест якога запазычыў у Паўстоўскага. Шматкроць паўтораная гісторыя, дзякуючы выдатнаму кампазытару Раймонду Паўлсу, стала савецкім папулярным шлягерам «Миллион алых роз» у выкананьні Алы Пугачовай.

Але гэткай гісторыі не магло быць праз тое, хаця б, што ў Пірасмані не было столькі грошай ці хаця б якое маёмасьці, каб яе прадаць. Ён, бажавольны дзівак вялікага росту, жыў адно ўласнай творчасьцю.

Для Пірасмані жыцьцё і мастацтва, мастацтва і чалавек былі непадзельныя. Пэрсанажы майстра статычныя, але напоўненыя ўнутраным драматызмам, гэта не канкрэтныя вобразы, а тыпы: духанщчык, дворнік, кухар, даярка. Свае карціны ён і пісаў белым па чорным, а не наадварот. Статычныя, гэаметрызаваныя кампазыцыі й строгі стрыманы каларыт — толькі на першы погляд могуць здавацца чымсьці незвычайным, передусім для людзей заходніх культуры.

Тыя, хто бываў у Грузіі й знаёмы з тамтэйшым іканапісным мастацтвам, ня ўбачаць тут нічога дзіўнага. Пірасмані тварыў цалкам у рэчышчы сваёй, грузінскай, традыцыйнай культуры. Таму колеры, што набываюць у яго сымбалічны сэнс, кампазыцыйныя пабудовы палотнаў, а нават і біблейскія геральдычныя істоты — Леў, Бык, Алень і Арол, лёгка дэшыфруюцца праз праваслаўнае мастацтва Грузіі. У наіўным сусьвеце Пірасмані знайшлося месца амаль усім жанрам жывапісу, здаўна вядомым у Эўропе. Але найбольш часта ў ягоных сюжэтах прадстаўленыя славутыя грузінскія гулянкі. У мастака распіцьцё віна й чачы страчвае сваю будзёнасьць і банальнасьць, а мяса ягняці набывае насамрэч біблейскі сэнс, а застольле становіцца эўхарыстыяй.

Пірасмані не карыстаўся складанымі прыёмамі, вядомымі эўрапейскім мастакам, каб зьнітаваць кампазыцыю й арыентаваць гледача, наадварот, ён пісаў фігуры паасобна, рыхтык як на праваслаўных фрэсках, таму пэрсанажы ягоныя існуюць зазвычай самі па сабе, спараджаючы адчуваньне шчымлівае самоты.

Эфэкт адчужанасьці натуры ад мастацкага вобразу, як на старажытных абразах, замацоўваецца іконным каларытам, у агуле суворым, часам зусім змрочным, але зрэдчас зьнянацку палымнеючым пярэстымі фарбамі, нібы дзікімі краскамі.

Пірасмані ня быў авангардыстам у эўрапейскім сэнсе гэтага слова. Наадварот, ён працаваў *на заказчыка*, імкнучыся паразумецца з гледачамі праз іхныя культурныя коды. І гэта яму ўдавалася. Ягоныя палотны перадусім служылі людзям — у духанах і піўных, у крамах і храмах. І тагачасны грузінскі глядач, мала абазнаны ў эўрапейскім мастацтве, разумеў менавіта мастацтва Пірасмані, сваё, не чужое. Ячшэ адзін трывалы міф пра гэтага выбітнага грузінскага творцу — тое, што ён пісаў свае палотны абы-чым і на абы-чым, праз беднасьць, праз скваплнасьць заможцаў і г. д. Сёньня ж нам вядома, што матэрыял для ягоных карцінаў, цырата, была ня таннай, імпартнай як і ягоныя фарбы. То бок ён паслугоўваўся для таго часу дарагімі, дэфіцытнымі ў тых краях матэрыяламі. Дый па кольказці рэклямаў і шыльдаў, што ён вырабляў для пякарняў, духанаў, крамаў цяжка пацьвердзіць, што ён ня меў замоваў. Пірасмані відавочна ідэалізуе дабрабыт, сытае жыцьцё й шчодрыя звычаі старога Тыфлісу. Што ўжо само па сабе яскрава сьведчыць пра ягоную сацыяльную адаптаванасьць, зьнітаванасьць з рэальным, і яркім, жыцьцём. Міф пра ягонае жабрацтва й незразумецасьць сучаснікамі быў створаны і надаўся ўжо ў савецкі час. Бо інакш ня выйшла б стварыць культу цалкам несавецкага мастака ў савецкі час.

Убачыўшы ў ім роднасную душу, мастак-футурыст Ільля Зданевіч, сын сасланага на Каўказ беларускага інсургента Міхала Зданевіча, прывёз палотны Пірасмані ў Маскву, яшчэ да рэвалюцыі, пры жыцьці мастака. Там яны экспанаваліся на выставе футурыстаў «Мішэнь» у 1913 г. Пра Пірасмані загаварылі ў мастацкіх колах імпэрыі. Яго бурна пачалі ганараваць і на радзіме. У апошнія гады жыцьця прыйшла слава. Стары мастак памёр 5 траўня 1918 году. У Тбілісі. У незалежнай Грузіі.

Тымчасам Ільля Зданевіч і ягоны брат Кірыл (аўтар славутае кнігі пра Пірасмані, што выйшла ў Тбілісі ў 1963 г., заклаўшы сапраўдны культ гэтага мастака) сабралі вялікую калекцыю ягоных палотнаў і рупіліся перад тагачасным грузінскім урадам пра стварэньне музэю. Так што пра міф *забытасьць* і *непрызнанасьць* Пірасмані — яшчэ адзін міф. Менавіта ў Тбілісі, да земляка, беларуса па бацьку, Кірылы Зданевіча, на пачатку 1930-х езьдзіў выдатны беларускі мастак даваенная эпохі Раман Семашкевіч. Пабачаная на кватэры Зданевіча калекцыя твораў геніяльнага грузінскага прымітывіста зрабіла на Семашкевіча калясальнае ўражаньне.

А вось жа Ільля Зданевіч, пасьля захопу савецкімі войскамі Грузіі, у 1920-м эміграваў у Францыю. У 1972 г. ён выдаў у Парыжы цудоўную кнігу «Ніко Пірасманішвілі. 1914» з партрэтам Пірасмані работы Пікаса. Так пра геніяльнага грузінскага майстра шыльдаў і партрэтаў з сутарэньняў старога Тыфлісу дазнаўся ўвесь сьвет. Дзякуючы братам Зданевічам, Пірасмані трывала ўвайшоў у сусьветную мастацкую спадчыну, разам з такімі славутымі прымітывістамі як француз Анры Русо й харват Іван Генераліч. Адкрыцьцё сьветам Пірасмані было цудам, бо яго мастацтва аказалася актуальным і нечкана сучасным у 1970-я з пункту гледжаньня агульнага развіцьця мастацтва. Грузінскі мастак стаў там, дзе не знайшлося пакуль месца нашым геніям — Алене Кіш і Язэпу Драздовічу.

Вялізарную ролю ў больш глыбокім грузінскім асэнсаваньні маштабу і значнасьці спадчыны мастака-самавука, колішняга чыгуначнага кандуктара, адыграў мастацкі фільм «Пірасмані», зьняты ў 1970 г. Георгіем Шангелая. Сам фільм гэтаксама стаў шэдэўрам. У 1982 г. у Мірзаані, роднай вёсцы Пірасмані, дзе ён быў проста пастухом, быў створаны музэй… Ягоная творчасьць і сёньня, скрозь акуляры міфаў, успрымаецца як блізкая людзям, выклікае ў нас глыбокія эмоцыі і захапленьне.

А дзякуючы Пугачовай і Паўлсу ягоны рамантызаваны вобраз увайшоў у кожны дом на шостай частцы сьвету…– Так, крок за крокам, Пірасмані стаў яшчэ адным вялізарным міфам Грузіі. Міфам, бясконца далёкім ад праўды, якой служыў сам мастак, ад праўды пра ягоны родны, зусім бедны й закінуты край. Але прыгожым міфам. Міфам, што ўжо гэтак стаў падобны да праўды...

Карціны Пірасмані рэдка пакідаюць Тбілісі, дзе ў Нацыянальным музэі Грузіі захоўваецца 160 ягоных работаў. І свае шэдэўры музэй імкнецца не вывозіць. Тое, што мы можам убачыць у нашым Нацыянальным мастацкім музэі — надзвычайная падзея ў мастацкім жыцьці. Выстава, на якой прадстаўленыя 24 работы са збораў Нацыянальнага музэю Грузіі — гэта ўнікальная й рэдкая магчымасьць пазнаёміцца з тым смабытным і дзіўным сьветам далёкае каўкаскае краіны. Выстава працаваць ме да 13 жніўня. Пасьля Менску палотны Пірасмані павязуць у Парыж.

## КАНЦЭРТЫ

**Open Air «DOUBLE AIR**

**19 ліпеня ў Сілічах — Open Air «DOUBLE AIR»**. Цэнтральны танцпол — electro house — будзе знаходзіцца ў ангары. На спэцыяльным подыюме — VIP-зоны. А на вуліцы разьмесьціцца RnB-танцпол. Пачатак а 22-й. Уваход: ад 25 000. Т.: 229-90-39, 229-92-86.

## ВЫСТАВЫ

**Да стагодзьдзяў Азгура і Глебава**

У Мастацкім музэі да 31 жніўня працуе выстава «Даўжэй за век…», прысьвечаная 100-гадовым юбілеям вядомых беларускіх творцаў — Заіра Азгура, Сьцяпана Андруховіча, Анатоля Волкава, Аляксея Глебава, Міхаіла Даўгялы, Людвігі Здановускай, Яўгена Красоўскага…

**Менскія фатаздымкі. Гараджане.**

Да 31 жніўня ў галерэі візуальных мастацтваў Nova (Веры Харужай, 16) працуе выстава «Менскія фатаграфіі. Гараджане».

**Жыцьцё праз колер**

У Мастацкім музэі да 18 жніўня працуе выстава твораў Мікалая Бушчыка «Жыцьцё праз колер».

**Выстава твораў бэрлінскіх мастакоў**

У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасьці, 47) да 27 ліпеня можна пабачыць выставу твораў бэрлінскіх мастакоў, прадстаўнікоў міжнароднага цэнтру мастацтваў Kunsthaus Tacheles, які дзейнічае ў Бэрліне.

**«Гуміарабік» Андрэя Васкрасенскага**

Да 27 ліпеня ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва працуе фотавыстава Андрэя Васкрасенскага «Гуміарабік». Гэта першая беларуская выстава ў тэхніцы гуміарабік.

**Злачынствы Вэрмахту**

Да 20 ліпеня ў Музэі гісторыі і культуры Беларусі ідзе дакумэнтальная выстава «З найбольшай жорсткасьцю… Злачынствы Вэрмахта ў Польшчы, верасень — кастрычнік 1939 г.».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Супэрмэн з п’янай мордай

**Хэнкок** (Hancock)

ЗША, 2008, каляровы, 92 хв.

**Рэжысёр:** Пітэр Бэрг

**Ролі выконваюць:** Ўіл Сьміт, Шарліз Тэрон, Джэйсан Бэйтман, Джэй Гэд, Эдзі Марсан

**Жанр:** Комікс-драма

**Адзнака:** 5,5 (з 10)

Маямі скаланаецца ад прыгодаў супэрмэна Хэнкока (Ўіл Сьміт). Як і належыць кожнаму супэрмэну, Хэнкок палюе за бандытамі, ратуе людзей і карае нягоднікаў. Але Хэнкок — алькаголік, грубіян і бомж, подзьвігі якога абыходзяцца гораду ў круглую суму. Выратаваны Хэнкокам рэкляміст (Джэйсан Бэйтман) вырашае зьмяніць непрывабны імідж супэргероя…

У амэрыканцаў усталяваўся культ — і стэрэатып супэрмэна. Неймаверныя здольнасьці, бескарысьлівасьць, мужнасьць. Пітэр Бэрг паспрабаваў унесьці лёгкую парадыйную карэкцыю ў сталыя штампы.

Перагар за мілю, жабрацкія лахманы, п’яная морда, неахайныя звычкі, брудныя жарты (не найгоршыя ў амэрыканскім кіно), цёмная скура — новы вобраз Дон Кіхота ад хмарачосаў.

Асацыяльнаму Дон Кіхоту з бутэлькаю віскі найперш неабходны прафэсійны піяр (хоць герой да гэтага ня рвецца) — і выратавальныя курсы групавой псыхатэрапіі ў турэмнай камэры.

Для піяру нестандартнага супэргероя найболей пасуе непрактычны рэкляміст з добрым сэрцам (яшчэ адна фільмовая супярэчнасьць). Але ніхто не ўлічыў, што герой пакутуе ад самоты — і нічога ня памятае пра свае сямейныя таямніцы, якія неўзабаве аб’явяцца.

Карціна Пітэра Бэрга ветліва грае з штампамі, зрываецца ў мэлядраму — і наганяе адмысловых эфэктаў (пад «Людзей Х») — з ураганамі, падкінутымі машынамі, палётамі.

Нягледзячы на адхіленьні ад схемы, фільм цалкам зроблены ў традыцыях высокабюджэтнага масавага кіно — у якім акторская здольнасьці Шарліз Тэран не запатрабаваныя.

Карціна не прымусіць занадта нудзіцца, але няшмат пакіне ў сэрцы і галаве.

**Андрэй Расінскі**

# Як стаць падобным да хулігана

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Прыкалола ў зачыстцы па справе 4 ліпеня, што шмат каго павінцілі на той падставе, што яны вонкава быццам падобныя да фатаробату хулігана. Уяўляю працэс стварэньня таго партрэта. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

*Кабінэт сьледчага*

**Сьведка** *(уваходзячы)***:** Можна? Я адзін з тых, хто разам сьпяваў гімн.

**Сьледчы:** Вельмі прыемна. Сядайце, калі ласка. Я вяду справу па выбуху 4 ліпеня. Наколькі нам вядома, вы знаходзіліся на месцы хуліганскай акцыі. Мы хацелі б, каб вы дэталёва апісалі нам партрэт злачынцы. Напрыклад, якога фасону былі пампончыкі на каптуры ў гнома?

**Сьведка:** Гнома? Якога гнома?

**Сьледчы:** Які арганізаваў выбух.

**Сьведка:** Прычым тут гном?

**Сьледчы:** Э-э-э, не кажыце… Вы ведаеце хоць бы аднаго гнома, які аформіў падпіску на «Саўбелку»?

**Сьведка:** М-м-м-м... Ну-у, а Лазавік?

**Сьледчы:** Лазавік ня гном. Ён проста невыязны.

**Сьведка:** Але гэта быў ня гном. Гэта быў звычайны чалавек.

**Сьледчы:** Ня хлусіце?

**Сьведка:** Слова пацана!

**Сьледчы** *(беручы слухаўку)***:** Пачакайце трошкі. *(У слухаўку).* Алё, Пятровіч, адмяняй тэрмінова пошук гнома зь белай лапацістай барадой, у чырвоным жакеце і ботах 32-га памеру, узросту прыкладна 800—850 гадоў. Аказваецца, гэта быў чалавек. Што? Што рабіць з ужо затрыманымі гномамі? Ну, ня ведаю. Выпускаць трэба, калі яны не сябры «Маладога фронту». Акей. *(Зьвяртаючыся да сьведкі).* Цяпер з вамі. З гэтай хвілінкі папрашу быць вельмі ўважлівым. Такім чынам, чалавек. Колькі ў яго было рук?

**Сьведка:** Як колькі? Дзьве.

**Сьледчы:** Нагадваю, што існуе артыкул КК, паводле якога мы можам засадзіць вас на пару гадоў за тое, што вы далі сьледзтву ілжывую інфармацыю. Акрамя таго, мы яшчэ не адкінулі вэрсіі, што адзін з прысутных пры выбуху быў яго арганізатарам. Дзьве рукі, кажаце. А колькі ног? Тры?

**Сьведка:** Чаму? Дзьве.

**Сьледчы:** Файна! Кола падазраваных з кожнай хвілінай звужаецца. Цяпер пра хвост. Які быў у яго хвост — як у паўліна, каторы, калі распускаецца, грае адценьнямі колераў на фоне сонца, або як у трытона?

**Сьведка:** Не было ў яго хваста. Гэта ж чалавек!

**Сьледчы:** Цікавы выходзіць з вашых словаў партрэт злачынцы: чалавек, дзьве рукі і дзьве нагі. Усё? Крылы, плаўнікі, сьліконавы хобат, акустычныя сыгналы для біякамунікацыі кшталту «б-бе-е-е-е-е-е-е» або «гайкі на галовах будзем закручваць»?

**Сьведка:** Не! Не! Не!

**Сьледчы:** Магу вам сказаць толькі вялікі дзякуй. Вы афігенна дапамаглі сьледзтву. Дзьве рукі, дзьве нагі, чалавек… Мы лёгка вылічым гэтага ўрода. Да пабачэньня.

**Сьведка:** Усяго добрага.

**Сьледчы** *(беручы слухаўку)***:** Пятровіч, можаш калупаць на пагоне дзірку пад новую зорку. Быў толькі што ў мяне сьведка, даў самыя падрабязныя прыкметы злачынцы. Запісвай — чалавек, дзьве рукі, дзьве нагі. Давай інфармацыю ў вышук. *(Кладучы слухаўку).* Дарэчы, здаецца, нядаўна недзе я бачыў падобнага тыпа. Блін! Вось памяць! Як злoвім, трэба будзе абавязкова падлячыцца — зьезьдзіць у Баўгарыю. Пакуль, здаецца, я яшчэ выязны.

## КАЛІ Б…

**...замежныя футбалісты, якія гуляюць у Беларусі, цікавіліся палітыкай.**




Варатар: Чаму, пытаеш, я такі нэрвозны, несканцэнтраваны… Добра табе пытаць. Ты ж чорны легіянер, а я белы.

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**В.Сімановічы Бабруйскага пав. Менскай губ.** Наша вёска нічым добрым ня можа пахваліцца, ні добрай школай, ні бібліятэкай. Вядома яна тым, што тут жыў знаны злодзей Кастусь Акрута. 25 лістапада ўначы паліцыя яго арыштавала. Усе лягчэй уздыхнулі. Гэты чалавек мае кавалак зямлі і мог бы жыць справядлівай працай. Доўга яго не маглі злавіць, бо ўдзень ён хаваўся ў лесе, а ўночы хадзіў людзей абкрадаць; абіраў на шасэ балагольшчыкаў; пры гэтым ён зьдзекаваўся зь людзей, браў дарма ў жыдоў у крамах тавары, браў ад рамесьнікаў грошы на гарэлку. Цяпер усе рады, і жыды, і гаспадары па фальварках, бо раней не маглі спаць спакойна. Можа, цяпер пра Сімановічы будуць лепш людзі думаць.

**Г.Я.**

**«Наша Ніва». №26. 1908**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### НЯНЯ

**Шукаем няню** для дзяўчынкі (9 месяцаў), зь верасьня, на поўны дзень. Т.: (029) 685– 26– 02. Аляксандар

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

### КНІГІ

**Кнігі** на продаж: Тэорыя імавернасьці, мат.статыстыка. 10 кніг. Т.: (029) 360–02–13

**Прапануем** «Незалежная прэса»: Быкаў, Барадулін, Бураўкін, Арлоў, Кіпель, Конан, Гарэцкі, Разанаў, Брыль інш. «Гоман» розныя выпускі, сотні аўтараў, у т.л. тэксты на тарашкевіцы, літаратурная вучоба. Дапаможам падрыхтаваць тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: (029) 753–91–96, alesknigi@mail.ru

**Шукаем кнігі**, матэрыялы па гісторыі: Сярэднявечча, ВАВ, Напалеонаўскі пэрыяд. Т.: (029) 753–91–96

### КПК

**Шукаю** кансультанта. Compaq iPAQ PC H3700. Т.: (029) 360–02–13

### СУСТРЭЧА БЕЛАРУСАЎ

**Традыцыйная сустрэча** беларусаў Атавы. 20 ліпеня ў нядзелю з 11.00 да 17.00 адбудзецца чарговая сустрэча і сумесны адпачынак беларусаў Атавы на Philippe lake. Падчас сустрэчы вы зможаце пазнаёміцца і сустрэцца з суродзічамі, якія жывуць у Атаве, пагуляць у актыўныя гульні, добра адпачыць. Дарога ад Атавы да возера займае каля 60 хвілінаў. Перш па 105–й дарозе. Потым, прыкладна праз 40 хвілінаў, паварот налева на 366–ю дарогу. Потым каля Covered Bridge зноў паварот налева да возера (падрыхтуйце прыблізна 10$ з машыны за ўезд на возера). Мы будзем адпачываць на Breton Beach з правага боку ад стаянак (гледзячы на возера). Пляж абсталяваны ўсім неабходным для адпачынку і сумеснага абеду. Калі ласка, запрашайце сваіх сяброў! Тэлефоны для даведак: Улада і Юра Шамецькі — (613) 592–51–45, Натальля і Пётар Мурзёнкі — (613) 680–11–44.

## Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,** дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828

МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

### Вялікі дзякуй

**Натальлі Т.** з Салігорскага раёну.
**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.
**Галіне Ю., Антону Б.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**Яўгеніі К., Яну Дз., Васілю Н., Ганьне К., П.Б., Вользе Г.** зь Віцебску.
**Анатолю Х., Аляксею П., І.С., Г.Л., Аляксандру К.** з Горадні.
**Тамары К.** зь Бешанковіцкага раёну.
**Сяргею А.** з Клімавіцкага раёну.
**Ліліі В.** зь Берасьця.
**Івану Л., Я.Л.** з Докшыцкага раёну.
**Андрэю Х.** зь Мёрскага раёну.
**Ігару Б.** з Воршы.
**П.А., Ганьне Л.** з Аршанскага раёну.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 16.07.2008.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.